Беларуская
мемуарная
бібліятэка

Міхаіл Мураўёў

# Нататкі пра кіраванне Паўночна-Заходнім краем і пра падаўленне ў ім бунту

Мінск
«Лімарыус»
2016

УДК 94(476)(093)
ББК 63.3(4Беи)
М91

Серыя заснавана ў 2011 годзе

Прадмова, каментары
*Аляксандр Фядута*

Навукова-рэдакцыйная рада:
*Валянцін Голубеў, Ганна Запартыка, Аляксей Каўка, Вітаўт Кіпель, Адам Мальдзіс, Мікола Нікалаеў, Генадзь Сагановіч, Алесь Смалянчук, Лявон Юрэвіч*

**ISBN 978-985-6968-52-8**

© Мураўёў М., 2016
© Фядута А., прадмова, каментары, 2016
© ТАА «Лімарыус», 2016

# PROFESSION DE FOI «ЧАЛАВЕКА ЛІТОЎСКАЙ БОЙНІ»

*...История одной жизни перерастает*
*в настоящую биографическую историю,*
*в историю, показанную через личность*[1].

«Была восень 1898 года. У Варшаве паставілі нарэшце помнік вялікаму польскаму паэту Міцкевічу. Але, нарэшце даўшы на гэта дазвол, урад вырашыў супрацьпаставіць гэтай нацыянальнай дэманстрацыі палякаў сваю, усталяваўшы адначасова “а ў Вільні, городі преславнім” помнік Мураўёву-вешальніку. Польскае грамадства палічыла гэты ўчынак здзекам з нацыянальных ідэалаў польскага народа і выгукнула пратэстамі. Былі дэманстрацыі ў Варшаўскім універсітэце, а калі нехта з русіфікатараў-прафесароў выступіў супраць гэтых дэманстрацый, то рух перакінуўся на іх, і найгідчэйшых у адносінах да студэнтаў (напрыклад, Чачуліна) закідалі тухлымі яйкамі і падранымі галёшамі. Падзеі неўзабаве перакінуліся ў астатнія ўніверсітэты, але, напэўна, больш за ўсё прагучалі ў Кіеве, з той прычыны, што студэнтаў-палякаў тут хапала»[2].

На момант, які апісваецца ва ўспамінах вядомым дзеячам часоў украінскага нацыянальнага адраджэння, палітыкам і літаратарам С. А. Яфрэмавым, Міхаіла Мікалаевіча Мураўёва не было сярод жывых ужо трыццаць два гады. Але памяць пра яго так расшчапляла грамадства Расійскай імперыі, якой Мураўёў служыў верай і праўдай, што ступень лаяльнасці да яго — не да імператара, а да шараговага, з пункту гледжання гісторыі, не

[1] Репина Л. П. «Персональная история»: биография как средство исторического познания // Казус 1999: Индивидуальное и уникальное в истории. М.: РГГУ, РАН, 1999. С. 87.

[2] Єфремов С. О. Щоденник. Про дні минулі (спогади). К.: Темпора, 2011. С. 422.

самага нават буйнога дзяржаўнага чыноўніка — сталася лакмусавай паперкай, па якой вызначалася ступень лаяльнасці і да ўсёй сістэмы.

Мы яшчэ вернемся да абставінаў усталявання віленскага манумента. А цяпер паспрабуем успомніць, кім жа быў Міхаіл Мураўёў пры жыцці. Гэта неабходна для таго, каб зразумець, што за кніга знаходзіцца зараз у руках чытача.

* * *

Міхаіл Мураўёў нарадзіўся 1 (12) кастрычніка 1796 года ў сям'і падпалкоўніка Мікалая Мікалаевіча Мураўёва і яго жонкі Аляксандры Міхайлаўны (народжанай Мардвінавай) у Маскве.

Мікалай Мікалаевіч быў кадравым марскім афіцэрам, неаднаразова ўдзельнічаў у ваенных дзеяннях, у бітве каля Рочэнсальма праявіў мужнасць і гераізм, быў цяжка паранены і ўзяты ў палон. Па вяртанні ў шыхт камандаваў караблямі, а неўзабаве, пасля невялікага перапынку, узнавіў службу ўжо ў наземных войсках, дзе выявіў сябе як выдатны арганізатар: напісаны ім статут пяхотнай службы быў распаўсюджаны на ўсё земскае апалчэнне пачынаючы з 1807 года. Нарэшце, за ўдзел у вайне 1812–1813 гадоў М. М. Мураўёў быў уганараваны чынам генерал-маёра і залатой шабляй.

Мураўёў-старэйшы быў вядомы і як ваенны педагог. Ён заснаваў і амаль восем гадоў утрымліваў на ўласны кошт школу для калонаважатых — фактычна адну з першых вучэльняў для малодшага афіцэрскага складу па квартырмейстарскай галіне. Гэтая навучальная ўстанова лічылася прэстыжнай хоць бы таму, што тут будучых афіцэраў вучылі дакладным і тэхнічным навукам, фартыфікацыі найлепшыя ў гэтай справе спецыялісты. «Из стен училища вышли более 24 участников тайных обществ декабристов, в их числе братья Н. С. и П. С. Бобрищевы-Пушкины, А. О. Корнилович, П. А. Муханов, Н. А. Крюков и др.»[3].

[3] Ильин П. В. Новое о декабристах. Прощенные, оправданные и необнаруженные следствием участники тайных обществ и военных выступлений 1825–1826 гг. СПб.: Нестор-История, 2004. С. 410.

Педагагічныя здольнасці Мікалая Мікалаевіча праявіліся і ў тым, як ён выхаваў сваіх сыноў. Чацвёра з пяці пакінулі ў гісторыі Расіі заўважны след: Аляксандр стаўся стваральнікам аднаго з першых дзекабрысцкіх таварыстваў, што, без сумневу, і спыніла яго кар'еру; Андрэй — вядомым рэлігійным пісьменнікам і прыкметным праваслаўным грамадскім дзеячам; Мікалай-малодшы і Міхаіл — буйныя дзяржаўныя дзеячы, уганараваныя імператарамі спецыяльнымі прыдомкамі да родавага прозвішча — Мураўёў-Карскі і Мураўёў-Віленскі.

Гэта не было вынікам пратэкцыі. Выпускнік Страсбургскага ўніверсітэта, Мураўёў-бацька зрабіў усё, каб ягоныя дзеці атрымалі выдатную адукацыю. І галоўнае — каб яны былі актыўныя. І гэта ў яго атрымалася. Міхаіл, напрыклад, на пятнаццатым годзе жыцця не толькі паступіў у Маскоўскі ўніверсітэт, але і заснаваў Маскоўскае таварыства матэматыкаў, мэтаю якога было распаўсюджанне матэматычнай веды. Прычым малады Мураўёў сам чытаў лекцыі, у тым ліку па аналітычнай і рысункавай геаметрыі, якія яму давялося вывучаць самастойна. І памяць пра бацьку ён захоўваў вельмі добра: «Отец Муравьева перевел Тэра и сделал к переводу примечания. У Муравьева был экземпляр книги с пометками отца на полях, и сын благоговейно хранил этот экземпляр, как Евангелие»[4], — прыгадваў М. В. Шалгуноў, пазней вядомы рэвалюцыйны публіцыст, які служыў пад кіраўніцтвам Міхаіла Мікалаевіча ў часе знаходжання таго на пасадзе міністра дзяржаўных маёмасцяў.

Здольнаму юнаку надарыўся выпадак праявіць сябе. У красавіку 1812 года яго накіравалі ў распараджэнне штаба 1-й Заходняй арміі генерала М. Б. Барклая-дэ-Толі ў Вільні (упершыню ён трапіў у Вільню — горад, які стане вызначальным для ягонага лёсу пры жыцці і пасля смерці). Разам з арміяй Барклая адступаў ён да Барадзіна, дзе быў цяжка паранены ў нагу на батарэі М. М. Раеўскага, пасля чаго да канца сваіх дзён мусіў хадзіць, абапіраючыся на палку. Падобнай раны

[4] Шелгунов Н. В. Из прошлого и настоящего // Шелгунов Н. В., Шелгунова Л. П., Михайлов М. Л. Воспоминания: в 2 т. Т. 1. М.: Художественная литература, 1967. С. 89.

было дастаткова для таго, каб прасіць адстаўкі, і пасля замежнай кампаніі 1813–1814 гадоў ён так і зрабіў. Але імператар не прыняў адстаўкі, і Міхаіл Мураўёў працягнуў службу.

Вайсковая справа накладае пэўныя абмежаванні, у якіх энергічны і дзейны малады чалавек пачуваўся цесна. Даўся ў знакі і тэмперамент: навучаны прыкладам свайго старэйшага брата Аляксандра, Міхаіл стаў сябрам таемных таварыстваў, мэтаю якіх было рэфармаванне Расіі (да гэта ж руху будзе прымыкаць і трэці брат, Мікалай). Спачатку ён уваходзіў у Саюз Уратавання (1817), а пасля — у Саюз Дабрадзенства (1818). Браты Мураўёвы былі і суаўтарамі статута Саюза Дабрадзенства. Пасля, у часе допытаў і ў пісьмовых тлумачэннях для следства па справе 14 снежня, Міхаіл Мікалаевіч (на той час — падпалкоўнік у адстаўцы) будзе сцвярджаць: «В 1818 году я был в обществе, имеющем целью распространение добрых нравов и просвещения. Я в оном действительно был и с удовольствием участвовал, ибо видел благонамеренную цель, помощь бедным, противоборство пороку и распространение просвещения; считал себя обязанным в сем участвовать...»[5].

У паказаннях сваіх Міхаіл Мураўёў не хлусіў і не губляў свайго твару. І — яшчэ адна прыкметная акалічнасць — ён не называе ніводнага імя, бо гэта магло б не толькі ўскладніць ягоны лёс, але і адбіцца на іншых людзях. Як адзначае сучасны даследчык, Мураўёў «занял на следствии четкую и бескомпромиссную позицию, от которой не отступил до конца расследования. [...] При этом принятая им тактика отличалась особой наступательностью и активностью»[6]. Падпалкоўнік у адстаўцы нагадаў следству пра свае рэальныя заслугі — у тым ліку і на ніве грамадскай дзейнасці: «...в 1821 году несчастнейшее событие, ужасный голод в уезде, в котором я жил, доставило мне случай

[5] Высочайше учрежденному Комитету от подполковника Михаила Николаева сына Муравьева всепокорнейшее объяснение // Восстание декабристов. Документы. Том XX. М.: РОССПЭН, 2001. С. 378. Далей адпаведныя спасылкі падаюцца па гэтым выданні.

[6] Ильин П. В. Тамсама. С. 60.

доказать на опыте чувства, которые руководили мною в обществе, и я подвергнул себя даже подозрению, старавшись спасти тысячи несчастных, оставленных без помощи горькой своей участи. Я приехал в Москву зимою 1821 года, старался снискать частные пожертвования для спасения гибнувших, обратить на то внимание местного начальства, доставить ему законным образом собранные довольно значительные пособия, и Бог, вложивши мне в сердце мысль сию, благословил и успехом»[7]. Гаворка ў дадзенай сітуацыі ідзе пра ўдзел М. М. Мураўёва ў адной з найбуйнейшых акцый Саюзу Дабрадзенства: ад галоднай смерці было ўратавана больш за дзве тысячы сялян. Менавіта таму нельга пагадзіцца з меркаваннем П. Е. Шчогалева, які сцвярджаў, што ў 1821–1826 гадах Мураўёў «притаился в своем имении в глуши Рославльского уезда Смоленской области»[8]: Міхаіл Мікалаевіч не хаваўся, а дзейнічаў.

Але вернемся да следства. Тактыка, абраная Мураўёвым, дае свой вынік. Акрамя таго, ніхто з актыўных дзеячаў дзекабрысцкага руху, за выключэннем І. Дз. Якушкіна, у сваіх паказаннях не згадваў, што падпалкоўнік Мураўёў працягваў заставацца сябрам таемнага таварыства пасля 1821 года. 2 чэрвеня 1826 года «последовала высочайшая резолюция: “Выпустить”»[9].

М. М. Мураўёва вызваляюць з апраўдальным атэстатам, і ён вяртаецца на вайсковую службу. І быў ён такі не адзіны: тыя, чыю віну следчыя не змаглі пацвердзіць, атрымалі магчымасць яшчэ раз праявіць сваю лаяльнасць, ужо ў паўсядзённым жыцці. Мікалай І разумеў, што найбольш верны служака — колішні ліберал з заплямленай рэпутацыяй, і таму даваў шанец.

Ужо ў 1827 годзе Міхаіл Мураўёў падае на імя імператара запіску пра тое, як варта было б рэфармаваць мясцовую адміністратыўную і судовую ўладу, каб выкараніць перадумовы карупцыі, якая паглынала дзяржаўны механізм імперы.

---

[7] ВД. Т. XX. С. 378–379. — Мураўёў не перабольшвае сваіх заслуг: ва ўласных смаленскіх маёнтках падчас голаду ён арганізоўвае дабрачынныя сталоўкі, у якіх адначасова маглі харчавацца да 150 сялян.

[8] Щеголев П. Е. Граф М. Н. Муравьев — заговорщик // Щеголев П. Е. Декабристы. М.– Л.: Государственное издательство, 1926. С. 137.

[9] Ильин П. В. Тамсама. С. 61.

Мікалай I успрымае ідэю прыхільна: аўтара чакае перавод у Міністэрства ўнутраных спраў — орган цэнтральнага кіравання ўсёй адміністрацыйнай сістэмай Расіі. Пачынаецца няўхільнае прасоўванне па кар’ернай лесвіцы, якое запатрабуе максімальнага напружання волі, умення карыстацца момантам і дасягаць свайго.

У тым жа 1827 годзе М. М. Мураўёва накіроўваюць віцэ-губернатарам у Віцебск. Другі ўжо раз ён трапляе на беларускія землі. Тагачасныя расійскія чыноўнікі ўспрымалі іх ужо як «свае» — усё-ткі больш за пяцьдзясят гадоў прайшло пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай. Але «свае» тэрыторыі заставаліся чужымі ў ментальным і культурным плане; і яшчэ праз чвэрць стагоддзя найвядомейшы тагачасны рускі раманіст I. I. Лажэчнікаў, апынуўшыся на той самай віцэ-губернатарскай пасадзе ў Віцебску, будзе ўспрымаць яго як «Город грустный, город сонный», дзе

...кухарка ваша панья,
Кучер пан и пан лакей;
Нет людей иных названья —
Стыдно молвить меж людей;
Где не в басне рассуждают
Феникс, Жаба, Жук и Бык;
Где на польский лад ломают
Гордый русский наш язык[10].

Але Лажэчнікаў прыехаў у Віцебск ужо старым, як на той час, чалавекам. А Мураўёў поўны маладой энергіі, ён робіць кар’еру. Ужо праз чатырнаццаць месяцаў, 15 (27) верасня 1828 года ён прызначаецца губернатарам у Магілёў з чынам стацкага радцы[11].

---

[10] Цыт. паводле: Строганов М. В. Об одном петербургском тексте как модели локальных текстов // А. П., Ф. Д. и В. В. Сборник научных трудов к 60-летию профессора Владимира Александровича Викторовича. Коломна: Московский государственный областной социально-гуманитарный институт, 2010. С. 70. Да радка «Феникс, Жаба, Жук и Бык» I. I. Лажэчнікаў зрабіў спецыяльную заўвагу, што гэта — рэальныя прозвішчы жыхароў Віцебска.

[11] Чын адпавядаў вайсковаму рангу брыгадзіра, на той час ужо скасаванаму.

Гэта было надзвычай сур'ёзнае прызначэнне: дастаткова прыгадаць, што ў 1778–1786 гадах. Магілёў быў цэнтрам спецыяльнай акругі, а ўзначальваў акругу адзін з найпрыкметнейшых дзеячаў кацярынінскай эпохі З. Р. Чарнышоў; наступнікам ягоным быў П. Б. Пасек — актыўны ўдзельнік змовы супраць Пятра III; адгэтуль жа пачаўся кар'ерны рост будучага ваеннага міністра імперыі С. К. Вязміцінава. Тут адбылася важная сустрэча Кацярыны II з аўстрыйскім імператарам Іосіфам II. І хаця пазней значнасць Магілёва як адміністратыўнага цэнтра змяншалася, менавіта ён заставаўся цэнтрам рэлігійнага жыцця расійскіх каталікоў: каталіцкі касцёл у Расіі ўзначальваў арцыбіскуп Магілёўскі.

Міхаіл Мураўёў справядліва ўспрыняў сваё прызначэнне ў Магілёў як магчымасць праявіць сябе. І ён зрабіў усё, каб выкарыстаць гэтую магчымасць напоўніцу, не страціць яе.

Апынуўшыся ў губерні, якая рэзка адрознівалася ад унутраных расійскіх губерняў сваімі нацыянальнымі, культурнымі і рэлігійнымі традыцыямі, а да таго ж і кіравалася паводле Статуту ВКЛ 1588 года, а не паводле расійскіх заканадаўчых актаў, Мураўёў зразумеў, чаго менавіта ад яго чакаюць на вяршынях імперскай улады. Як адзначаў вядомы палітычны эмігрант князь П. У. Далгарукаў, «при Незабвенном (пасмяротны “нефармальны” тытул Мікалая І. — *А. Ф.*) всех людей умных и честных называли беспокойными людьми»[12]. Але ўсё, што адрознівалася ад маналітнага імперскага стандарту, якраз і непакоіла. І калі разумныя і шчырыя людзі траплялі ў разрад «беспокойных»[13], а часам і «вар'ятаў» (дастаткова прыгадаць П. Я. Чаадаева), то што ўжо казаць пра цэлыя губерні, якія

[12] Долгоруков П. В. Михаил Николаевич Муравьев: Биографический очерк // Долгоруков П. В. Петербургские очерки: Памфлеты эмигранта (1860–1867). М.: Новости, 1992. С. 323. Далей адпаведныя спасылкі падаюцца па гэтым выданні.

[13] Прыгадаем дадзеную Пушкіным характарыстыку Яўгенія Анегіна: «Им овладело беспокойство, / Охота к перемене мест / (Весьма мучительное свойство, / Немногих добровольный крест)» — цыт. паводле: Пушкин А. С. Евгений Онегин. Роман в стихах // Пушкин А. С. Полное собрание сочинений: в 16 т. Т. 6. М.– Л.: Издательство АН СССР, 1937. С. 170.

сваёй «непадобнасцю» выклікалі гэткі самы неспакой, а дакладней, недавер у палітычнай лаяльнасці што да ўсталяванага стандарту.

У снежні 1830 года магілёўскі губернатар дасылае імператару справаздачу, у якой настойліва рэкамендуе забараніць выкарыстанне ў справаводстве Літоўскага Статута, — і 1 студзеня 1831 года выдаецца ўказ Мікалая I урадаваму Сенату пра скасаванне старажытнага ліцвінскага заканадаўства на беларускіх землях.

У той самы час у спецыяльнай запісцы ад 22 снежня 1830 года на імя імператара пра асновы адукацыі на тэрыторыі губерні Мураўёў пераконвае Мікалая I у тым, што неабходна адхіліць ад навучальна-выхаваўчага працэсу каталіцкіх святароў і цалкам перавесці адукацыйны працэс на рускую мову. У асобнай запісцы ён таксама рэкамендуе зачыніць Віленскі ўніверсітэт як месца навучання шмат каго з нелаяльных да імператара грамадзянаў.

Тады, у 1830 — пачатку 1831 года ўсё гэта падавалася немагчымым, бо станавілася відавочным, што гаворка ідзе пра люстрацыйны працэс па веравызнаўчай і этнічнай прыкмеце. Спецыяльна створаная камісія на чале з намеснікам міністра асветы Дз. М. Блудавым (значна пазней ягоны подпіс будзе першым у спісе пад скандальна вядомым віншавальным адрасам Мураўёву ў 1863 годзе з нагоды дня нараджэння апошняга)[14] адхіліла магчымасць рэалізацыі гэтай ідэі. Аднак пасля задушэння ня паўстання 1831 года погляды магілёўскага губернатара сталіся запатрабаванымі, а сам ён атрымаў новае адказнае прызначэнне — губернатарам у Гродзенскую губерню.

На нашу думку, менавіта дзякуючы сваім метадам магчымага вырашэння «нацыянальнай праблемы», а не нейкім асаблівым заслугам падчас карных аперацый па задушэнні паўстання М. М. Мураўёў быў прызначаны на гэтую пасаду. Як адзначаў яго першы біёграф Дз. А. Кропатаў, галоўным рэальным дасягненнем Мураўёва ў часе паўстання было «собрание о стра-

[14] Гл. пра гэта: Фядута А. І. Сувораў супраць Мураўёва (Старонка з гісторыі рускай паэзіі) // ARCHE. 2010. № 12. С. 284–299.

не и неприятеле всех разнородных сведений, так называемых секретных, составляющих главнейшее основание для всех распоряжений»[15], для чаго была створаная адмысловая сакрэтная паліцыя, якая Мураўёву і падпарадкоўвалася, бо і стваралася яна фактычна з ягонай уласнай ініцыятывы. Бадай адзінай формай пакарання паўстанцаў, якая выкарыстоўвалася Мураўёвым у гэты перыяд, — з той прычыны, што гаворка ішла перадусім пра шляхту, г. зн. землеўласнікаў, — былі рэквізіцыі паўстанцкай маёмасці на карысць імперыі. За смяротныя пакаранні Мураўёў у гэты час адказваць не мог, бо не меў на тое паўнамоцтваў.

Такім парадкам, у Гродна на пасаду губернатара прыехаў чалавек, пра якога імперскія ўлады ведалі: пры неабходнасці ён здольны правесці раскаталічванне і русіфікацыю губерні, можа стварыць сакрэтную паліцыю, што дазволіць прадугледзець з'яўленне новых канспіратыўных мярэжаў, як гэта было напярэдадні паўстання 1830–1831 гадоў, а таксама не спыніцца перад канфіскацыяй маёмасці ў мясцовай нацыянальнай эліты.

Але, на наш погляд, прызначалі ў Гродна губернатарам усётакі не Вешальніка — хоць менавіта з гэтым пераходам па службе звычайна звязвае легенда ўзнікнення гістарычнай мянушкі Міхаіла Мураўёва. Вось як піша пра гэта аўтар легенды — ужо цытаваны намі вышэй князь П. У. Далгарукаў: «Он после взятия Варшавы (в 1831 г. — *А. Ф.*) назначен был военным губернатором[16] в Гродно, и тут его природная свирепость, подстрекаемая желанием угодить Николаю, превратила его в лютого тирана несчастных поляков. Только что приехав в Гродно, он узнал, что один из тамошних жителей спросил у одного из чиновников: «Наш новый губернатор родня ли моему

---

[15] Кропотов Д. А. Жизнь графа М. Н. Муравьева в связи с событиями его времени и до назначения его губернатором в Гродно: Биографический очерк. СПб., 1874. С. 356.

[16] Недакладнасць: у Гродне М. М. Мураўёў быў прызначаны не ваенным, а грамадзянскім губернатарам. Незразумела, чым выклікана недакладнасць — аберацыяй памяці П. У. Далгарукава або яго свядомым жаданнем зрабіць вобраз Мураўёва ў свядомасці чытачоў больш жорсткім.

бывшему знакомому, Сергею Муравьеву-Апостолу, который был повешен в 1826 году?» Муравьев вскипел гневом (кажется, было не из-за чего) и воскликнул: «Скажите этому ляху, что я не из тех Муравьевых, которые были повешены, а из тех, которые вешают!»»[17].

Легенда гэтая апакрыфічная, бо Міхаіл Мураўёў сваякоў ніколі не выракаўся. М. Дз. Далбілаў, які ўважліва вывучыў паводзіны М. М. Мураўёва ў час і пасля заканчэння следства па справе 14 снежня, адзначае годнасць і моц характару: «...он в противоположность, например, своему брату Александру, покинувшему общество» еще в 1819 году, нигде не кается, не просит собственно о помиловании, прощении ему грехов и заблуждений». І далей: «...освобожденный подследственный отнюдь не спекулировал на отвращении Николая к заговорщикам и не рядился в тогу «новообращенного»»[18].

Значна больш праўдзівай падаецца нам версія, якая ўскосна раскрываецца ў мемуарнай нататцы дзекабрыста А. Я. Розена: «Надо воздать справедливость и Мих. Н. Муравьеву, что он... действовал всегда прямо и, быв назначен губернатором в Гродно, выказал себя начистоту пред созванным дворянством: “Suum cuique!” (Кожнаму сваё (лац.) — *А. Ф.*)»[19] — гэта значыць, прамаўляючы да сходу губернскай шляхты — да роўных сабе, а не да ананімных падначаленых, — адказваючы на непасрэднае, зададзенае проста ў вочы пытанне (пра запіскі з залы тады яшчэ не чулі), губернатар абмежаваўся фразай: «Кожнаму сваё»[20].

Але гэта не азначае, што Мураўёў не заслужыў мянушкі Вешальнік. Папросту атрыманая яна была крыху пазней і ў сувязі з іншымі акалічнасцямі. Мы схільныя звязваць рэпутацыю

---

[17] Долгоруков П. В. Петербургские очерки. С. 317–318.

[18] Долбилов М. Д. «...Считал себя обязанным в сем участвовать»: Почему М. Н. Муравьев не отрекся от «Союза благоденствия»? // Декабристы: Актуальные проблемы и новые подходы. М.: РГГУ, 2008. С. 201, 205.

[19] Цыт. паводле: Розен А. Е. Записки декабриста. СПб., 2008. С. 473–474.

[20] Больш падрабязна пра гэты сюжэт гл.: Федута А. И. О происхождении прозвища Михаила Муравьева // Ісці на святло лабірынтамі даўніх падзей: зборнік памяці Віталя Скалабана. Мінск: Лімарыус, 2013. С. 172–178.

«вешальніка» з тым, што ў 1833 годзе ў Гродне быў пакараны смерцю эмісар польскай эміграцыі Міхал Валовіч.

Валовіч быў павешаны 21 ліпеня (2 жніўня) паводле прысуду ваеннага суда. Эмісар, як вядома, быў прыгавораны да чвартавання, аднак з ініцыятывы Мураўёва прысуд быў зменены: чвартаванне замест павешання — пакаранне смерцю менш крывавае, але ганебнае для шляхціца. Як сцвярджае аўтар манаграфіі, спецыяльна прысвечанай гэтаму эпізоду польскага нацыянальна-вызваленчага руху, «смяротнае пакаранне пакінула жудаснае ўражанне.

Як паведамляе <віленскі генерал-губернатар М. А.> Далгарукаў у рапарце ваеннаму міністру гр<афу А. І.> Чарнышову, прайшло яно вельмі ўрачыста (з магчымай урачыстасцю). Сярод натоўпу прысутных панавала мёртвая ціша. «Все были до такой степени потрясены, что, несмотря на такое огромное скопление абсолютно все люди пребывали в безмолвствии»»[21].

Мяркуючы па ўсім, менавіта гэтае «народ безмолвствует», а не хамская аўтахарактарыстыка, нібыта выказаная ў адказ на бязвіннае пытанне невядомага польскага чыноўніка, і адгукнулася пазней у мянушцы былога гродзенскага губернатара Міхаіла Мураўёва. Тым больш, што адным смяротным пакараннем Валовіча — нават і такім шакуючым — расправа над удзельнікамі канспіратыўных сетак, што існавалі на былых польскіх зямлях, не абмежавалася: узгадаем, як крыху пазней, ужо пасля ад'езду М. М. Мураўёва з заходніх губерняў, быў пакараны смерцю іншы эмісар польска-ліцвінскай эміграцыі Ш. Канарскі.

Але ў цэлым відавочна, што адміністратыўна-распарадчая дзейнасць гродзенскага губернатара была дастаткова жорсткая, і ён здолеў заслужыць у вачах імператара рэпутацыю «крызіснага кіраўніка». У 1835 годзе ён «был отправлен губернатором в Курскую губернию, где и за многочисленностью бедных однодворцев, и за недостатком сбыта для земных произведений накопились огромные недоимки в податях. Желая

[21] Sidorowicz-Czerniewska K. Sprawa emisarjusza MichałaWołłowicza zr. 1833. Grodno, 1934. S. 56.

выслужиться, он с истинной жестокостью приступил к сбору недоимок; крестьянский скот, крестьянская рухлядь были описываемы и безжалостно продаваемы с публичного торга. Нашествие Муравьёва на Курскую губернию не скоро забудется: он там разорил народ»[22].

Можна было б спісаць такую жорсткую характарыстыку Міхаіла Мураўёва на пазіцыю аўтара: Пётр Далгарукаў — паўэмігрант-апазіцыянер, які вёў не на жыццё, а на смерць вайну з імперскім урадам, адным са слупоў якога ў перыяд напісання Далгарукавым цытаванага памфлета Мураўёў і з'яўляецца. Аднак ёсць і іншыя сведчанні. Паказальную характарыстыку стылю працы курскага губернатара Мураўёва пакінуў, напрыклад, у сваіх нататках граф А. Х. Бенкендорф, які наведаў Курск разам з Мікалаем I падчас яго падарожжа па Расіі ў 1835 годзе: «Муравьев, человек деятельный и суровый, но его ненавидели за жестокое обращение и поспешность, с которой он пытался восстановить порядок. Дела в губернии пошли лучше, но нигде не были довольны его управлением. По его представлениям были уволены многие чиновники, и в Курске, как ни в одной другой из посещаемых нами губерний, меня засыпали просьбами на имя императора и частными жалобами»[23]. Розніца толькі ў тым, што Далгарукаў піша пра абдзіранне сялян, а Бенкендорф — пра супрацьстаянне з чыноўнікамі, метады — адны і тыя ж.

У той самы час, у Курску, праявіўся і адзін з галоўных метадаў кіравання, што прымяняўся Мураўёвым: новы курскі губернатар давяраў толькі тым, каго ён ведаў і з кім ужо паспеў папрацаваць. «Смена за сменою, реформа за реформою в губернском правлении, палатах и судах — пошли быстрым ходом... Не прошло 2-х месяцев, как Курск совершенно обновился: весь старый хлам разбросан, растасован, выброшен! Его заменили новые личности и те, которые прибыли с губернатором из Гродно, Петербурга и Москвы в числе около двадцати

---

[22] Долгоруков П. В. Петербургские очерки. С. 319.

[23] Бенкендорф А. Х. Воспоминания. 1802–1837. М.: Российский фонд культуры, 2012. С. 623.

человек и постепенно наезжавшие и с севера, и с запада, и юга, и востока!..»[24].

Курскае кіраванне Мураўёва даказвае: жорсткія метады кіравання не толькі прымяняліся ім ў «нярускіх» губернях імперыі, але складалі звыклы для часу і для яго самога арсенал. У эпоху Мікалая І іншыя кіраўнікі проста не былі запатрабаваныя ці, ва ўсялякім разе, былі неабходныя не надта часта. А Мураўёў вельмі хацеў быць запатрабаваным — гэта стала, відавочна, сэнсам яго жыцця.

І ён стаў запатрабаваным. Спачатку на яго звярнуў увагу легендарны міністр фінансаў Я. Ф. Канкрын, які рэкамендаваў яго кандыдатуру для прызначэння на пасаду дырэктара дэпартамента мытаў і збораў — фактычна галоўнага падатковіка Расійскай імперыі. Верагодней за ўсё, тая хуткасць і рашучасць, з якой Мураўёў ліквідаваў пазыкі ў Курскай губерні, былі даспадобы Канкрыну. Па ягонай пратэкцыі Мураўёў быў прызначаны спачатку сенатарам, а пасля і членам Дзяржаўнага савета (1850). І, нарэшце, вяршыняй яго дзяржаўнай кар’еры сталі дзве міністэрскія пасады: спачатку ён прызначаецца на пасаду міністра імператарскага двара (1856)[25], а потым — міністра дзяржаўных маёмасцяў (1857). Абодва гэтыя прызначэнні адбыліся ўжо пры новым імператары, Аляксандры ІІ.

Мы маем дастаткова матэрыялаў, каб уявіць сабе Міхаіла Мікалаевіча на міністэрскай пасадзе. Цалкам аб’ектыўныя

[24] Слатин С. Д. М. Н. Муравьев губернатором в Курске // Русская старина. 1898. № 11. С. 280. Крыху ніжэй аўтар цытаванай нататкі называе тое, што адбылося пры Мураўёве ў Курску, «погромом должностных лиц». — Тамсама. С. 283.

[25] Ад гэтай пасады ён адмовіўся на карысць графа У. Ф. Адлерберга, атрымаўшы ўзамен пасты кіраўніка Дэпартамента ўдзелаў і дырэктара Межавога корпуса, што, паводле меркавання П. У. Далгарукава, было прыкладам яўнай карупцыі ў вышэйшых эшалонах расійскай улады — гл.: Долгоруков П. В. Петербургские очерки. С. 322–323. Гэтая афера, а таксама ўзаемная пратэкцыя Адлербергаў і Мураўёва пры атрыманні ва ўзнагароду зямельных надзелаў атрымала шырокі рэзананс; у прыватнасці, пра яе няўхвальна гаворыць прыкметны чыноўнік чыгуначнага ведамства барон А. І. Дэльвіг, пляменнік ліцэйскага таварыша Пушкіна — паэта А. А. Дэльвіга. У астатнім, калі мяркаваць па мемуарах, ён ставіўся да Міхаіла Мікалаевіча досыць лаяльна.

мемуары пакінуў пра яго вядомы пазней дэмакратычны публіцыст і палітычны выгнаннік Мікалай Шалгуноў, які служыў пад яго кіраўніцтвам у Міністэрстве дзяржаўных маёмасцяў. Вось як ён апісвае, у прыватнасці, мураўёўскую манеру працаваць з паперамі: «Муравьев умел хорошо читать цифры и верно понимал ведомости, которые ему представляли. К ревизии он готовился тщательно, с вечера пересмотрит все ведомости и записки, которые ему представят ревизоры, загнет уголки, где ему нужно, и, несмотря на то, что ведомостей и записок наберется целая груда, Муравьев не забудет своих уголков и в них не ошибется»[26].

Пры гэтым, піша Шалгуноў, «Муравьев держал себя совсем просто, никакой внешней важности не напускал, но говорил всегда умно и содержательно, и, кроме того, каждый чувствовал, что у этого человека не дрогнет рука подписать что хотите. Этого было совершенно достаточно, чтобы одним своим именем возбуждать в робких панический страх. Рассказывали, что два чиновника от нашей ревизии умерли со страха. Это могло случиться»[27].

Цяпер наўрад ці можна дакладна вызначыць, ці былі гэтыя смерці, а калі былі, то ці не сталі яны выпадковым супадзеннем. Аднак факт застаецца фактам: чуткі такія хадзілі. І галоўнай падставай для іх узнікнення было тое, як міністр Міхаіл Мураўёў ставіўся да людзей: «Муравьев был личник и придавал большое значение личной энергии; но он без нужды напрягал чужую энергию больше, чем это требовалось для дела, и возбуждал ее чувством страха. Когда что-нибудь поручалось нескольким лицам, Муравьев всегда спрашивал: «А с кого я буду взыскивать?» Ему непременно нужно было взыскивать. Людей он вообще ценил не высоко; если ему говорили, что для такого-то дела нет человека, он отвечал: «Было бы болото». Раз, когда

---

[26] Шелгунов Н. В. Из прошлого и настоящего // Шелгунов Н. В., Шелгунова Л. П., Михайлов М. Л. Воспоминания: в 2 т. Т. 1. М.: Художественная литература, 1967. С. 88. Далей адпаведныя спасылкі падаюцца па гэтым выданні.

[27] Шелгунов Н. В. Из прошлого и настоящего. С. 88.

я заступался за кого-то, он мне сказал: «Поживите с мое, и вы увидите, что люди ничего не стоят»»[28].

Уласна кажучы, гэта і ёсць ацэнка актыўна прапагандаваных сёння адміністратарскіх якасцяў М. М. Мураўёва — уменне абуджаць страх і занядбанне людзьмі. Той жа М. В. Шалгуноў сведчыць: «Муравьев не был ни администратором, ни реформатором; он был разрушитель и умел ломать превосходно. Вообще эта натура была революционная. Задумав очистить министерство от лиц, он очистил его и от идей. Крестьян он обрезал землею, избавил платежей, поощрял личное землевладение, и в момент, когда государственный вопрос заключался в улучшении быта крестьян, Муравьев ухудшал этот быт»[29].

Сапраўды, Мураўёў не стварыў новай агульнаімперскай структуры кіравання, як М. М. Сперанскі, не правёў маштабнай рэформы, як Я. Ф. Канкрын ці П. Дз. Кісялёў, не стаў ідэолагам адмены прыгоннага права, як браты М. А. і Дз. А. Мілюціны. Затое ў адрозненне ад усіх гэтых сапраўды выбітных дзяржаўных дзеячаў ён заслужыў рэпутацыю буйнога карупцыянера.

Мураўёў не браў хабар, бо наўрад ці хто наважыўся б прапанаваць чалавеку з такой рэпутацыяй грошы. Але ён актыўна карыстаўся тымі магчымасцямі, якія адкрываліся для яго дзякуючы службоваму становішчу. Займаючы адначасова тры высокія пасады, ён атрымліваў і тры заробкі[30]. Ён рабіў паслугі кіраўніцтву (у прыватнасці, старшыні Дзяржаўнага савета А. Ф. Арлову дапамог прадаць у казну дом, за які ў свой час Арлову не трэба было плаціць, бо казна ж, паводле загаду

[28] Шелгунов Н. В. Из прошлого и настоящего. С. 88–89.

[29] Шелгунов Н. В. Из прошлого и настоящего. С. 88.

[30] «Он дошел в бесстыдстве своем до такой степени, что, отправляясь в летнюю поездку по России в 1858 году, взял разом прогоны (камандзіровачныя грошы. — *А. Ф.*) по трем ведомствам: имуществ, удельному и межевому, и через это оригинальное казнокрадство приобрел себе в публике прозвание министра «трехпрогонного»» — Долгоруков П. В. Петербургские очерки. С. 325. Мы не знашлі ў іншых крыніцах, акрамя эмігранцкай публіцыстыкі, сведчанняў на карысць такой дробязнасці Мураўёва. Што да трайнога заробку, то гэта было агульнаімперскай практыкай.

імператара, за яго і ўнесла грошы, то бок фактычна дзяржава двойчы заплаціла за яго). Нарэшце, як ніхто, Мураўёў праславіўся непатызмам — уменнем, падобна да грыбаедаўскага Фамусава, «порадеть родному человечку»: «Старшего сына своего, Николая Михайловича, он сделал губернатором Вятским и по трогательному стечению обстоятельств по лесному ведомству (под началом Муравьева состоящему) оказалось в 1856 году, что справедливость (петербургская) требует от правительства награждения двух губернаторов: вятского и нижегородского за их содействие к охранению лесов. Из этих двух губернаторов один — сын Муравьева, а другой — его родной брат!»[31]. Але і гэта не ўсё. М. В. Шалгуноў прыгадваў: «Раз Муравьев говорит мне: «А какого я вам дал директора: молодого, энергичного!» И действительно, вместо доброго старика Норова, еще из киселевских людей, Муравьев дал полковника и флигель-адъютанта (своего племянника) А. Г. Лашкарева. С этих пор у нас пошла ужасная кутерьма»[32].

З такім характарам, такой рэпутацыяй і такімі адміністратыўнымі навыкамі сустракае былы сябра таемнага дзекабрыскага таварыства адну з найважнейшых гістарычных падзей XIX стагоддзя — сялянскую рэформу 1861 года. Рэформу, да якой ён паставіўся адназначна адмоўна[33]. Разам з князем В. А. Далгарукавым ён стаў лідарам той групы вышэйшых саноўнікаў імперыі, хто рабіў усё магчымае, каб перашкодзіць вызваленню сялян. Як адзначыў зласлівы Пётр Далгарукаў, «Муравьев, вступив в управление государственными имуществами, употребил лето и начало осени на поездку по России, уверял дворянство, что правительство не думает об отмене

---

[31] Долгоруков П. В. Петербургские очерки. С. 325. — Варта таксама дадаць, што пазней, змяняючы кадры ў губернях, што ўваходзілі ў яго кампетэнцыю як генерал-губернатара Віленскага, М. М. Мураўёў зможа дамагчыся прызначэння свайго сына Мікалая губернатарам Ковенскім.

[32] Шелгунов Н. В. Из прошлого и настоящего. С. 91.

[33] О подходах М. Н. Муравьева к крестьянской реформе и его деятельности на министерском посту см.: Долбилов М. Д. М. Н. Муравьев и освобождение крестьян: Проблема консервативно-бюрократического реформаторства // Отечественная история. 2002. № 6. С. 67–90.

крепостного состояния»[34]. Аднак усяго ўплыву Мураўёва было недастаткова для таго, каб перашкодзіць рэформе: галоўным яе рухавіком стаў вялікі князь Канстанцін Мікалаевіч, а самому Мураўёву давялося абмежавацца роляй «интриганта, довольствующегося возбуждением неудовольствия и оппозиции в Государственном совете, без всякой надежды на практические от того результаты и даже без желания результатов»[35].

Выразная нелюбоў Мураўёва да Канстанціна Мікалаевіча ніколі і ні для каго ў адпаведных колах не была таямніцай. Ды і Мураўёў, зрэшты, не хаваў сваёй антыпатыі да другой асобы імперыі. Той жа Шалгуноў успамінаў: «Муравьев был честолюбив, властолюбив и деспотичен; прощать он не умел и всегда увлекался личными чувствами... Нужно было от Муравьева (по Лесному департаменту) написать о чем-то к председателю Государственного совета, которым был великий князь Константин Николаевич. Я привез к Муравьеву бумагу; он хотел ее уже подписать, но остановился. «Почему это так?» — спрашивает он меня, указывая на «послесловие». Я ответил, что министр подписывается к председателю Государственного совета по форме (кажется) двадцать (были такие формы, в которых указывалось, как должно быть соблюдаемо чинопочитание в подписях). «Покажите». Я подал форму. Муравьев долго ее рассматривал, потом показал пальцем на два нумера ниже, то есть менее почтительно, и сказал: «Велите по этой»»[36]. Гэта было не проста дэманстрацыяй непавагі, але і грубым парушэннем урадавай субардынацыі. Прычым трэба ўлічваць, што Мураўёў у гэты час не быў яшчэ тым сімвалам імперскай улады, якім ён стаў пасля задушэння паўстання 1863–1864 гадоў. А падчас свайго знаходжання ў Вільні Міхаіл Мікалаевіч папросту праігнаруе прыезд вялікага князя, апелюючы да хваробы, якая нібыта з ім здарылася[37].

[34] Долгоруков П. В. Петербургские очерки. С. 331.

[35] Валуев П. А. Дневник П. А. Валуева, министра внутренних дел. В 2 т. Т. 1: 1861–1864. М.: АН СССР, 1961. С. 66. Далее см.: Валуев П. А. Дневник министра внутренних дел. Т. С.

[36] Шелгунов Н. В. Из прошлого и настоящего. С. 89.

[37] Паводле ўспамінаў заўважнага чыноўніка цэнзурнага ведамства Я. М. Феакцістава, які знаходзіўся ў свіце Канстанціна Мікалаевіча, і сам

Сялянская рэформа стала першай сур’ёзнай паразай Мураўёва. Гэты ўжо далёка не малады чалавек быў вымушаны адступіць перад хлопчыкамі, якімі ён лічыў вялікага князя Канстанціна Мікалаевіча і «канстанцінаўцаў». У 1862 годзе яго адправілі ў адстаўку. Імператар развітваўся з Мураўёвым стрымана, што не засталося незаўважаным[38]. Міністр унутраных спраў П. А. Валуеў запісаў у дзённіку з нагоды апошняга ўдзелу Міхаіла Мікалаевіча ў пасяджэнні Савета міністраў: «Читая обзор действий Министерства государственных имуществ, хотя в нем указаны были немаловажные результаты, государь не сказал М. Н. Муравьеву ни одного любезного слова, а <У. П.> Бутков (дзяржаўны сакратар. — *А. Ф.*) не без свойственного ему нахальства тотчас заявил желание завладеть бумагой, ясно обнаруживая намерение впоследствии проверить ее содержание»[39].

Гэта была няміласць — відавочная і, паводле меркавання самога Міхаіла Мікалаевіча, зусім незаслужаная. Ён застаўся сенатарам і членам Дзяржаўнага савета, што вызначала яго

---

вялікі князь, «и все встречавшие его были до такой степени сконфужены, что сцена эта производила крайне тяжелое впечатление. [...] Он <Канстанцін Мікалаевіч> не мог скрыть своего раздражения. Оно выражалось и в его голосе и в жестах» — цыт. паводле: Феоктистов Е. М. За кулисами политики и литературы. 1848–1896. Л.: Прибой, 1929. С. 154. Натуральна, што знявага, якую выказваў Мураўёў да члена імператарскай сям’і і фактычна другой асобы ў іерархіі чыноўнікаў імперыі, распаўсюджвалася і на тых дзяржаўных дзеячаў, хто прытрымліваўся падобных да Канстанціна Мікалаевіча поглядаў. Напрыклад, ваенны міністр Дз. А. Мілюцін узгадваў з нагоды сустрэчы Мураўёва з Ф. Ф. Бергам, які займаў пост імператарскага намесніка ў Царстве Польскім: «На станции железной дороги встретились граф Берг с Муравьевым. Очевидцы рассказывали, что были удивлены намеренным невниманием последнего к приехавшему соседу, для него даже не было приготовлено ни экипажа, ни квартиры» — гл.: Милютин Д. А. Воспоминания. 1863–1864. М.: РОССПЭН, 2003. С. 445. Далей адпаведныя спасылкі падаюцца па гэтым выданні.

[38] Як сцвярджаў сенатар Я. А. Салаўёў, «лично к Муравьеву государь, кажется, никогда не питал ни доверия, ни уважения» — гл.: Соловьев Я. А. Крестьянское дело в 1858–1859 гг. // Русская старина. 1882. Т. 36. № 11. С. 243.

[39] Валуев П. А. Дневник министра внутренних дел. Т. 1. С. 133.

статус у грамадстве і нават некаторы ўплыў на ход спраў, але было зразумела, што яго адхілілі ад актыўнай адміністратыўнай дзейнасці. Адзін з высокапастаўленых чыноўнікаў эпохі Аляксандра III і Мікалая II, І. Л. Гарамыкін, які даслужыўся пры апошнім імператары да звання старшыні Савета міністраў, параўноўваў такое становішча са знаходжаннем у нафталіне. Зяць жа М. М. Мураўёва, граф С. Дз. Шарамецьеў, пісаў: «Муравьев был сдан в архив и никто о нем не думал»[40].

Працягвалася гэта, аднак, усяго год — да таго часу, пакуль імперыю не скаланула Студзеньскае паўстанне 1863 года. І яно стала шчаслівай зоркай для Міхаіла Мураўёва.

Яго папярэднікам на пасадзе віленскага генерал-губернатара быў У. І. Назімаў — дзеяч з рэпутацыяй ліберала. Назімаў займаў гэты пост у 1856–1863 гадах, прычым паспеў заваяваць нават пэўныя сімпатыі ў асяроддзі віленскага дваранства. Ён няблага гаварыў па-польску, ахвотна кантактаваў з арыстакратыяй, даваў шыкоўныя балы. Была і больш сур’ёзная прычына для ўзаемных сімпатый генерал-губернатара і рэгіянальнай эліты: прыехаўшы ў складзе ўрадавай камісіі ў 1840 годзе разбірацца з даносам тагачаснага генерал-губернатара Ф. Я. Мірковіча пра нібыта існуючую пасля разгрому канспіратыўнай сеткі Ш. Канарскага змову моладзі, менавіта У. І. Назімаў садзейнічаў апраўданню ўжо арыштаваных маладых віленцаў. Рашэнне аб адкліканні Назімава паказвала, што ўрад лічыць вычарпанымі меры, накіраваныя на мірнае заканчэнне паўстання, прычым віна ўскладалася асабіста на генерал-губернатара; міністр унутраных спраў П. А. Валуеў увогуле лічыў, што Назімаў «принимает меры административного произвола без последовательности, толку и успеха»[41]. Патрэбны быў абсалютны антыпод, здольны да рашучых дзеянняў, які меў кепскую славу і быў пазбаўлены тых маральных перашкод, што стрымлівалі Назімава ад рэпрэсіўных дзеянняў.

Наконт прызначэння Мураўёва на пасаду віленскага генерал-губернатара хадзілі легенды, якія нарадзіліся ў найбліжэйшым

[40] Шереметев С. Д. Воспоминания. 1863–1868 гг. СПб., 1899. С. 11.

[41] Валуев П. А. Дневник министра внутренних дел. Т. 1. С. 108.

атачэнні самога Міхаіла Мікалаевіча. У прыватнасці, вядомая версія яго малодшага брата, вядомага рэлігійнага пісьменіка Андрэя Мікалаевіча Мураўёва, згодна з якой прызначэнне гэтае не было выпадковым, з ініцыятывай выходзілі ўсе вышэйшыя чыноўнікі дзяржавы, прычым сам Мураўёў нібыта нават не ведаў, навошта яго выклікаюць з Масквы ў Пецярбург, бо ў лісце, перададзеным яму фельд’егерам, нічога, акрамя загаду з’явіцца да імператара, не ўтрымлівалася[42]. Відавочна, што гэта — гістарычная легенда, складзеная на ўзор легенды пра М. І. Кутузава ў 1812 годзе. Насамрэч рашэнне, відаць, было прынятае Аляксандрам II самастойна і дастаткова асэнсавана. Як піша Дз. А. Мілюцін, «15 апреля, по приказанию Государя, сообщено мной Михаилу Николаевичу желание Его Величества «узнать его соображения по некоторым вопросам, касающимся настоящих военных обстоятельств», для чего он был приглашен приехать в Петербург. Генерал Муравьев лишь только получил мое письмо, на другой же день, 18 апреля, выехал из Москвы и, прибыв 19-го числа в Петербург, немедленно был принят Государем»[43].

Верагодна, не варта падрабязна каментаваць тую канцэпцыю яго дзейнасці на новай пасадзе, якая была прапанаваная Мураўёвым Аляксандру II падчас сустрэчы. Па-першае, Міхаіл Мікалаевіч сам апісвае яе досыць падрабязна; па-другое, мы зрабілі гэта ў каментарах да мураўёўскіх успамінаў. Можна толькі сказаць, што ўпарты М. М. Мураўёў быў гатовы «ратаваць Расію» выключна на ўласных умовах[44].

У якасці «тэрапеўтычных» сродкаў уздзеяння на «хворы», у яго разуменні, край новы губернатар прапаноўваў выкарыстоўваць мілітарызацыю механізма дзяржаўнага кіравання,

[42] Гл.: Примечание Андрея Николаевича Муравьева, брата графа Михаила Николаевича // «Готов собою жертвовать...»: Записки графа Михаила Николаевича Муравьева об управлении Северо-Западным краем и об усмирении в нем мятежа. 1863–1866 гг. М.: Пашков дом, 2008. С. 222–224.

[43] Милютин Д. А. Воспоминания. С. 124.

[44] П. А. Валуеў піша, што Мураўёў «принимает на себя назимовское наследие... не без обычных в подобных случаях оговорок» — гл.: Валуев П. А. Дневник министра внутренних дел. Т. 1. С. 221.

русіфікацыю паўсядзённай моўнай сферы і раскаталічванне жыцця рэлігійнага і працэса выхавання новых пакаленняў імперскіх падданых[45]. Сродкам жа «хірургічнага ўмяшальніцтва» можна, верагодна, лічыць спробу пераўтварыць задушэнне нацыянальна-вызваленчага паўстання ў грамадзянскую вайну: калі Назімаў не патрабаваў ад сваякоў паўстанцаў адмежавання ад апальных родзічаў, то Мураўёў не бачыў у гэтым нічога заганнага. Паводле яго меркавання, як епіскап адказвае за ўсю паству і за ўсіх падначаленых яму ксяндзоў, так і бацька адказвае за сына, а брат — за брата. Але відавочна, што абраная імператарам кандыдатура, з аднаго боку, адпавядала прад'яўленым да яе патрабаванням, з другога — дазваляла самому Аляксандру II дыстанцыравацца ад дзеянняў новага генерал-губернатара.

«Генерал Муравьев не церемонился ни перед духовенством, ни перед помещиками, ни перед чиновным людом, ни даже перед женщинами; он сумел в короткое время восстановить авторитет русской власти и внушить страх тем, которые до того времени над ней насмехались»[46]. Можна казаць пра тое, што паўстанцам быў дадзены выразны сігнал, які дакладна прачытваўся. «Мих<аил> Ник<олаевич> Муравьев имел репутацию человека крутого, энергичного; назначение его означало решительный оборот в образе действий правительства в Западном крае и служило красноречивым ответом всем заступникам за поляков, как заграничным, так и домашним»[47]. Рэпутацыя Вешальніка, якая актыўна распаўсюджвалася палітычнымі эмігрантамі, у дадзеным выпадку працавала на вырашэнне той задачы, якую сам жа Мураўёў і сфармуляваў.

Зрэшты, новы генерал-губернатар унутрана быў гатовы пацвердзіць сваю рэпутацыю. «Первые упомянутые выше казни

[45] Пра палітыку М. М. Мураўёва ў сферы рэлігійнай гл.: Долбилов М. Д. Русский край, чужая вера: Этноконфессиональная политика империи в Литве и Белоруссии при Александре II. М.: Новое литературное обозрение, 2010. С. 227–296.

[46] Милютин Д. А. Воспоминания. С. 181.

[47] Милютин Д. А. Воспоминания. С. 124.

двух ксендзов, 22 и 24 мая, произвели сильное впечатление на польское население, которое сначала не хотело верить, чтобы Муравьев решился в самом деле казнить духовное лицо. Затем последовали казни: 27 мая — в Динабурге, графа Льва Платера; 28-го — в Вильне, Колышко, сподвижника Сераковского; 6 июня — в Ковне, корнета Белозора, и в Могилеве — подпоручика Корсака и двух прапорщиков Манцевичей; 10 июня — в Лиде, еще ксендза Фальковского, а 15-го — в Вильне, Сераковского»[48]. Прычым, згодна з успамінамі сучаснікаў, Мураўёў адчуваў нават нейкую асаблівую ўнутраную асалоду, здзяйсняючы сваю «місію»: «Если докладывавший дело пытался смягчить решение, Муравьев вырывал у него из рук бумагу и быстро подписывал. Слова: «повесить», »расстрелять» выходили у него всегда разборчивее других, как будто писались с особенною любовью»[49].

Ва ўспамінах М. М. Мураўёў не хавае таго, што ён прымаў рашэнні жорсткія, не спыняўся перад прымяненнем смяротнага пакарання, не кажучы ўжо пра высылку кожнага, хто, на яго думку, мог быць нелаяльны да ўлады. Нагадаем, што пакаранне смерцю ксяндза Станіслава Ішоры абдылося 22 мая пасля таго, як Ішора, абвінавачаны ў тым, што зачытаў у касцёле маніфест паўстанцкага ўрада, сам здаўся органам паліцыі. Звычайна мемуарыст хоча выглядаць перад нашчадкамі лепшым, чым ён быў на самай справе. Але Мураўёў нібы свядома робіць усё, каб адпавядаць мянушцы, трывала прыклеенай да яго левaрадыкальнымі рускімі эмігрантамі А. І. Герцэнам і П. У. Далгарукавым.

Але ёсць і яшчэ адно адрозненне ўспамінаў Мураўёва ад успамінаў іншых высокапастаўленых чыноўнікаў той эпохі. Цудоўна разумеючы, што пасля публікацыі гэтыя тэксты могуць паўплываць на лёс іх сваякоў, усе яны старанна пазбягалі любой праявы нелаяльнасці да членаў царскай дынастыі. Некаторыя з іх самі рыхтавалі вытрымкі з успамінаў і дзённікаў да

[48] Милютин Д. А. Воспоминания. С. 181–182.

[49] Цыт. паводле: В. С. <Семевский В. И.> Письма М. Н. Муравьева к А. А. Зеленому. 1863–1864 // Голос Минувшего. 1913. № 9. С. 241.

друку пасля смерці (як, напрыклад, зрабіў міністр унутраных спраў, а затым старшыня Камітэта міністраў граф П. А. Валуеў); іншыя яшчэ пры жыцці давалі магчымасць азнаёміцца з тэкстам блізкім да імператара асобам, а часам і рабілі копіі для імператарскай бібліятэкі (так уносіў пасля гутаркі з чытачамі рукапісу папраўкі ў свае дзённікі, затым асцярожна пераплятаў іх і забяспечваў заўвагамі аднакласнік А. С. Пушкіна па ліцэі, прыкметны чыноўнік граф М. А. Корф). У тэксце ж віленскага генерал-губернатара відавочна, як узмоцнена павялічвае ён колькасць сваіх ворагаў — прычым не толькі за кошт роўных сабе, але і далучаючы да іх і вялікага князя Канстанціна Мікалаевіча і не саромеючыся недвухсэнсоўных намёкаў на адрас самога імператара.

І тут варта прыгадаць, як і пры якіх абставінах ствараўся тэкст мураўёўскіх мемуараў.

У красавіку 1865 года Мураўёва звальняюць з максімальна магчымымі ўшанаваннямі. Ён з нашчадкамі ўзведзены ў графы і ўзнагароджаны вышэйшым ордэнам Расійскай імперыі — ордэнам Святога Андрэя Першапакліканага. Аднак узнагароды не азначалі, што «ўтаймавальнік» Літвы і Беларусі атрымаў сапраўдную ўдзячнасць Аляксандра II. М. М. Мураўёў гэта добра адчуваў і паводзіў сябе адпаведна: П. А. Валуеў запісаў у дзённіку, як на пасяджэнні Савета міністраў «присутствовал и ген. Муравьев, присмиревший или присмиревающий. Он, как кот, то выпускал, то прятал когти»[50]. Так не паводзяць сябе пераможцы.

Падобным адчуваннем прасякнуты і мемуары лаяльнага ў гэты перыяд да Мураўёва Дз. А. Мілюціна: «Прибыв в Петербург 25 апреля не совсем здоровым, генерал Муравьев был принят Государем только через несколько дней. По собственному рассказу Михаила Николаевича, прием был сухой, и хотя Его Величество в коротких словах поблагодарил его за достигнутые в Северо-Западном крае успешные результаты, однако ж ясно было видно, что наговоры влиятельных лиц, противников муравьевского образа действий, произвели влияние на взгляд

[50] Валуев П. А. Дневник министра внутренних дел. Т. 2. С. 35.

Государя. Муравьев, со своей грубоватой откровенностью, высказал ему все, что было на душе, и объявил положительно, что не может долее оставаться на своем месте, если не будет утвержден весь ряд предположенных прежде и предлагаемых вновь мер к прочному искоренению в крае следов польской пропаганды. Государь пожелал, чтобы М. Н. Муравьев изложил свои предположения письменно»[51].

Паспрабуем выказаць гіпотэзу. Значная частка той нарматыўнай базы, якая пашырыла паўнамоцтвы віленскага генерал-губернатара, была прынятая яшчэ ў часе кіравання У. І. Назімава — мураўёўскага папярэдніка[52]. Пры ім было ўведзенае ваеннае становішча. Ён прапанаваў зрабіць захады да супрацьпастаўлення шляхце сялянства, якое было зацікаўленае ў пашырэнні сваіх зямельных надзелаў і якое ў значнай меншай ступені думала пра збліжэнне з Царствам Польскім або пра адраджэнне Польшчы як дзяржавы, чым адукаваны клас. Але Назімаў, які шанаваў сваю рэпутацыю міратворцы, а не ўтаймавальніка, не мог ці сапраўды, як і падазраваў Мураўёў, не хацеў выкарыстоўваць дадзеныя яму паўнамоцтвы цалкам. Невыпадкова, напрыклад, ён не канфірмуе смяротны прысуд ксяндзам Станіславу Ішоры і Раймунду Зямацкаму, але і не адмяняе гэты прысуд. Ён можа патрабаваць увядзення на тэрыторыю генерал-губернатарства падраздзяленняў рэгулярнай арміі, але не робіць гэтага, пакідаючы ў ваганнях і бяздзеянні ваеннага міністра Дз. А. Мілюціна. Прычым усё гэта адбываецца пры маўклівай згодзе імператара.

Гэта звязана з тымі адносінамі, якія склаліся ў Аляксандра Мікалаевіча, яшчэ цэсарэвіча, з Уладзімірам Іванавічам Назімавым: у 1836 годзе Назімаў быў прызначаны знаходзіцца пры наступніку трона ў якасці інструктара па вайсковай справе. Улічваючы тое, як ставіўся да ваеннай муштры бацька будучага «цара-вызваліцеля», можна зразумець, які гэта быў давер і колькі часу вымушаны быў праводзіць Назімаў са сваім вы-

---

51 Милютин Д. А. Воспоминания. С. 429.

52 Гл., напрыклад, пра гэта: Комзолова А. А. Политика самодержавия в Северо-Западном крае в эпоху Великих реформ. М., 2005. С. 20–37.

идея. Мы говорим о владычестве России или православия. Эти идеи для нас, а не для поляков, и мы сами употребляем их название неискренно. Здесь собственно нет речи о России, а речь о самодержце русском, царе польском, конституционном вел. кн. финляндском. Это не идея, а аномалия. Нужна идея, которую мог бы усвоить себе хотя бы один поляк» — Валуев П. А. Дневник министра внутренних дел. Т. 1. С. 258–259.

[17] Далгарукаў Васіль Андрэевіч (1804–1868) — князь, расійскі дзяржаўны дзеяч. Генерал ад кавалерыі (1856). Ваенны міністр (1852–1856), член Дзяржаўнага савета (з 1856 г.), шэф жандараў і начальнік III Аддзялення ўласнай Яго Імператарскай вялікасці канцылярыі (1856–1866). Яго сваяк П. У. Далгарукаў пісаў пра яго: «Бездарность полная и совершенная; эгоизм, бездушие в высшей степени; ненависть ко всему, что умно и просвещенно; боязнь в виду всякой мысли, в виду всего, что независимо и самостоятельно. [...] Невзирая на свою неспособность, Василий Андреевич один из самых вредных для России лиц» — Долгоруков П. В. Петербургские очерки. С. 192–193. Характарызуючы адносіны В. А. Далгарукава да М. М. Мураўёва, ён жа гаворыць: «Василий Андреевич... Муравьева готов был бы полюбить, если бы, подобно всем придворным, не опасался, что Муравьев заберет всю власть к себе в руки, что, как всем известно, было целью трехпрогонного вешателя» — Тамсама. С. 190.

[18] Гарчакоў Аляксандр Міхайлавіч (1798–1883) — святлейшы князь (1871), расійскі дзяржаўны дзеяч і дыпламат. Міністр замежных спраў (1856–1882), канцлер Расійскай імперыі (1867–1883). Ваенны міністр Д. А. Мілюцін пісаў: «Князь Горчаков... в качестве министра иностранных дел должен был иметь голос в вопросе, касавшемся Царства Польского. Мало знакомый с делами гражданскими и с внутренней администрацией, он обыкновенно в прениях по таким делам избегал высказывать какие-либо мнения конкретные, а ограничивался общими фразами, более или менее отвлеченными, или, как сам он говорил, «крупными чертами», «высшими взглядами». В этих громких фразах любил он пощеголять либеральным образом мыслей... К тому же и в качестве дипломата не мог он отрешиться от традиционных взглядов европейских на шляхетскую Польшу. Князь Горчаков при-

надлежал к числу тех тщеславных людей, которые очень легко поддаются лести и обольщениям, а поляки имели ловких ходатаев в том кругу петербургского общества, в котором вращался князь Горчаков» — Милютин Д. А. Воспоминания. 1863–1864. М., 2003. С. 341–342.

[19] Незалежнасць Польшчы ў межах 1772 г., то бок да падзелаў Рэчы Паспалітай.

[20] Замойскі Анджэй (1800–1874) — граф, польскі палітык і дзяржаўны дзеяч, у 1857–1862 гг. — старшыня польскага Землеробчага таварыства. Прапаноўваў уласную праграму вырашэння «сялянскага пытання» ў Царстве Польскім, аднак не быў падтрыманы ўрадам. У 1862 г. атрымаў імператарскае ўказанне пакінуць тэрыторыю імперыі і больш туды не вяртацца.

[21] М. М. Муравьеў відавочна згушчае фарбы: у 1861 г. гаворка пра ўзнаўленне поўнай незалежнасці і дзяржаўнасці Польшчы нікім з тых, хто дзейнічаў публічна, у Царстве Польскім не вялася. П. А. Валуеў у дзённіку адзначае: «Все варшавские notabilités всех сословий, от Фиалковского и Замойского (арцыбіскупа Варшаўскага. — *А. Ф.*) до Шленкера (купца. — *А. Ф.*), подписали адрес, представленный наместнику. В этом адресе не выражается никакого категорического желания или просьбы ни о статуте 1832 г., ни о конституции конгресского царства, но только приносится е. и. величеству общая просьба обратить внимание на злополучное состояние Польши. Наместник принял адрес» — Валуев П. А. Дневник министра внутренних дел. Т. 1. С. 74.

[22] Ідэя ўзвесці брата імператара на польскі трон узнікала ў XIX ст. двойчы. Упершыню — у сувязі з прызначэннем галоўнакамандуючым арміяй Царства Польскага цэсарэвіча Канстанціна Паўлавіча, які атрымаў рэпутацыю паланафіла. Пэўныя падставы для гэтага з’явіліся пасля марганатычнага шлюбу Канстанціна Паўлавіча з графіняй Яаннай Грудзінскай, якая атрымала тытул княгіні Ловіч. Аднак ні ў выпадку з Канстанцінам Паўлавічам, ні ў выпадку з Канстанцінам Мікалаевічам імператар не хацеў рызыкаваць і ствараць паралельнае адгалінаванне дома Раманавых для польскай манархіі, а таму імператар усерасійскі заставаўся адначасова і царом польскім.

[23] Аляксандра Іосіфаўна (народжаная прынцэса Саксэн-Альтэнбургская, 1830–1912) — вялікая княгіня, жонка вялікага князя Канстанціна Мікалаевіча. Пар.: «В Варшаве поляки все еще надеялись на успех восстания. Этот дух поддерживался в них недостаточно энергическими и даже казавшимися двусмысленными мерами наместника в царстве, великого князя Константина Николаевича, а также ходившими слухами об участии, оказываемом полякам его женою» — <Дельвиг А. И.> Полвека русской жизни. Воспоминания А. И. Дельвига. 1820–1870: в 2 т. Т. 2. М.-Л., 1930. С. 207. Паводле словаў П. У. Далгарукава, Аляксандра Іосіфаўна — «женщина ума недальнего, но искренно привязанная к своему мужу, она страшится для него политической деятельности и мщения врагов политических» — Долгоруков П. В. Петербургские очерки. С. 125.

[24] «Наполеон III дал понять барону Будбергу (расійскаму паслу ў Францыі. — *А. Ф.*), что возбуждение общественного мнения во Франции может вынудить французское правительство вмешаться в польское дело, если сам император Российский не поможет ему чем-либо успокоить это настроение. Наш вице-канцлер полагал, что лучшим к тому средством может служить амнистия польским мятежникам и новое подтверждение благодушных видов Государя относительно будущего государственного устройства Царства Польского. В таком смысле и был редактирован Высочайший манифест 31 марта: в нем прежде всего высказывалось, что Государь не винит весь народ польский в возникшем мятеже, наиболее для него же самого пагубном, и в своем горячем желании положить конец бесцельному кровопролитию, готов предать забвению все прошлое. Полное прощение объявлялось тем из вовлеченных в мятеж подданным Царства Польского, которые, не подлежа судебной ответственности за какие-либо иные преступления, уголовные, или по службе в войсках, сложат оружие и возвратятся к своему долгу до 1/13 мая. В манифесте указывались те начала, которые были положены Государем в основание будущего благоустройства Царства Польского и которых дальнейшее развитие было прервано возникшим в крае мятежом» — Милютин Д. А. Воспоминания. 1863–1864. М., 2003. С. 116.

[25] 13 (26) красавіка непадалёк ад Краслаўкі (цяпер г. Краслава, Латвія) атрад паўстанцаў, які ўзначальваўся графам Л. Плятэрам, здзейс-

ніў напад на транспарт, што рухаўся з Дынабурга ў Дзісну са зброяй для Мурамскага пяхотнага палка.

[26] Плятэр Лявон (1836–1863) — граф, паўстанец. Удава З. Серакоўскага, Апалонія, характарызуе яго як «чалавека здольнага, дабраroднага» — гл.: Sierakowska z Dalewskich A. Wspomnienia. Warszawa: Neriton, 2010. S. 175. Паводле ўспамінаў А. А. Ауэрбаха, «за графа Плятера..., принимавшего деятельное участие в мятеже, пойманного и содержавшегося в Динабургской крепости, сильно хлопотали его богатые аристократические родственники в Петербурге, чтобы освободить его от предстоящей ему смертной казни. Чрез тогдашнего петербургского генерал-губернатора, светлейшего князя Суворова-Италийского, родственникам графа Плятера удалось довести свое ходатайство до государя императора Александра Николаевича, который телеграфировал Муравьеву помиловать Плятера. На эту просьбу государя Муравьев в тот же день телеграфировал государю: «Плятер повешен»» — Ауэрбах А. А. Воспоминания // Исторический вестник. 1905. № 10. С. 42. На месцы пакарання смерцю Л. Плятэра ў Даўгаўпілскай крэпасці на 150-годдзе яго пагібелі быў усталяваны памятны знак, у адкрыцці якога бралі ўдзел прэзідэнты Польшчы і Латвіі.

[27] М. М. Мураўёў піша пра рэвалюцыю 1848 г. ў Галіцыі (частка Польшчы і Украіны, якая належала Аўстрыі), вынікам якой сталася адмена прыгонных абавязкаў сялян перад памешчыкамі, атрыманне імі асабістай свабоды, а таксама актывізацыя нацыянальнага руху палякаў і русінаў. Разам з тым існуе высокая верагоднасць таго, што публікатары тэксту няправільна расчыталі рукапіс, або ў спісе, паводле якога публікаваліся ўспаміны, была дапушчаная памылка. «Резня» ў Галіцыі сапраўды была, аднак не ў 1848, а ў 1846 г.: аўстрыйскія ўлады, каб не дапусціць польскага нацыянальна-вызваленчага паўстання, інспіравалі чуткі пра тое, што шляхта намерваецца пачаць сілавыя дзеянні супраць сялянства. У выніку 19 лютага 1846 г. пачалося масавае руйнаванне шляхецкіх сядзіб: у лютым-сакавіку было знішчана больш за 500 памешчыцкіх маёнткаў. Як пісаў А. Авейдэ, які быў выразнікам таго, як паставілася да галіцыйскай разаніны ці не большая частка паўстанцаў 1863–1864 гг., «с появлением первых отдельных вооруженных повстанцев мужики... бросились и на них, и на

дворы своих панов и вырезали тогда 800 семейств. Вырезали дико, варварски, с такими возмущающими человеческую натуру поруганиями, какие свойственны только пьяному, невежественному, деморализованному рабством и дышащему ненавистью жалкому невольнику. [...] Тела убитых и немногих страшно изувеченных мужики привозили в окружные управления и там из рук австрийцев получали каиновские гульдены за головы братьев» — гл.: Показания и записки о польском восстании 1863 года Оскара Авейде. М., 1961. С. 248.

Характэрна, што М. М. Мураўёў фактычна санкцыянаваў той жа прынцып «стымулявання» сялян у барацьбе з паўстанцамі ў Літве і Беларусі (толькі без забойстваў). У прыватнасці, была распаўсюджаная ўлётка на беларускай мове з тэкстам: «Звяжы пана — грошы будуць!», маляваная копія якой захавалася ў складзе рукапісу невядомага арыштанта Магілёўскай крэпасці ў польскай Нацыянальнай бібліятэцы (адзінка захавання: BN. Rkps. I. 6540, k. 15).

[28] Моль Аляксандр (?—1863) — граф, памешчык Дынабургскага павета, удзельнік Рэвалюцыйнага кіравання Інфлянцкіх надзелаў; пакараны смерцю разам з графам Л. Плятэрам.

[29] У 1827 г. пры арганізацыі Асобнага корпуса жандараў Расійская імперыя была падзеленая на 5 жандарскіх акруг, сярод якіх была і Віленская акруга.

[30] Гільдэбрант Аляксандр Міхайлавіч фон (1802 —?) — генерал-маёр, начальнік 4-й Акругі корпуса жандараў (1861–1863).

[31] Рэжыца — павятовы горад Віцебскай губерні (цяпер г. Рэзэкнэ, Латвія).

[32] «У Інфлянтах урад радаваўся: раскольнікі нападалі на маёнткі, рабуючы і забіваючы...» — Sierakowska z Dalewskich A. Wspomnienia. Warszawa, 2010. S. 175.

[33] Зеляной Аляксандр Аляксеевіч (1819–1880) — расійскі дзяржаўны дзеяч, генерал-ад'ютант (1863), генерал ад інфантэрыі. Таварыш міністра (1856–1862), пасля міністр дзяржаўных маёмасцяў (1862–1872). Член Дзяржаўнага савета. П. У. Далгарукаў адзначае, што А. А. Зеляной «обязанный своей карьерой Муравьеву-вешателю, что делает из-

лишней какую-либо характеристику» — Долгоруков П. В. Петербургские очерки. С. 285.

[34] Генерал-ад'ютант — вайсковае, пасля свецкае званне ў Расійскай імперыі. З 1808 г. ужывалася як ганаровая адзнака для асобаў, не ніжэй тых за III клас паводле Табеля аб рангах — для абазначэння іх набліжанасці да імператара.

[35] Длатоўскі Эраст Канстанцінавіч (1807–1887) — генерал ад інфантэрыі, у 1863 г. ваенны начальнік Віцебскай губерні.

[36] Ваенны міністр Д. А. Мілюцін пісаў пра знішчэнне атрада Л. Плятэра і А. Моля: «Крестьяне окрестных селений сами расправились с панами: они отбили у них транспорт, переловили самих мятежников и представили их начальству, причем пятеро крестьян были ранены» — Милютин Д. А. Воспоминания. 1863–1864. М., 2003. С. 149.

[37] Пад выхадам у палацавым цырыманіяле мелася на ўвазе ўрачыстае шэсце па залах Зімняга палаца з нагоды якога-небудзь свята, у прыватнасці царкоўнага. Малы выхад адрозніваўся тым, што ў ім удзельнічалі члены царскай сям'і. Аднак дзень нараджэння імператара ў 1863 г. не быў выключэннем: «Государь, в день своего рождения, принимал поздравления по окончании обедни в Малой дворцовой церкви, где обыкновенно присутствовали в таких случаях кроме Императорской фамилии только некоторые из высших чинов и должностных лиц» — Милютин Д. А. Воспоминания. 1863–1864. М., 2003. С. 119. Такім чынам, прысутнасць адпраўленага ў адстаўку з міністэрскай пасады М. М. Мураўёва, які відавочна знаходзіўся ў няміласці, магла азначаць толькі вяртанне яго ў кола найбольш уплывовых чыноўнікаў імперыі.

[38] Пасаду ковенскага губернатара з верасня 1861 да 4 чэрвеня 1863 г. займаў контр-адмірал Рыгор Аляксандравіч Крыгер (1820–1881).

[39] Самагіція — старая руская назва Жамойці (Жмудзі), этнаграфічнага рэгіёна на паўночным захадзе сучаснай Літвы.

[40] Упершыню М. М. Мураўёў апынуўся ў беларускіх і літоўскіх губернях у 1827 г., калі быў прызначаны віцэ-губернатарам у Віцебскую губерню.

[41] У дадзеным выпадку М. М. Мураўёў кажа праўду, бо шмат хто з паўстанцаў 1863–1864 гг. быў звязаны сваяцкімі адносінамі з паўстанцамі 1830–1831 гг.; у прыватнасці, кіраўнік паўстанцкага атрада, які дзейнічаў пры Дынабургу — граф Лявон Плятэр — належаў да вядомай арыстакратычнай сям'і, многія члены якой удзельнічалі ва ўсіх трох паўстаннях канца XVIII–XIX ст. (у тым ліку вядомая Эмілія Плятэр).

[42] У Францыі дзейнічала шматлікая польска-літоўская эміграцыя, якая мела значны ўплыў на ўрад імператара Напалеона III, у тым ліку праз міністра замежных спраў Аляксандра Калона-Валеўскага, сына Напалеона I і польскай графіні Марыі Валеўскай.

[43] Дз. А. Мілюцін прызнаваўся пазней у мемуарах: «В первые два месяца... распоряжения наши ограничивались лишь укомплектованием частей войск, расположенных в Царстве Польском и западных губерниях; но когда мятеж принял значительные размеры и распространился на Западный край, а еще более, когда в дело польское начала вмешиваться дипломатия, тогда сделалось ясным, что наши силы недостаточны не только для войны внешней, но и для энергического подавления мятежа, поддерживаемого извне. Тогда признано было необходимым привести в полный состав и остальные части армии призывом бессрочноотпускных и рекрутами январского набора, а вместе с тем приступить к целому ряду мер для развития наших вооруженных сил формированием новых боевых частей. Тогда уже не время было заботиться о сокращении расходов, что было поставлено Военному министерству главной задачей в предшествующие годы, а предстояло напрягать все силы, чтобы не быть застигнутыми врасплох европейской коалицией в союзе с внутренним врагом» — Милютин Д. А. Воспоминания. 1863–1864. М., 2003. С. 158–159.

[44] Мураўёў (Мураўёў-Карскі) Мікалай Мікалаевіч (1794–1881) — граф, расійскі дзяржаўны і ваенны дзеяч. Генерал-ад'ютант (1833), генерал ад інфантэрыі (1853). Намеснік на Каўказе і галоўнакамандуючы Асобным каўказскім корпусам (1854–1856). Член Дзяржаўнага савета (1856).

[45] «Одновременно с устройством войск приступлено было и к приведению в оборонительное состояние наших береговых крепостей: на Балтийском море — Кронштадта, Свеаборга, Выборга и Дина-

мюнде, на Черном море — Керчи. В особенности закипели работы в Кронштадте, где в то время, несмотря на вложенные уже в его укрепления многие десятки миллионов рублей, оборона все еще была весьма недостаточна. [...] В Выборге предпринято было создать заново целую систему морской обороны укреплением некоторых островов в Транзунде и заграждением проходов между ними. В Свеаборге и Керчи также требовалось произвести обширные работы. Все распоряжения по инженерной части лежали на генерал-адъютанте Тотлебене» — Милютин Д. А. Воспоминания. 1863–1864. М., 2003. С. 162.

[46] Збянтэжанасць імператара робіцца зразумелай, калі ўзгадаць, як будаваліся яго адносіны з М. М. Мураўёвым да таго, як той быў адпраўлены ў адстаўку з пасады міністра; напрыклад, П. А. Валуеў запісаў 22 лютага 1861 г. ў дзённіку: «Видел Зеленого, который передал мне, что при последнем докладе государь почти сказал Муравьеву, что не желает иметь его министром. Он с гневом, и, ударив по столу, сказал, что не позволит министрам противодействовать исполнению утвержденных им постановлений по крестьянскому делу и что управляющие палатами государственных имуществ должны помогать, а не противиться исполнению этих постановлений» — Валуев П. А. Дневник министра внутренних дел. Т. 1. С. 74. Фактычна ўвесь апошні год знаходжання на пасадзе міністра дзяржаўных маёмасцяў М. М. Мураўёў быў у непрыхаванай апазіцыі да ўрадавага курсу, што выклікала сапраўднае раздражненне імператара.

[47] М. М. Мураўёў патрабаваў перадачы пад яго кантроль усёй ахопленай паўстаннем тэрыторыі, якая не трапляла пад юрысдыкцыю Царства Польскага.

[48] М. М. Мураўёў мае на ўвазе дзейнасць князя А. Е. Чартарыйскага, які са згоды імператара Аляксандра І узначаліў Віленскую навучальную акругу, дзе ўсё выкладанне вялося на польскай мове, а пачатковая адукацыя пры гэтым знаходзілася пад кантролем каталіцкіх манаскіх ордэнаў піяраў і езуітаў.

[49] Талстой Пётр Аляксандравіч (1761–1844) — граф, расійскі военачальнік і дзяржаўны дзеяч; генерал ад інфантэрыі. У 1831 г. камандуючы Рэзервовай арміяй. Член Дзяржаўнага савета (1834).

[50] Мілюцін Дзмітрый Аляксеевіч (1816–1912) — граф; расійскі дзяржаўны дзеяч. Генерал-ад'ютант, генерал-фельдмаршал. Ваенны міністр (1861–1881), член Дзяржаўнага савета. П. У. Далгарукаў, злы на язык, які рэдка калі ацэньваў станоўча каго-кольвек з вышэйшых дзяржаўных чыноў, піша пра яго як аб«человеке замечательных способностей, отличнейшем администраторе, человеке двуличном, под видом скромности исполненном тщеславия, под видом добродушия — эгоисте, под видом простосердечия — ловком придворном» — Долгоруков П. В. Петербургские очерки. С. 284.

[51] Пар. запіс у дзённіку П. А. Валуева ад 27 красавіка 1863 г.: «Утром был на похоронах митрополита Жилинского. [...] Потом на 2-часовом совещании у военного министра с Муравьевым, кн. Долгоруковым и Зеленым. Толку мало, но это сговаривание было необходимым» — Валуев П. А. Дневник министра внутренних дел. Т. 1. С. 221.

[52] П. А. Чарэвін, які пэўны час служыў чыноўнікам для асаблівых даручэнняў пры віленскім генерал-губернатары, відавочна грунтуючыся на словах Мураўёва, сцвярджае, што тут з'яўляецца яшчэ адзін удзельнік размовы: «В это же время отворилась дверь, и из соседней комнаты вошла императрица, вероятно слышавшая весь происшедший разговор; государыня, подошед к М. Н. Муравьеву со слезами на глазах, просила его не отказываться от данного обещания принять управление краем, просила его удержать за Россиею этот край, говоря, что о Царстве Польском нечего и говорить, что там дело уже пропало, что просит этого она, император, Россия, что ему, М. Н., следует, несмотря на все препятствия, встречаемые среди некоторых лиц в Петербурге, вввериться государю, который и ему верит» — цыт. паводле: Черевин П. А. Воспоминания: 1863–1865 гг. Кострома, 1920. С. 14.

[53] Мураўёва (народжаная Шарамецева) Пелагея Васільеўна (1802–1871) — жонка М. М. Мураўёва.

[54] Мураўёва (у замустве Шарамецева) Соф'я Міхайлаўна (1833–1880) — дачка М. М. Мураўёва.

[55] Даклады адбываліся ў далёка не спакойнай атмасферы: М. М. Мураўёў патрабаваў усё большага пашырэння сваіх паўнамоцтваў, з чым

не згаджаліся, у прыватнасці, шэф жандараў В. А. Далгарукаў і міністр унутраных спраў П. А. Валуеў. Імператар найчасцей падтрымліваў меркаванне апошніх, таму ўзнікалі канфліктныя сітуацыі. З нагоды падобных дакладаў і нарадаў, што іх суправаджалі, П. А. Валуеў адзначаў у дзённіку — 7 мая: «Государь, возвращая мое письмо, отметил на нем, что имел с ген. Муравьевым весьма серьезный разговор и надеется, что оный на него подействует...»; 8 мая: «Ген. Зеленый заезжал ко мне и говорил, что при докладе его в Царском государь объяснялся с ним насчет вчерашнего разговора с ген. Муравьевым и говорил ему, что он, государь, вышел совершенно из себя и просит его, Зеленого, и нас всех просит, чтобы уладить все ввиду нынешних затруднений, призывая на помощь наши патриотические чувства»; 10 мая: «...совещание у государя с военным министром, кн. Долгоруковым, Муравьевым и Зеленым. Государь был жесток с Муравьевым» — Валуев П. А. Дневник министра внутренних дел. Т. 1. С. 223.

[56] Марыя Аляксандраўна (1824–1880) — імператарка, жонка Аляксандра II.

[57] Казанскі сабор (Сабор Казанскай Божай маці) — адзін з найбуйнейшых праваслаўных храмаў Санкт-Пецярбурга, пабудаваны ў 1801–1811 гг. архітэктарам А. Н. Вараніхіным як месца захавання цудадзейнай іконы Казанскай Божай Маці. У 1813 г. стаў месцам пахавання М. І. Кутузава; тут жа захоўваліся і ключы ад забраных гарадоў, штандары і сцягі падраздзяленняў напалеонаўскага войска, якія пацярпелі паразу. Апошняя акалічнасць робіць выбар месца малебна Мураўёва перад ад'ездам у Вільню асэнсавана сімвалічным: ён пазіцыянуецца як новы Кутузаў — новы «выратавальнік Айчыны».

[58] М. М. Мураўёў не перабольшвае ступень арганізаванасці паўстання ў Літве і Беларусі. Пра тое самае сведчаць успаміны лідара партыі «белых» паўстанцаў Якуба Гейштара, які пералічвае імёны кіраўнікоў губернскіх і павятовых паўстанцкіх камітэтаў — гл.: Pamiętniki Jakóba Giejsztora z lat 1857–1865. T. 1. S. 246–256. Я. Гейштар з гонарам завяршае апісанне паўстанцкай структуры Літвы: «Мушу прызнаць тут, што ў цэлым не мелі мы недахопу ў людзях энергічных і адданых» — Ibid. S. 260.

[59] Ваенны міністр Дз. А. Мілюцін, калі пакінуць па-за ўвагай натуральную для яго эмацыйную адмоўную ацэнку паўстання малюе цалкам дакладную карціну: «С 11 января шайки мятежников возрастали с каждым днем как по всему пространству Царства Польского, так и в прилежащих к нему частях западных губерний. Формировались они преимущественно в глухих лесах, несмотря на суровое время года. Мятежники вооружались, чем попало: охотничьими ружьями, двустволками, револьверами и пистолетами, кинжалами, ножами, а потом, когда образовались более многочисленные шайки, главную массу их составляли пешие толпы «косинеров», т. е. вооруженных косами. Помещики и люди состоятельные составляли конницу. Начальство над шайками принимали преимущественно личности, служившие прежде в войсках русских или иностранных, влиятельные помещики, выказавшие особенное рвение к мятежу и щедрость в пожертвованиях на «народное» дело» — гл.: Милютин Д. А. Воспоминания. 1863–1864. М., 2003. С. 45.

[60] Свядома ці несвядома, М. М. Мураўёў аб'ядноўвае дзве розныя падзеі, пра якія згадвае педагог Віленскай гімназіі В. П. Кулін: «Вильна облеклась в траур... Русских дам, не носивших траура, оскорбляли на улицах дерзостями, ругательствами, плевками, а платья их обливали чернилами и серною кислотой. При встречах дам, черной и светлой, иногда происходили перебранки в таком роде (задирала всегда черная): “А, ты пшеклента москевка!” На такое приветствие некоторые бойкие русские дамы отвечали подобною же учтивостию: “А, ты, проклятая полячка” или “чернявка”. [...] Безнаказанность поощряла к дальнейшим наглостям, и дело дошло до того, что наш достойнейший архипастырь, епископ Александр, на главной улице днем оскорблен был заплеванием от какой-то “чернявки”. И эта возмутительная дерзость прошла безнаказанно, равно как и оскорбление дочерей генерал-губернатора, у которых светлые платья облили кислотою» — Кулин В. П. Из записок виленского старожила // Русская старина. 1893. № 7. С. 62–63.

[61] Граф Людвік Плятэр, маршалак шляхты Дынабургскага павета, сапраўды быў стрыечным братам пакаранага смерцю Лявона Плятэра. У адміністратыўным парадку (без суда) быў высланы пад нагляд па-

ліцыі ў Арэнбургскую губерню, частка яго ўладанняў трапіла пад секвестр.

[62] У заходніх губернях дзейнічала сістэма, прынятая таксама ў Царстве Польскім: практычна ўсе чыноўнікі былі мясцовыя, прыезд чыноўніка звонку быў магчымы толькі ў выпадку ўтварэння вакансіі.

[63] Наяўнасць святароў сярод паўстанцаў асабліва бянтэжыла царскі ўрад: «Вообще духовенство католическое приняло самое деятельное личное участие в мятеже: не ограничиваясь пламенными речами и проповедями для возбуждения патриотического фанатизма, благословениями и напутственными молитвами на «святое» дело, ксендзы во множестве участвовали в самих шайках, и не только с крестом в руках, но и с мечом. [...] Много ксендзов оказывалось в числе убитых на полях сражений; многие были в числе попавших в плен» — Милютин Д. А. Воспоминания. 1863–1864. М., 2003. С. 45–46.

[64] Становішча У. І. Назімава «было крайне щекотливое: все предыдущие годы его управления были направлены на примирение польской национальности с русской. Это направление было преобладающим как в русском обществе, так и в правительственных сферах; генерал-губернатор имел инструкцию действовать в этом смысле, всякая крутая мера с его стороны была бы явным отрицанием его предыдущего управления, а между тем эта система оказывалась несостоятельною» — Бутковский Я. Н. Из моих воспоминаний // Исторический вестник. 1883. № 10. С. 87.

[65] Назімава (народжаная Аверкіева) Анастасія Аляксандраўна (1822–1865) — жонка У. І. Назімава.

[66] Камер-юнкер Мясаедаў – асоба ня высветленая.

[67] Апатаў – асоба ня высветленая.

[68] Іосіф (у мірскім жыцці Сямашка Іосіф Іосіфавіч) (1798–1868) — рэлігійны дзеяч; уніяцкі мітрапаліт Літоўскі, старшыня Грэка-ўніяцкай духоўнай калегіі, актыўны ўдзельнік ліквідацыі ўніяцкай царквы ў Расіі; пасля праваслаўны мітрапаліт Літоўскі, член Свяцейшага Сінода. З'яўляючыся гродзенскім губернатарам у 1831–1834 гг., М. М. Мураўёў падтрымліваў з Іосіфам сяброўскія кантакты. Пры гэтым

з У. І. Назімавым, калі той заняў пасаду Віленскага генерал-губернатара, адносіны ў Іосіфа не склаліся — гл.: Долбилов М. Д. Русский край, чужая вера: Этноконфессиональная политика империи в Литве и Белоруссии при Александре II. М., 2010. С. 77, 151 и др.

[69] Гаворка пра царкву Мікалая Цудатворцы — адзін з найстарэйшых праваслаўных храмаў Вільні (сучасны адрас: вул. Дзіджоі, 12). Царква была пабудаваная ў 1340 г. на сродкі жонкі князя Альгерда, княгіні Юльяны; перабудаваная ў 1514 г., пасля пажару, на сродкі князя Канстанціна Астрожскага. У 1827 г. храм быў адабраны ад уніятаў і перададзены Праваслаўнай царкве.

[70] Пар.: «Еврейское общество являло неописанную радость, что было слишком неестественно» — Мосолов А. Н. Виленские очерки (Муравьевское время): 1863–1865 гг. СПб., 1898. С. 22.

[71] Красінскі Адам Станіслаў (1810–1891) — рэлігійны дзеяч, з 1858 г. віленскі каталіцкі біскуп. Паводле словаў начальніка канцылярыі віленскага генерал-губернатара А. М. Масолава, А. С. Красінскі вылучаўся «нерасположением к правительству и сочувствием к мятежу» — Мосолов А. Н. Виленские очерки (Муравьевское время): 1863–1865 гг. СПб., 1898. С. 23. У 1863–1883 гг. у высылцы ў Вятцы. Паводле словаў таго ж А. М. Масолава, высылка была выкліканая спробай Красінскага ўхіліцца ад публічнага асуджэння паўстання з прычыны ўласнага нездароўя, прычым улады баяліся, што звесткі пра высылку біскупа прывядуць да дадатковых хваляванняў: «Когда Красинский отправлялся из Вильны, огромная толпа народа теснилась вокруг станции железной дороги. В один поезд с епископом сел и жандармский офицер, снабженный открытым предписанием, бумагами к разным губернаторам и значительными средствами для пути. До Динабурга никто ничего не знал, но приехав туда (здесь пасажиры пересаживаются на линию, идущую в Ригу), по выходе из вагонов епископа и его свиты (духовник, доктор и двое слуг), они были встречены местным военным начальником, который между тем был уведомлен по телеграфу, и помянутым жандармским офицером, объявившими епископу распоряжение начальства. Он повиновался без особаго смущения и спросил только, куда его повезут; получив в ответ, что его велено доставить во Псков, он видимо успокоился; один доктор был в отча-

янии, — он вовсе не располагал туда удалиться; но приказано было, лишь по приезде туда, объявить епископу о дальнейшем следовании к месту назначения, а спутникам его предложить или следовать за ним на собственный счет, или вернуться в Вильну. Доктор, разумеется, поспешил воспользоваться этим предложением; остальные отправились далее; велено было везти епископа в Новгород по шоссе, чтоб миновать Петербург и не останавливаться долго в Москве. Во все города, по пути следования до Вятки, дано было знать губернаторам и они принимали миры к скорейшему и удобнейшему его отправлению; для епископа же окончательное место ссылки оставалось тайною до Казани» — Мосолов А. Н. Виленские очерки (Муравьевское время): 1863–1865 гг. СПб., 1898. С. 35–36.

[72] «Епископ чрезвычайно много говорил, смеялся над мятежом и называл усмирение его охотой за повстанцами» — Мосолов А. Н. Виленские очерки (Муравьевское время): 1863–1865 гг. СПб., 1898. С. 23.

[73] Вядомы віленскі літаратар і цэнзар П. В. Кукальнік адгукнуўся на ад’езд У. І. Назімава наступным вершам, які пазней змясціў і ў сваім зборніку:

**Владимиру Ивановичу Назимову.**
**По случаю оставления им должности**
**Виленскаго Генерал-Губернатора в 1863 году**

Чем песнь мою начну? Словами, иль слезами?
И можно ль петь, когда грусть сердце тяготит?
Как солнце наших дней, благими небесами
Дарованное, — рок безжалостный мрачит?
Замрет, под бременем судьбы ожесточенной,
В устах печальнаго певца неверный тон.
Из груди скорбию измученной, стесненной,
Что может вырваться? — Лишь только вопль иль стон.
Промчался счастья миг. Давно ли провиденье
Нам ниспослало все, что с жизнью нас дружит?
И вдруг все отняло. Уместно ль песнопенье
Когда вокруг себя встречаем скорби вид?
Песнь облегчения не даст душе унылой
Звук лиры в грустный дух отрады не прольет.

Над пеплом своего жилища, над могилой
Блаженства своего, — никто не запоет.
Но Тот, кто никогда сверх сил не отягчает
Творенья Своего, — кто посреди скорбей
Нам силы новыя и помощь посылает,
И ныне не лишил нас милости Своей.
И ныне по струнам мы лиры грянем. — Мало!
Мы будем прославлять хвалою небеса.
Да! — Славить — за тебя: Что милость Провиденья, —
За подвиги любви и самоотверженья,
За бремя, коего все тягости, — один,
По стропотной стезе, ты нес как исполин,
Чтобы покоить нас, — дарит Тебе в награду
Невозмутимый мир, спокойствие, отраду,
Какие на земле столь редко ныне зрим. —
Наградою Твоей, и счастием Твоим
Мы будем счастливы, — и с теплою мольбою
Благословения пошлем в след за Тобою.
И имя славное Твое, из рода в род,
К позднейшим между нас потомкам перейдет.
Пред ними именем мы будем сим гордиться,
И с детства за тебя приучим их молиться
За то участье к нам средь горести и бед;
За сердце кроткое, за счастья восемь лет.
Известно сей стране, известно перед светом
Известно Богу, чем Ты был для нас! С какой
Отеческой любви исполненной душой
Ты путь нам освещал примером и советом,
С какою кротостью, любовию вникал
Ты в наши нужды! Кто из нас не испытал
Готовности Твоей, сердечнаго желанья
Снять бремя с наших душ и облегчить страданья?
Кого отринул Ты? И темный мещанин,
Сановник и богач и бедный селянин,
Как к сердцу кровь к Тебе свободно обращались,
И никогда в Твоей любви не ошибались.
О! приймет Царь небес молений наших глас.
Сторицей наградит то самоотверженье,
С каким Ты восемь лет хранил, покоил нас,
И на семью Твою прольет Благословенье.

Цыт. паводле: Стихотворения Павла Кукольника. Том II. Вильна: Печатня А. Г. Сыркина, 1872. С. 6–7. Улічваючы надзвычайную рэдкасць цытаванага выдання, падаем верш цалкам, выказваючы пры гэтым нашу ўдзячнасць загадчыку кафедры русістыкі Вільнюскага ўніверсітэта доктару гуманітарных навук Паўлу Лаўрынцу, які даслаў нам гэты тэкст.

[74] Філарэт (да пострыгу Драздоў Васіль Міхайлавіч) (1782–1867) — праваслаўны рэлігійны дзеяч, мітрапаліт Маскоўскі і Каломенскі, член Свяцейшага Сінода. Адзін з найаўтарытэтнейшых іерархаў рускай праваслаўнай царквы XIX ст. М. М. Мураўёў мог бліжэй пазнаёміцца з мітрапалітам Філарэтам, бо меў супольнае з ім стаўленне да сялянскай рэформы: вядома, што хоць Філарэт быў аўтарам тэксту маніфеста аб адмене прыгоннага права, да ідэі вызвалення сялян ён ставіўся вельмі насцярожана.

[75] Абавязкі віленскага паліцмайстра выконваў маёр Міхаіл Андрэевіч Саранчоў (не пазней 1821 — пасля 1882), потым — палкоўнік і акруговы інтэндант Кіеўскай ваеннай акругі. Паводле меркавання Г. В. Кісялёва, які спасылаецца на нататкі Людвігі Радзевіч, Саранчоў спачуваў паўстанцам — гл.: Кісялёў Г. В. Сейбіты вечнага // Кісялёў Г. В. Сейбіты вечнага: артыкулы пра беларускіх пісьменнікаў і дзеячаў рэвалюцыйнага руху 1863 года; Скарынаўская сімволіка: вытокі, традыцыі, інтэрпрэтацыі. Мінск: Медысонт, 2009. С. 119.

[76] «На женщин, являющихся в трауре на улице или в общественном месте, налагался в первый и во второй раз денежный штраф (по 25 и 50 рублей), а в третий — они подвергались аресту. Служащим лицам было объявлено, что те, в семействе которых женщины будут носить траур, подвергнутся сами ответственности и будут исключены из службы. Для ношения же траура по ближайшим родным давались особые билеты от полиции» — гл.: Милютин Д. А. Воспоминания. 1863–1864. М., 2003. С. 238–239.

[77] Рашэнне М. М. Мураўёва пакараць смерцю арыштаваных ім ксяндзоў было прынятае яшчэ ў Пецярбургу. Захавалася сведчанне сучасніка, пасланага ваенным міністрам Дз. А. Мілюціным да Мураўёва, каб азнаёміць яго з запіскай У. І. Назімава пра неабходнасць

больш уважліва адносіцца да рымска-каталіцкай царквы, якая мае значны ўплыў на сялянства: «“—Да, это дело серьезное, — сказал Муравьев: надо подумать. (Помолчав): знаете ли: во всяком деле самое трудное это начало. Настоящая записка Назимова является как нельзя более кстати: она вполне развязывает мне руки. Теперь я знаю, что мне делать: первое, что я сделаю по приезде в Вильну, — это расстреляю ксендза”, — заключил Михаил Николаевич своим обычным мягким голосом» — Ф*. Михаил Николаевич Муравьев 1-го мая 1864 года // Русская старина. 1883. Т. 39, кн. 9. С. 653.

[78] «20-го мая, в 10 часу утра, сидя у себя дома, я был поражен отдаленным звуком барабана и трубы; звук этот все приближался, и с ним рос гул толпы. Все всполошились и бросились к окнам: по узкой Доминиканской (ныне Благовещенской) улице приближалась процессия: вели на казнь ксендза <Станислава> Ишору. Впереди ехали жандармы и казаки; далее, окруженный солдатами, бодро шел высокий молодой ксендз приятной наружности; рожки уныло играли; рядом с осужденным шел духовник, а за процессиею и вокруг нея кипела необозримая толпа народа. Женщины все еще были в черном и громко рыдали. Поляки не хотели верить, что правительство наше решится на казнь и даже самого Ишору уверили, говорят, что казнь будет лишь примерная. Но когда раздался залп, ужас был общий. Слышно было, что до 20 т. народу собралось на обширное поле Лукишки, где это происходило, и на возвышенностях, вокруг лежащих.

В этот день в городе было мрачно; русские и поляки, при встрече, косо друг на друга посматривали. Вина казненного заключалась в чтении возмутительного манифеста народу, собравшемуся в костеле. Подобное чтение, как впоследствии обнаружилось, происходило почти повсеместно в крае, в один и тот же день, кажется, 20-го января. [...] Ишора был задержан из первых, и потому на него пал жребий. Через 2 дня происходила новая казнь: расстреляны были старый ксендз <Раймунд> Земацкий и молодой шляхтич Лясковский. Я видел тоже, как они шли на казнь. Но казнь эта не произвела уже такого впечатления на жителей, как первая» — Мосолов А. Н. Виленские очерки (Муравьевское время): 1863–1865 гг. СПб., 1898. С. 28–29. Пар.: «Праз два дні пасля прыезду новы губернатар загадаў расстраляць ксяндза Ішору. Гэты святар, з’яўляючыся вікарыем, прачытаў маніфест

і пайшоў разам з паствай, але калі ён даведаўся, што за чытанне маніфеста арыштавалі пробашча, прыйшоў сам. Назімаў збіраўся выслаць яго ў Расію, Мураўёў загадаў расстраляць. [...] Праз некалькі дзён адбылося пакаранне смерцю ксяндза Зямацкага, Лясковіча, пазней і Ляснеўскага. На пакаранні смерцю ксяндза Зямацкага я прысутнічаў і ўзяў з сабой сямігадовага сына Тадэвуша, каб падрыхтаваць дзіця, што падобным чынам і ён можа страціць бацьку. На хлопчыка гэтае пакаранне смерцю зрабіла моцнае ўражанне; атрымаў ён нервовы шок, але больш уразіла яго цікаўнасць натоўпу» — Pamiętniki Jakóba Giejsztora z lat 1857–1865. T. 2. S. 32–33. Варта адзначыць таксама, што ксяндзоў пакаралі смерцю без папярэдняга пазбаўлення сану.

[79] Капітул — калегія з духоўных асоб пры каталіцкім біскупе, якія здзяйсняюць урачыстыя богаслужэнні.

[80] Кансісторыя — орган царкоўна-адміністратыўнага кіравання каталіцкай епархіяй у Расійскай імперыі.

[81] З. Серакоўскі «был представлен к светлому Христову воскресению в подполковники и не произведен только потому, что все производство по военному ведомству было отложено до 17-го апреля. В промежуток этого времени сделалось известным, что он предводительствует мятежнической шайкой» — <Дельвиг А. И.> Полвека русской жизни. Воспоминания А. И. Дельвига. 1820–1870: в 2 т. Т. 2. М.–Л., 1930. С. 209.

[82] Серакоўскі Зыгмунт (1826–1863) — кіраўнік паўстанцкіх атрадаў на Ковеншчыне. Вучыўся ў Пецярбургскім універсітэце (1845–1848), аднак быў арыштаваны і высланы ў Арэнбург (1848–1856), дзе даслужыўся да афіцэрскага звання. Скончыў Акадэмію Генеральнага штаба (1856–1859), быў актыўным супрацоўнікам Дз. А. Мілюціна па рэфармаванні прававых нормаў, што рэгламентуюць вайсковую службу, — у прыватнасці ў справе ліквідацыі цялесных пакаранняў. «Капитан Сераковский, — вспоминал позже российский военный министр, — тогда состоял при департаменте Генерального штаба и был употребляем для разных поручений как офицер бойкий и ретивый. Не только он исполнял усердно возлагаемые на него поручения, но напрашивался на них. В 1862 году ему поручен был осмотр военно-арестантских рот, которые находились тогда в хаотическом состоянии и требовали радикального

преобразования. Сераковский по этому случаю был в беспрерывных разъездах, и я был вполне доволен его усердным и толковым исполнением поручения... В продолжении многих лет он разыгрывал роль усердного, преданного службе офицера» — Милютин Д. А. Воспоминания. 1863–1864. М., 2003. С. 146–147. Быў адным з асноўных кіраўнікоў паўстання ў Літве і Беларусі. «Энтузіязм Зыгмунта і яго вера ў будучыню народа, нягледзячы на цяжкае становішча краю, дзейнічалі на ўсіх» — Pamiętniki Jakóba Giejsztora z lat 1857–1865. T. 2. S. 22. М. М. Мураўёў надаваў вялікую ўвагу персоне З. Серакоўскага не толькі таму, што бачыў у ім небяспечнага і таленавітага ворага, але, магчыма, і таму, што ў яго лёсе бралі ўдзел брытанскі амбасадар у Пецярбургу лорд Ф. Нэпір, які спецыяльна пісаў пра яго Дз. А. Мілюціну, а таксама пецярбургскі генерал-губернатар князь А. А. Сувораў, «который имел обычай оказывать покровительство всякому, кто бы ни обращался к нему с какой бы ни было просьбой» — Тамсама. С. 154.

[83] Ганецкі Іван Сцяпанавіч (1810–1887) — расійскі ваенны дзеяч; генерал-ад'ютант; генерал ад інфантэрыі; у 1855–1863 гг. камандзір лейб-гвардыі Фінляндскага палка, у 1863–1876 гг. — начальнік 3-й пяхотнай дывізіі.

[84] Калышка Баляслаў (1837–1863) — паўстанец, ураджэнец Лідскага павета. Вучыўся ў Маскоўскім універсітэце. Арганізатар найбуйнейшага паўстанцкага атрада ў Ковенскай губерні. Быў узяты ў палон на другі дзень бітвы пад Біржамі разам з З. Серакоўскім. А. Серакоўская перадавала аповед аднаго з ацалелых паўстанцаў, Доніча, пра тое, як Калышка быў схоплены: «Пасля бітвы... калі сабраліся раскіданыя атрады, першымі словамі Калышкі былі: “Дзе правадыр? Хто яго суправаджае?” [...] Набліжаючыся да Скробішкаў, зайшоў ён за больш падрабязнай інфармацыяй у прыдарожную хатку. У тую ж амаль хвіліну забегла гаспадыня з крыкам: “Уцякайце! Маскалі ідуць!” Некалькі спадарожнікаў Калышкі выскачылі ў акно на бок лесу; калі ён збіраўся зрабіць тое самае, пачуў словы салдатаў, што стаялі каля хаты: “Цяпер — калі Даленга схоплены...” Калышка зваліўся на лаву са словамі: «Няма чаго цяпер бегчы — усё прапала — правадыра схапілі». Уварваліся салдаты. На пытанне, хто ён, адказаў: “Калышка, якога вы даўно шукаеце”» — гл.: Sierakowska z Dalewskich A. Wspomnienia. Warszawa, 2010. S. 188.

Пакараны смерцю на некалькі тыдняў раней за Серакоўскага, які быў цяжка паранены. Паводле ўспамінаў сучасніка, Калышка ішоў на смяротнае пакаранне «все-таки молодцом, только физиономия у него была до того дерзка и нахальна, что он совсем не произвел того впечатления, на которое видимо бил и рассчитывал, так что даже непозволительный и возмутительный инцидент, — он оборвался и был уже руками, лежащий на помосте, додушен палачем, — многих не привел в ужас, а некоторые даже кричали: “Так ему и надо за те жестокости, которые он делал!” Колышко действительно отличался необыкновенным зверством с русскими, попадавшими ему в руки; не говоря уже про то, что он всех вешал, но он даже приказал в одном месте выпотрошить женщину на последних днях беременности и долженствовавшего родиться ребенка повесить рядом с ней» — гл.: Ауэрбах А. А. Воспоминания. Исторический вестник. 1905. № 10. С. 41. Удакладніць адпаведнасць словаў мемуарыста рэаліям па матэрыялах справы Б. Калышка падчас працы над дадзенымі каментарамі мы ня здолелі.

[85] «Было много искательств о смягчении приговора и, между прочим, от министра внутренних дел Валуева. Говорили даже, что было дано повеление о приостановлении приговора, но что депешу, извещающую об этом, Муравьев распечатал после его исполнения» — <Дельвиг А. И.> Полвека русской жизни. Воспоминания А. И. Дельвига. 1820–1870: в 2 т. Т. 2. М.–Л., 1930. С. 210.

[86] «Каб ускладніць рух паўстанцкіх атрадаў, Мураўёў загадаў стварыць з сялян варту пад камандай расійскіх жандараў, упаўнаважыўшы іх затрымліваць падазроных і абшукваць шляхецкія сядзібы. Варта гэтая, грозная за Дзвіной і Бярэзінай, чым больш набліжалася да Нёмана, тым больш страчвала свой варожы паўстанцам характар. Калі не лічыць, што, з аднаго боку, узнагароджвалі за схопленага паўстанца, а, з другога боку, каралі сурова за ўсялякую аказаную ім дапамогу, сяляне трымаліся ўважліва і асцярожна. Клапаціліся яны больш пра тое, каб не наклікаць на сябе маскоўскі гнеў, чым пра тое, каб шкодзіць паўстанцам якім-небудзь чынам. Праўду кажа адзін з паўстанцаў Мінскага ваяводства, што калі б нянавісць да паўстання з боку народа была істотнай, то “яно нават сарака васьмі гадзін не доўжылася б”. На Жмудзі і на літоўскім Падляшшы сяляне спачувалі

паўстанню і дапамагалі яму. Салдаты з Жмудзі ў расійскім войску неаднойчы былі руплівымі рэвалюцыйнымі прапагандыстамі» — Limanowski B. Powstanie narodowe 1863 i 1864 r. Lwów, 1990. S. 104.

[87] «Действия мятежников совершенно уронили законную власть, — доносил в Петербург 23 апреля 1863 г. ковенский жандармский штаб-офицер И. Н. Скворцов. — Исправники, становые приставы, судебные следователи и другие чиновники, не имея возможности выехать в уезды без военного отряда, лишились возможности исполнять свои обязанности... Нижние же полицейские чины, из опасения быть повешенными, отказываются от службы правительству или, оставаясь на службе, исполняют распоряжения не своего начальства, а мятежников» — цыт. паводле: Комзолова А. А. Политика самодержавия в Северо-Западном крае в эпоху Великих реформ. М., 2005. С. 36.

[88] Гродзенскі губернатар І. У. фон Галер пісаў пра міравых пасярэднікаў міністра ўнутраных спраў П. А. Валуева, што яны, «будучи избраны предводителями дворянства из числа владельцев мелкопоместных, дорожа содержанием и отношениями к помещикам самостоятельным, уклонялись от рассмотрения жалоб крестьян и от доставления обиженным должного удовлетворения» — цыт. паводле выд.: Комзолова А. А. Политика самодержавия в Северо-Западном крае в эпоху Великих реформ. М., 2005. С. 28. Часткова гэтая характарыстыка супадае з тым, што піша ва ўспамінах Якуб Гейштар, які быў актыўным праваднікам сялянскай рэформы ў Літве: «Выбар іх <міравых пасярэднікаў> быў справай найважнейшай, таму што ад іх залежаў часта ўвесь кірунак рэформы. Урад прызначыў ім па паўтары тысячы рублёў утрымання; пры тым маглі яны жыць у вёсцы, не пакідаючы сваіх маёнткаў і гаспадаркі. Няма нічога дзіўнага, што шмат хто з памешчыкаў шчыра жадаў атрымаць гэтую пасаду, а маршалкі шляхты паўсюль імкнуліся прызначыць добразычлівых да сябе» — Pamiętniki Jakóba Giejsztora z lat 1857–1865. T. 1. S. 100. Разам з тым, паколькі широка распаўсюджваліся звесткі пра тое, што ўрад пачаў рэформы, каб збядніць шляхту, многія пасярэднікі сапраўды ўдзельнічалі ў паўстанні.

[89] Ужо падчас падрыхтоўкі паўстання адбыўся падзел на «белых» і «чырвоных». «Белымі» лічыліся прыхільнікі паўстання, якія прытрымліваліся ідэі максімальнага выкарыстання наяўных легаль-

ных магчымасцяў дзеяння, але пры гэтым выкарыстоўваць таксама ціск еўрапейскіх дзяржаў з мэтай узнаўлення незалежнасці Польшчы ў межах 1772 г. і на аснове Канстытуцыі 3 мая (унітарная дзяржава). «Чырвоныя» былі больш радыкальныя ў адносінах да імперскіх уладаў, з'яўляліся прыхільнікамі ўзброенай барацьбы і тэрору, аднак «чырвоныя» губерняў, якія ўваходзілі ў склад Паўночна-Заходняга краю, выступалі пры гэтым за самастойнасць Літвы і Беларусі (фактычна — за федэратыўны лад будучай Польшчы з улікам гістарычнай традыцыі і нацыянальных асаблівасцяў краю) і за радыкальнае вырашэнне зямельнага пытання з улікам рэальных інтарэсаў сялянства.

Апісанне ковенскага з'езда пасярэднікаў 8 студзеня 1863 г., выкарыстанага адначасова для вырашэння арганізацыйных пытанняў будучага паўстання, гл.: Pamiętniki Jakóba Giejsztora z lat 1857–1865. T. 1. S. 204–206.

[90] Часовае палажэнне пра паліцэйскія суды было прынятае ўрадам 8 жніўня 1861 г.

[91] «В числе певунов находились и гимназисты. Могло ли гимназическое начальство, почти сплошь состоявшее из поляков (да и желало ли оно?) удержать учащихся от уличных песнопений, в которых принимали участие их матери, сестры, родственники и знакомые? А вожаки, сами почти все молодые люди, хорошо знали, как обрабатывать незрелую юность: они действовали на чувство, играли на чутких благородных струнах юношеского сердца... Безбоязненно пропев польскую революционную песню на площади, мальчуган уже считал себя героем, спасающим «ойчизну». Помню одного гимназиста 6-го класса: красивый, способный, ловкий, он готов был броситься, очертя голову, во всякую демонстрацию и, по своей пылкости, легко мог пропасть ни за что. Пригласив к себе его отца, я просил его поберечь горячего юношу от увлечений, которые могли быть для него гибельными; но отец оказался взбалмошнее сына. К удивлению моему, он выслушал о проделках своего сына с великим удовольствием и, радостно улыбаясь, воскликнул: «О-то зух-хлопец! Узнаю в нем свою кровь!» Впоследствии оба пропали в водовороте мятежа» — Кулин В. П. Из записок виленского старожила // Русская старина. 1893. № 7. С. 63–64.

[92] «8-го мая 1861 года в Виленском Римско-Католическом Кафедральном Соборе, по случаю храмового праздника Станислава, во время литургии, которую совершал Виленский епископ Красинский, в первый раз в г. Вильне открыто запели революционный гимн... В костеле было до 2-х тысяч народа. Более других обратили на себя внимание громким неистовым криком студенты университетов, Петербургского — Виктор Пашковский, Московского — граф Казимир Тышкевич и Александр Зельверович, бывший студент Дерптского университета Лимановский, называющийся доктором Дыбовский и житель Царства Польского, отставной прапорщик Станишевский. Все они были арестованы. Тогда толпа женщин, числом около 50, явилась к генерал-губернатору с ходатайством об освобождении арестованных, а на другой день пришла уже с настойчивостью повторить свою просьбу, и разошлась только из боязни и стыда быть облитою прибывшею пожарною командой. Некоторые из этих женщин, видимо руководившие толпою и более дерзкие в обращении и разговоре, были высланы из Вильны в свои имения, с запрещением возвращаться в Вильну» — Цылов Н. И. Сигизмунд Сераковский и его казнь, с предшествовавшими польскими манифестациями в Вильне в 1861–1863 годах. Вильна, 1867. С. 2–4.

[93] Гэтая мера неадназначна ўспрымалася і самімі паўстанцамі. Я. Гейштар піша ў мемуарах: «...адным з першых, і самых крыўдных нашых дзеянняў, быў зварот да ўсіх высокіх чыноўнікаў, а менавіта маршалкаў шляхты і міравых пасярэднікаў, каб яны адмовіліся ад сваіх абавязкаў. [...] З Варшавы прыйшоў да нас загад, каб мы правялі гэтую ўсеагульную адстаўку. Узгадніць адстаўку пасярэднікаў узаемна з паўстаннем шляхты Царства <Польскага>, якая не прымала ўдзел і пасіўна адносілася да народнай вайны, гэта зразумела, але ў нас! Пасярэднікі мелі ўжо большы ўплыў на народ, яны былі натуральнымі правадырамі гэтага народа, з іх пераважна выходзілі павятовыя і акруговыя кіраўнікі (паўстанцкіх арганізацый. — *А. Ф.*) і г. д. Як чыноўнікі, яны валодалі правам ездзіць па вёсках, акрамя маральнага ўплыву, выкарыстоўвалі таксама і той, што давала ўлада. Пасля адстаўкі яны звернуць на сябе ўвагу расійскіх уладаў і добраахвотна пазбавяцца свайго ўплыву на народ. Толькі аслепленыя, непрактычныя людзі, ці тыя, хто жадае

зла, маглі гэтага не разумець» — Pamiętniki Jakóba Giejsztora z lat 1857–1865. T. 2. S. 8.

[94] Старжынскі Віктар Вацлаў (Віктар Мацвеевіч) (1826–1882) — граф, палітычны дзеяч; выконваючы пасаду гродзенскага губернскага маршалка шляхты (1861–1863). Адзін з лідараў партыі «белых» у Літве. Якуб Гейштар лічыў менавіта яго адказным за ініцыяванне адставак міравых пасярэднікаў і маршалкаў шляхты: «Ён, заўжды жадаючы рэзанансу, калі пачалося паўстанне, і сам падаў у адстаўку, і іншых угаворваў; стараўся, каб пра гэта напісалі ў замежных газетах як пра здзейснены факт» — Pamiętniki Jakóba Giejsztora z lat 1857–1865. T. 2. S. 8. Пасля адстаўкі быў арыштаваны; асуджаны да смяротнага пакарання, аднак пасля запыту імператара Напалеона III быў зняволены на паўтара года ў Бабруйскую крэпасць, затым высланы ў Варонеж, дзе знаходзіўся да 1867 г. У савецкай гістарыяграфіі В. Старжынскі паўставаў выключна ў негатыўным святле, пад уплывам чаго, на наш погляд, ён выведзены як адмоўны персанаж і галоўны апанент Кастуся Каліноўскага ў паэме А. А. Куляшова «Хамуціус».

[95] Лапа Аляксандр (Аляксандр Дамінікавіч) (1802–1869) — памешчык Бабруйскага павета, валодаў вёскай Рудабелкай; грамадскі дзеяч. Маршалак шляхты Бабруйскага павета (1846–1858), маршалак шляхты Мінскай губерні (1859–1863). Брат дзекабрыста М. Д. Лапы. У паўстанні 1863–1864 гг. удзелу не браў, аднак быў высланы паводле асабістага ўказання М. М. Мураўёва ў Пермскую губерню.

[96] А. Д. Лапа быў арыштаваны не за ўдзел у паўстанні, а за «мінулы грэх»: «в ноябре 1862 г. Минское дворянское собрание намеревалось представить на высочайшее имя адрес, в котором говорилось о необходимости присоединить Минскую губернию к Царству Польскому. Планировалось представить такие же адреса во всех губерниях края. В. И. Назимов запретил подачу адреса, но минские дворяне внесли его текст в протокол заседания, который подписали 255 человек во главе с губернским предводителем дворянства А. Д. Лаппо. Генерал-губернатор вынужден был распустить дворянское собрание» — гл.: Комзолова А. А. Политика самодержавия в Северо-Западном крае в эпоху Великих реформ. М., 2005. С. 31. П. А. Чарэвін згадваў: «Прибывший по вызову главного начальника края в Вильну, Лаппа,

явившись во дворец, прямо прошел ко мне, как делали все те, которые имели что-либо особенное передать генерал-губернатору или желали знать, для чего они потребованы.

Познакомившись со мною, Лаппа очень ловко, не высказывая большого любопытства, спросил меня, не известна ли мне причина его вызова. Находя возможным открыть ему причину, я прямо сказал, что деятельность его при подаче в 1862 году всеподданнейшего адреса дворянством Минской губернии и противодействие, им оказанное ныне при подаче вновь адреса, причина, по которой М. Н. Муравьеву угодно с ним лично переговорить. Выслушав меня довольно хладнокровно, Лаппа, нисколько не отрицая все мною высказанное, стал весьма подробно развивать мне теорию, почему он так поступал, — теорию, которую можно изобразить одним словом — таковы его убеждения. Не знаю, хотел ли он меня убедить в правильности его польского взгляда, но дело в том, что закончил речь словами: “Таковы мои убеждения, от которых не откажусь ни перед кем, ни перед какими казематами”. Видимо было, что мой пан, видя что партия проиграна и что он пойман, хотел, по крайней мере, разыграть роль мученика, не отказывающегося от своих понятий ни перед чем. Я остановил пылкого Лаппу, сказав ему, что удивляюсь, к чему он мне это высказывает, что я его не могу никуда посадить, никуда не выслать, а еще менее разделяю его убеждения. [...] Обиженный ответом, Лаппа возразил, что он мне это сообщает с просьбою передать это генерал-губернатору. Сказано — сделано. Попросив г. Лаппу в приемный зал, я прошел к М. Н. Муравьеву и доложил ему содержание разговора моего с злосчастным предводителем. Бедному Лаппе приготовлялась неприятная неожиданность. Он, зная, что поступок его не повлечет его ни в Сибирь и нечто подобное, полагал, по крайней мере, разыграть роль страдальца, политического узника и в глазах своих собратьев еще выиграть; каково же было его удивление, когда М. Н. Муравьев, сказав ему несколько слов, велел ординарцу своему арестовать Лаппу, взять у него шпагу и отвести в полицию. Разом рушилась поэзия — сидеть в полиции с мошенниками, впрочем, не хуже его в действительности, не ожидал Лаппа. Высидев в яме 2 недели, он был отправлен на жительство в одну из внутренних губерний» — Черевин П. А. Воспоминания: 1863–1865 гг. Кострома, 1920. С. 35–36.

[97] Паводле словаў П. А. Валуева, В. Старжынскаму «крепко хочется стать литовским Велопольским» — Валуев П. А. Дневник министра внутренних дел. Т. 1. С. 168.

[98] П. А. Валуев запісаў у сваім дзённіку 1 верасня 1861 г.: «Получил замечательное письмо от и<сполняющего>д<олжность> гродненского губернского предводителя гр. Старжинского. Он с большой откровенностью указывает, с одной стороны, на ошибки и притеснительные действия местных властей, с другой на desiderata (пажаданні. — *А. Ф.*) Литвы. Он прямо говорит, что край желает «быть присоединенным к империи и к королевству, как ранее он был присоединен к одному королевству; иметь полную свободу совести, верховный суд и университет в Вильне, право преподавать, вести судебные дела на своем языке и иметь орган для выражения своих пожеланий» (словы В. Старжынскага прыведзены П. А. Валуевым на французскай мове, мы падаем іх у перакладзе. — *А. Ф.*). Он в заключение просил, чтобы я кого-нибудь послал в край или кого-нибудь оттуда вызвал. Я дал ему знать по телеграфу, чтобы он сам приехал, и получил вечером же извещение, что он выезжает в Петербург. Письмо его шло долго. Оно, вероятно, “перлюстрировано” на почте» — Валуев П. А. Дневник министра внутренних дел. Т. 1. С. 111.

[99] У 1868 г. П. А. Валуев зрабіў наступную заўвагу да запісаў пра В. Старжынскага ў сваім дзённіку: «Этот самый гр. Старжинский играл в событиях 1863 г. весьма предосудительную роль, был судим и приговорен к смерти (чего, впрочем, он не заслуживал и к чему не был бы приговорен, если бы в муравьевскую эпоху не преследовались особо все поляки, имевшие лично со мной отношения), потом сослан под надзор полиции в Воронеж (частью во внимание к заграничным ходатайствам, частью потому, что сам Муравьев едва бы решился конфирмовать смертный приговор... Но до этих событий он еще играл довольно видную роль в Москве в конце 1862 г. во время съезда предводителей из разных губерний по случаю пребывания в Москве государя и императрицы. Тогда им была представлена государю записка, копия с которой имеется в моих бумагах и которая по своему содержанию близко подходит к письму гр. Старжинского ко мне, бывшему поводом к его вызову в Петербург в сентябре 1861 года. Упоминаю об

этом здесь потому, что подача такой записки в 1862 году характеризует взгляды на польский и западный вопросы, долго сохранявшиеся в высшей правительственной сфере. Гр. Старжинский прежде служил на Кавказе и носил серебряный Георгиевский крест» — Валуев П. А. Дневник министра внутренних дел. Т. 1. С. 324.

[100] «...Когда Центральный комитет потребовал, чтобы все поляки оставили службу русскому правительству, граф Старжинский решился снять маску и сложить с себя звание дворянского предводителя, объявив при том дворянству циркулярным письмом, что он, при настоящем образе действий русского правительства в Литовском крае, признает невозможным честному поляку служить России, от которой нечего ожидать для воссоздания Польши. Письмо это было тогда же опубликовано в заграничных газетах.

По следам Старжинского подали в отставку и все занимавшие в Гродненской губернии должности мировых посредников и другие должностные лица. Дворянство же Могилевской губернии, следуя также примеру, поданному в прошлом году дворянством Подольской и Минской губернии, постановило 30 марта закрыть свое собрание, мотивировав в протоколе невозможностью обсуждать свободно нужды края, ввиду тех гонений, которые навлекли на себя со стороны правительства другие губернии, решившиеся ранее высказать жалобы на свое угнетенное положение и желание восстановления прежнего соединения Западного края с Польшей» — Милютин Д. А. Воспоминания. 1863–1864. М., 2003. С. 145.

[101] Імя В. Старжынскага было добра вядомае на Захадзе, і пакаранне яго смерцю ці высылка на працяглы тэрмін маглі зрабіць дрэннае ўражанне на замежжа. П. А. Валуеў 19 чэрвеня 1863 г. адзначаў у дзённіку: «Вечером приехал ко мне лорд Нэпир (англійскі амбасадар. — *А. Ф.*) с письмом от кн. Горчакова. Лорд Нэпир полемизирует, как говорит, с своим правительством насчет разглашаемых нашими клеветниками обвинений, он опровергает разные толки о жестокости наших начальников и солдат. На сей раз он поднялся по случаю телеграммы от гр. Росселя (міністра замежных спраў Вялікабрытаніі. — *А. Ф.*) о предстоящей будто бы в Вильно казни гр. Старжинского» — Валуев П. А. Дневник министра иностранных дел. Т. 1. С. 230. Пагроза

дадатковых ускладненняў у адносінах з Лонданам прымусіла падключыцца да вырашэння лёсу В. Старжынскага самога імператара — гл. запіс П. А. Валуева ад 22 чэрвеня 1863 г.: «Кн. Долгоруков (шэф жандармерыі. — *А. Ф.*), которого по особенностям моих отношений к ген. Муравьеву и его характера, я просил написать в Вильно о Старжинском и который тогда мне в этом отказал, сегодня получил высочайшее повеление телеграфировать о том к ген. Муравьеву. Я писал к нему еще третьего дня. Надеюсь, что то и другое не сделано слишком поздно» — Тамсама. С. 231.

[102] Верагодна, аўтар копіі або яе публікатар памыліліся: граф В. Старжынскі быў высланы ў Варонежскую губерню.

[103] Аўгустоўская губерня — адміністрацыйная адзінка Царства Польскага (1837–1866); адміністрацыйным цэнтрам з 1844 г. з'яўляўся г. Сувалкі.

[104] Берг Фёдар Фёдаравіч (1794–1874) — граф; расійскі военачальнік і дзяржаўны дзеяч. Генерал-фельдмаршал. Член Дзяржаўнага савета (1866), генерал-губернатар Фінляндыі (1854–1861); намеснік Царства Польскага і галоўнакамандуючы войскамі Варшаўскай ваеннай акругі (1863–1874). Ф. Ф. Берг быў апошнім намеснікам Царства Польскага; пасля яго смерці гэтая пасада была ліквідаваная.

[105] Дамейка Аляксандр (Аляксандр Фадзеевіч) (1804–1878) — грамадскі і палітычны дзеяч; камергер, тайны радца. Маршалак шляхты Віленскай губерні (1855–1878).

[106] Ордэн Святога Станіслава — малодшы з ордэнаў Расійскай імперыі, уключаны ў Капітул расійскіх ордэнаў пасля задушэння паўстання 1830–1831 гг. (з 1765 да 1831 г. існаваў як дзяржаўная ўзнагарода Рэчы Паспалітай, пасля — Царства Польскага; заснаваны каралём Станіславам Аўгустам Панятоўскім).

[107] Пад паняццем «Жонд» М. М. Мураўёў, як і большасць імперскіх ідэолагаў і публіцыстаў, разумеў адзіны цэнтр, які, паводле іх меркавання, кіраваў паўстаннем.

[108] Нельга сцвярджаць, што Мураўёў у дадзеным выпадку кажа няпраўду. На аснове архіўных росшукаў А. Ф. Смалянчук прыводзіць

прыклады распраў паўстанцаў над асобамі, лаяльнымі да імперскіх уладаў, у тым ліку і над жанчынамі — гл.: Смалянчук А. Ф. Радкевіч versus Каліноўскі // Смалянчук А. Ф. Беларуская гісторыя: знайсці чалавека. Мінск: выдавец І. П. Логвінаў, 2013. С. 32–72.

[109] «Следчыя камісіі і ваенна-палявыя суды імкнуліся вынесці як мага больш абвінаваўчых прысудаў. Калі некаторыя сумленныя рускія звярталі ўвагу Мураўёва на тое, што пацярпелі многія невінаватыя, ён звычайна адказваў: «Можа быць, што не ўсе ўдзельнічалі ў паўстанні, але напэўна ўсе яму спачувалі»» — гл.: Limanowski B. Powstanie narodowe 1863 i 1864 r. Lwów, 1990. S. 103.

[110] Тут М. М. Мураўёў хітруе: адрас быў ініцыяваны самім генерал-губернатарам, чаго не хаваў і губернскі маршалак шляхты Аляксандр Дамейка, які збіраў подпісы. Я. Гейштар згадваў: «На пачатку паўстання, калі на імгненне блеснула надзея, то і Дамейка ў даверальнай гутарцы не хаваў сваіх патрыятычных пачуццяў і ўкладаў грошы. Калі надзеі рассеяліся, Дамейка, кажучы, што трэба ратаваць тое, што яшчэ можна, на ідэю Мураўёва пачаў агітаваць за падпісанне адраса. [...] Што ў ліпені адрас будзе пададзены, не было сумневаў. У Дамейкі была пэўная колькасць прыхільнікаў, якіх хапала для пачатку, але размова ішла пра рэдакцыю адраса. Мураўёў дакладна жадаў ужо не паказу вернападданага стаўлення да Манарха, не асуджэння паўстання і братоў-ваяроў, але адназначнага адмаўлення ад мінулага, прызнання перад светам, што заўжды мы былі рускімі і імі хочам застацца. Нічога дзіўнага, што нават Дамейка некаторы час спрабаваў паўплываць на змяненне волі Мураўёва». І далей: «Дамейка адназначна сцвярджаў, што Мураўёў іншага, чым ён сам прапаноўвае, не прыме» — Pamiętniki Jakóba Giejsztora z lat 1857–1865. T. 2. S. 68–69, 71. Пра тое ж сведчыць і А. М. Масолаў: «Виленскому дворянству была подана мысль о представлении всеподданнейшего адреса, в коем оно сознало бы свои заблуждения и просило помилования; главною целью этого было уяснение партии, расположенной к правительству, так как всякий подписавший адрес, в случае открытия его виновности, становился вдвойне виновным, а всякий благомыслящий стремился бы, подписав свое имя, увеличить ту партию, из которой он уже не мог выступить. [...] Со стороны правительства в этом деле прини-

мал участие... подполковник Павлов, много лет живший в этом крае и имевший в среде местных помещиков друзей и родных. Генерал-губернатор зорко следил за этим делом...» — Мосолов А. Н. Виленские очерки (Муравьевское время): 1863–1865 гг. СПб., 1898. С. 40–41.

[111] «По случаю дня рождения Государыни снова все собрались в генерал-губернаторский дворец, но в этот день Виленское дворянство чрез депутацию из 15-ти человек, имевшую во главе губернского предводителя, просило начальника края представить Его Величеству письмо с выражением раскаяния и с заявлением верноподданнических чувств. Минута была торжественная. Генерал-губернатор принял адрес, подписанный уже 230 почетнейшими дворянами и согласился представить его Государю; но вместе с тем напомнил дворянству, какую важность должно иметь это заявление и что затем им, дворянам, следует действиями своими доказать, что они отрекаются от революционной партии и во всем намерены содействовать правительству для восстановления спокойствия в крае. Губернский предводитель заявил при этом, что подписка на особых листах продолжается по уездам и идет успешно.

Немедленно была отправлена Государю в Царское Село телеграмма с извещением об этом событии и о содержании адреса. [...] На телеграмму был в тот же день получен благосклонный ответ Государя. Затем несколько времени спустя Его Величество удостоил генерала Муравьева милостивым по этому случаю рескриптом...» — Мосолов А. Н. Виленские очерки (Муравьевское время): 1863–1865 гг. СПб., 1898. С. 44–46.

[112] «Аддзел аднагалосна прыняў зварот да Дамейкі, у якім апошні быў прыгавораны да смерці, калі ён пажадае падпісаць гэты адрас». «Яшчэ перад гэтым узнікла думка контр-адраса, з якім за мяжу мусілі выехаць па некалькі вядомых суайчыннікаў з кожнай губерні, моцна скампраметаваных (у вачах улады. — *А. Ф.*), каб там выказаць пратэст і распавесці, якім чынам гэты ўрадавы адрас быў сабраны. Пастанавілі мы выдаць дэкрэт, які асуджаў на бясслаўе тых некалькіх людзей, якія першымі падпісалі гэты адрас разам з Дамейкам» — Pamiętniki Jakóba Giejsztora z lat 1857–1865. T. 2. S. 74, 77.

[113] «Паводле жадання варшаўскага кіраўніцтва, супраць нашай волі, заснавалі паўстанцкую жандармерыю, і ўжо яе абавязкам было

выканаць гэты дэкрэт. Аднак, як я і прадбачыў, гэтыя людзі, большай часткай бесхарактарныя, як і без маральных каштоўнасцяў, за атрыманыя грошы маглі забіць каго-небудзь разбойніцкім спосабам, але самі на верную пагібель за грошы ісці не хацелі» — Pamiętniki Jakóba Giejsztora z lat 1857–1865. T. 2. S. 74–75.

114 Бянькоўскі Ян (1837–1863) — фельчар; паліцэйскі і кінжальшчык у варшаўскай паўстанцкай арганізацыі; за замах на А. Дамейку быў пакараны смерцю. Як сцвярджае ва ўспамінах Я. Гейштар, Я. Бянькоўскі мусіў атрымаць за смерць А. Дамейкі 500 рублёў — гл.: Pamiętniki Jakóba Giejsztora z lat 1857–1865. T. 2. S. 77.

115 Губернскі пракурор У. А. Зыбін узгадваў: «Доктора удостоверили, что рана, нанесенная Домейко, — не смертельная, но мучительная и требует внимательного лечения и ухода» — гл.: В. З. <Зыбин В. А.> М. Н. Муравьев в Вильне (Из рассказов губернского прокурора) // Русская старина. 1898. № 11. С. 292. Падрабязную карціну замаху на А. Ф. Дамейку ўзнаўляе А. М. Масолаў: «В 8-м часу утра неизвестный человек явился к Домейко под предлогом подачи просьбы. Слуга просил его обождать, пока доложит. Губернский предводитель только что встал и еще в халате вышел в приемную, куда велел впустить и пришедшего. Слуга тем временем остался в большой прихожей, над лестницей, где растворял окна. Услыша внезапный крик в соседней комнате, он бросается туда и в дверях сталкивается с убийцей, у которого в руках окровавленный кинжал. Он стал было сопротивляться; но при виде кинжала ужас им овладел и он, весь израненный в грудь и бок, упал замертво. Убийца скрылся.

Между тем Домейко не только был жив, но был гораздо слабее изранен, чем его слуга. Убийца хотел поразить его в самое сердце, но он всякий раз, как тот наносил ему удар, защищался локтем левой руки, согнув ее в виде щита. На руке его было семь больших ран, но толстый фланелевый рукав предохранил Домейко; приход же слуги заставил убийцу броситься назад, чтоб проложить себе путь отступления. Вместо прошения Домейко было подано два листка. Листки эти, с запекшеюся на них кровью, были отосланы в канцелярию и с них делался перевод. На первом было напечатано по-польски постановление верховного народового трибунала, которым все лица подпи-

савшие адрес Государю, изъемлются из-под покровительства закона и предаются военно-полевому суду, а Александр Домейко, как один из главных виновников этого дела, должен быть немедленно казнен смертью, как изменник отечеству. К этому документу приложена была синяя печать, с изображением соединенных гербов Литвы и Польши, с надписью вокруг: pieczęć rządunarodowégo. Oddział Litwy. Другой листок заключал приказ исполнительного отдела Литвы за подписью начальника miasta Вильны (с неразборчивой подписью), в коем предписывалось привести в исполнение приговор над гражданином Домейко» — гл.: Мосолов А. Н. Виленские очерки (Муравьевское время): 1863–1865 гг. СПб., 1898. С. 47–49.

[116] М. М. Мураўёў па-рознаму вымаўляе (ці аўтар копіі па-рознаму запісвае) яго імя — вар'іруюцца «Мірашнікоў» і «Мірашэнкаў». Насамрэч Мірашнікоў Аляксандр — мяшчанін г. Вільні, паводле словаў А. М. Масолава, «кутила и сорви-голова, он уже был однажды арестован по какому-то подозрению, а в то же самое время, когда случилось покушение на жизнь Домейко, где-то проговорился, хвастаясь. При допросах он сознался, что их, кинжальщиков, более десяти человек; но что из них он знает лишь немногих; из названных им 4-х лиц трое оказались бежавшими и никогда не были схвачены» — Мосолов А. Н. Виленские очерки (Муравьевское время): 1863–1865 гг. СПб., 1898. С. 51. Быў прыгавораны да пазбаўлення правоў грамадзянства, канфіскацыі маёмасці і высылкі на катаргу.

[117] «Когда же ему <М. М. Мураўёву> сказали, что они оба брюнеты, а покусившийся на жизнь Домейко был белокур, М. Н. Муравьев приказал отвести их в баню и мыть в особенности волосы. — После трех бань тот, который конфузился, оказался белокурым, и когда его показали Домейко, он удостоверил, что это именно тот, который нанес ему рану» — В. З. <Зыбин В. А.> М. Н. Муравьев в Вильне (Из рассказов губернского прокурора) // Русская старина. 1898. № 11. С. 293.

[118] Чаплінскі Эдвард (?—1863) — шляхціц Панявежскага павета; вольны слухач Маскоўскага ўніверсітэта. Удзельнік Віленскай гарадской паўстанцкай арганізацыі, адзін з арганізатараў замаху на А. Дамейку. Пакараны смерцю.

[119] Далеўскі Цітус (1841–1863) — студэнт факультэта права Маскоўскага ўніверсітэта, актыўны ўдзельнік польскіх нацыянальных моладзевых гурткоў у Маскве; кіраўнік студэнцкага гуртка «Агул». Блізкі сябар К. Каліноўскага. Пакараны смерцю. Яго сястра, А. Серакоўская, прыгадвала: «Напярэдадні новага году, 30 снежня 1863 / 11 студзеня 1864 года вывелі Цітуса на расстрэл з камеры, з якой у 1850 годзе вывезлі нашага старэйшага брата Францішка ў Сібір. Цітус, выходзячы, выцер твар хусцінкай (якая цяпер у мяне) і папрасіў плашч і галёшы, кажучы: «Калі б дрыжаў ад холаду, сказалі б пра мяне, як пра Зыгмунта Серакоўскага, якога адправілі на смерць пасля цяжкай аперацыі, зусім напярэдадні, што ногі мае падкошваюцца перад смерцю». Тыя, хто ў той момант бачылі яго, кажуць, што ішоў ён са спакойнай усмешкай на вуснах і нібыта вырас, таму што, ідучы за ім, бачылі яны яго галаву, якая ўзвышалася над натоўпам» — Sierakowska z Dalewskich A. Wspomnienia. Warszawa, 2010. S. 93.

[120] Гажыч Вітольд (1843–1864) — шляхціц Брэсцкага павета; студэнт Пецярбургскага ўніверсітэта. У 1861 г. паехаў у Парыж, дзе наведваў лекцыі ў Сарбоне як вольны слухач. У 1863 г. вярнуўся на радзіму, пачаў дзейнічаць як адзін з кіраўнікоў паўстанцкага камітэта ў Лідскім павеце. Быў схоплены, асуджаны да пазбаўлення грамадзянскіх правоў, канфіскацыі маёмасці і дваццацігадовай катаргі. Памёр у маскоўскім шпіталі праз тыфус.

[121] Дармалоўскі Мечыслаў (?—1863) — паўстанец. Паводле словаў А. М. Масолава, «уроженец Познани, молодой человек чрезвычайно изящной наружности, оказавшийся, по общим показаниям, революционным комиссаром Виленской губернии, иначе — губернатором» — Мосолов А. Н. Виленские очерки (Муравьевское время): 1863–1865 гг. СПб., 1898. С. 120. Пакараны смерцю.

[122] Здановіч Ігнацы (1840–1863) — сын прафесара віленскага шляхецкага інстытута А. Здановіча, кандыдат права Пецярбургскага ўніверсітэта. Паводле сцвярджэння А. М. Масолава, «был распорядителем всей хозяйственной и денежной части мятежа. При обыске в доме Здановичей, где-то на заднем дворе, за обыкновенными складами в роде сенника, открыта комната, выходившая единственным окном на пустынный берег Вилейки. Тут были захвачены разные бланки, пе-

чати, акты, революционные приказы и проч.» — Мосолов А. Н. Виленские очерки (Муравьевское время): 1863–1865 гг. СПб., 1898. С. 119. Паводле словаў Я. Гейштара, які прызначыў І. Здановіча начальнікам г. Вільні, «Здановіч вызначаўся годнасцю, але і жорсткасцю» — Pamiętniki Jakóba Giejsztora z lat 1857–1865. T. 2. S. 143. Пакараны смерцю. Яго бацька, Аляксандр Здановіч, стаў аўтарам дапаможніка па гісторыі Польшчы, па якім таемна вучылася новае пакаленне віленцаў пасля разгрому паўстання 1863–1864 гг.

[123] Малахоўскі Уладыслаў (1827–1900) — шляхціц Кобрынскага павета, чыгуначны інжынер. Паводле словаў Я. Гейштара, «чалавек здольны... поўны ініцыятывы, энергіі і самааддачы. Сам адважны да неасцярожнасці, патрабаваў ад падначаленых паслухмянасці і энергіі, але, на жаль, часта верыў словам маладых і неправераных вар'ятаў» — Pamiętniki Jakóba Giejsztora z lat 1857–1865. T. 2. S. 47. Быў начальнікам паўстанцкага камітэта г. Вільні, пасля замаху на А. Дамейку эміграваў, жыў у Лондане, памёр у Францыі. Бацька яго, Юльян Малахоўскі, пасля эміграцыі сына быў арыштаваны і памёр у турме.

[124] Дзюларан (Дзю Ларан) Нестар (?—1868) — камісар Цэнтральнага нацыянальнага камітэта і Нацыянальнага ўрада ў Літве і Беларусі. «Гэта была дзіўная асоба. Ні ў архіўных дакументах, ні ва ўспамінах сучаснікаў не засталося звестак (ды, напэўна, ніхто толкам і не ведаў), адкуль ён з'явіўся і куды пасля знік. Вядома толькі, што ён служыў ва ўпраўленні чыгункі ў Вільні і... лічыў сябе поўным гаспадаром у віленскай рэвалюцыйнай арганізацыі» — гл.: Кісялёў Г. В. Сейбіты вечнага // Кісялёў Г. В. Сейбіты вечнага: артыкулы пра беларускіх пісьменнікаў і дзеячаў рэвалюцыйнага руху 1863 года; Скарынаўская сімволіка: вытокі, традыцыі, інтэрпрэтацыі. Мінск: Медысонт, 2009. С. 91. «Дзюларан атрымаў ад варшаўскага ўрада загад разам са мной стварацць "Аддзел кіравання правінцыямі Літвы", і пры тым інструкцыю, у якой даручалася яму згадзіцца на ўсе нашыя ўмовы. [...] Канстанцін Каліноўскі і Зігмунд Чаховіч... злаваліся на Дзюларана. Каліноўскі напісаў нават пратэст» — Pamiętniki Jakóba Giejsztora z lat 1857–1865. T. 1. S. 232–233.

[125] Каліноўскі Канстанцін Вікенцій (Кастусь) (1838–1864) — выпускнік юрыдычнага факультэта Пецярбургскага ўніверсітэта. Актыўны

ўдзельнік паўстання 1863–1864 гг., апошні кіраўнік паўстанцкага ўрада Літвы і Беларусі. Прыхільнік аўтаноміі Літвы і Беларусі ў Царстве Польскім. Прыхільнік радыкальнага варыянта сялянскай рэформы, аднак імкнуўся да захавання сацыяльнага міру; паводле сведчання А. Серакоўскай, якая мала ведала яго, «быў ён сябрам сялян, можа быць, нават «халопаманам», але ніколі не быў ворагам ні аднаго слою свайго народа» — Sierakowska z Dalewskich A. Wspomnienia. Warszawa, 2010. S. 50. Выдаваў на беларускай мове газету «Мужыцкая праўда». Пакараны смерцю. Нацыянальны герой Беларусі.

[126] Валанчэўскі (Валанчус) Мацей Казімір (1801–1875) — грамадскі і каталіцкі рэлігійны дзеяч; пісьменнік. «Человек замечательно умный» — Черевин П. А. Воспоминания: 1863–1865 гг. Кострома, 1920. С. 26. Стваральнік літоўскага Таварыства цвярозасці (1858). Біскуп Жамойці (з 1850 г.); першы літоўскі біскуп родам з сялян. Уплыў М. К. Валанчэўскага на народ быў настолькі моцны, што ў 1860 г. заробак, выплачаны акцызным чыноўнікам Ковенскай губерні, дзе Таварыства цвярозасці мела найбольш трывалую пазіцыю, перавысіў даходы ад прададзенага алкаголю; у 1859 г. у Ковенскай губерні зачынілася 87 бровараў.

[127] Мацкевіч Антоні (Мацкявічус Антанас) (1827 або 1828–1863) — ксёндз, выпускнік Віленскай гімназіі; вучыўся ў Кіеўскім універсітэце і ў Варнянскай духоўнай семінарыі. Падчас паўстання стварыў вялікі атрад, які пад яго кіраўніцтвам перамог у больш як 20 бітвах і сутычках з рэгулярнымі імперскімі войскамі і жандарамі. «Молодой ксендз фанатик Мацкевич, с необычайною энергией, обладавший замечательным уменьем вести партизанскую войну, до ноября 1863 г. держал в каком-то напряженном состоянии всю Жмудь» — Мосолов А. Н. Виленские очерки (Муравьевское время): 1863–1865 гг. СПб., 1898. С. 169. Належаў да партыі «чырвоных». Пакараны смерцю.

[128] «...Теснимый со всех сторон, лишенный продовольствия и крова, Мацкевич с кассиром своим Родовичем, адъютантом Дартузи (Фларыянам. — *А. Ф.*) и несколькими сообщниками пробирался к Неману, чтобы, переплыв его, удалиться на прусскую землю. [...] Ксендз Мацкевич, изнуренный, приблизился к Неману и в лесной чаще, над крутизною берега, лег под деревом. В таком положении застал его от-

ряд штабс-капитана Озерского, производивший в лесу обыск. [...] Мацкевича доставили к вечеру в Ковно. В Вильну дано было знать об этом по телеграфу и оттуда последовал приказ судить его в 48 часов. Мацкевич из тюрьмы писал письма военному начальнику, губернатору и начальнику края; в них он излагал свои взгляды и умолял о помиловании, обещая быть человеком полезным. Найденные при нем часы, деньги, пистолет и иные ценные вещи были разделены между солдатами отряда, его схватившего. Мацкевич бодро шел на казнь...» — Мосолов А. Н. Виленские очерки (Муравьевское время): 1863–1865 гг. СПб., 1898. С. 110–111. Крыху іншую версію паланення А. Мацкевіча падае А. Серакоўская: «Увесну, страціўшы ўсе надзеі, ксёндз Мацкевіч у таварыстве свайго ад'ютанта спыніўся на беразе непадалёк ад вёскі Вількія з намерам перайсці мяжу. Каб адпачыць перад дарогай, прыйшоў ён у асобна размешчаную хату. Да гэтага часу ходзяць там чуткі, што гаспадар паведаміў стражнікам і выдаў ім у рукі ксяндза Мацкевіча, пасля чаго сам знік без вестак. Іншыя кажуць, што патруль, які кружыў на мяжы Літвы і Польшчы, выпадкова натрапіў на яго ў хаце і пазнаў» — Sierakowska z Dalewskich A. Wspomnienia. Warszawa, 2010. S. 75.

[129] Матэрыялы, датычныя падзей паўстання на Гарадзеншчыне, апублікаваныя ў зборніку: Повстанческое движение в Гродненской губернии. 1863–1864 гг. / ред. Д. В. Карев. Брест, 2006. Гл. таксама: Aramowicz I. Pamietnik o ruchu partyzanckim w województwie grodzieńskim w 1863 i 1864 r. <Б. м.>, 1865.

[130] Мінскім губернатарам з 1861 да 1864 г. быў сапраўдны стацкі радца Андрэй Львовіч Бажэўнікаў.

[131] Ігумен — цяпер раённы цэнтр Чэрвень Мінскай вобласці Рэспублікі Беларусь.

[132] Лосеў Аляксандр Міхайлавіч (1819–1885) — палкоўнік, пасля генерал-маёр жандармерыі, начальнік віцебскіх (1856–1861), потым віленскіх (1861–1884) жандараў, кіраўнік Віленскай следчай камісіі. «То был плотный мужчина, лет около пятидесяти, с седыми редкими волосами, одутловатым лицом, серыми неприятными глазами» — Пантелеев Л. Ф. Воспоминания. М., 1958. С. 360. «Жандар Лосеў, напэўна, у першы і апошні раз у жыцці сказаў праўду, калі яго нехта з вязняў абвінаваціў у зняважлівых фальсіфікацыях (падчас

следства. — *А. Ф.*): «Няўжо вы, спадарове палякі, думаеце пра нас, што мы хочам у вачах вашай грамады ўзвысіцца і стаць высакароднымі? Не, спадарства, нашае жаданне не толькі ў тым, каб атрымаць ад вас прызнанне, але і яшчэ выпусціць вас з рук нашых такімі чорнымі, каб вас маці родныя не пазналі»» — Sierakowska z Dalewskich A. Wspomnienia. Warszawa, 2010. S. 190.

[133] «Первый день Калиновский лишь кусал себе губы, неохотно даже отвечал на вопросы, но к вечеру не выдержал и объявил свое настоящее имя. Несмотря на все усилия членов комиссии, им не удалось исторгнуть от Калиновского подробного показания о личностях, составляющих революционную организацию края. Он однако откровенно сознался, что был распорядителем жонда во всем крае, и, как видно из показаний других лиц, он умел поддержать падающий революционный дух польского населения. Помещики его страшились, он свободно разъезжал между ними, воодушевлял нерешительных и запугивал слабых. Калиновский был лет 26, крепкого сложения и с лицом жестким и выразительным; короткие русые волосы были зачесаны назад; таким я видел его в тюрьме за несколько дней до казни. Ему дали перо и бумагу и позволили свободно излагать свои мысли. Он написал отличным русским языком довольно любопытное рассуждение об отношениях русской власти к польскому населению Западного края, в котором, между прочим, высказывал мысль о непрочности настоящих правительственных действий и полное презрение к русским чиновникам, прибывшим в край. Калиновский сознавал, что с его арестованием мятеж неминуемо угаснет; но что правительство не сумеет воспользоваться приобретенными выгодами.

Казнь Калиновского совершилась уже в марте или в конце февраля 1864 г. и была едва ли не последнею в Вильне.

Было ясное холодное утро; Калиновский шел на казнь смело; придя на площадь, он встал прямо лицом к виселице и лишь по временам кидал взоры в далекую толпу. Когда ему читали конфирмацию, он стал было делать замечания; так, наприм<ер>, когда назвали его имя: дворянин Викентий Калиновский, он воскликнул: “У нас нет дворян, все равны!” Полициймейстер покачал ему головой и просил замолчать» — Мосолов А. Н. Виленские очерки (Муравьевское время): 1863–1865 гг. СПб., 1898. С. 125–127.

[134] Звіждоўскі Людвік (1829–1864) — адзін з лідараў партыі «чырвоных» і актыўных кіраўнікоў паўстання 1863–1864 гг. на тэрыторыі Літвы і Беларусі. «Звіждоўскі быў невысокі, з чорнымі валасамі і вачамі» — Sierakowska z Dalewskich A. Wspomnienia. Warszawa, 2010. S. 177. Служыў у расійскай арміі, удзельнічаў у Крымскай вайне. У 1857–1859 гг. слухач Акадэміі Генеральнага штаба ў Пецярбургу. Служыў ад'ютантам віленскага генерал-губернатара У. І. Назімава. «Находясь в Вильне, он умел долгое время устраняться от всяких подозрений в тесной его связи с тайным революционным комитетом. Перемещение в новое место службы (у Грэнадзёрскі корпус, у Маскву. — *А. Ф.*) не прервало этой связи, а, напротив того, способствовало ему принять потом деятельное участие в исполнении обширного плана действий, задуманного руководителями мятежа» — Милютин Д. А. Воспоминания. 1863–1864. М., 2003. С. 145–146. Быў начальнікам магілёўскага паўстанцкага атрада. У 1863 г. змог збегчы за мяжу, аднак вярнуўся, трапіў у палон да расійскіх войскаў. Пакараны смерцю. Гл.: Сильванович С. А. Действия Людвика Звеждовского на Могилёвщине в 1863 г. // Материалы конференции «Проблемы и перспективы становления гражданского общества» 20–21 мая 2010 г.: в 2 ч. Ч. 2. Могилев, 2010. С. 83–87.

[135] Гл.: Цытовіч С. Г. 1863 год у Горы-Горках быўш. Магілёўскай губ. Падзеі паўстання. Менск, 1929.

[136] Любамірскі Стэфан (1819 — после 1879) — князь; камер-юнкер; грамадскі дзеяч. Маршалак шляхты Магілёўскай губерні (звольнены ў 1863 г.). Быў абвінавачаны ў неданясенні аб падрыхтоўцы да паўстання, пасля дадаткова — у падпісанні падчас сеймаў 1862 г. звароту магілёўскай шляхты пра далучэнне Літвы і Беларусі да Царства Польскага. Быў высланы ў Пермскую губерню пад нагляд паліцыі. У 1873 г. атрымаў дазвол вярнуцца на радзіму.

[137] Трэці Літоўскі статут быў выдадзены ў 1588 г. і дзейнічаў да поўнай яго забароны ў 1840 г.

[138] Пра паўстанне на тэрыторыі Віцебскай губерні гл., у прыватнасці: Глазырын С. Я. Спроба ўзброенага выступлення ў Віцебскай губерні падчас паўстання 1863 года // Ученые записки УО «ВГУ им. П. М. Машерова». 2011. Т. 11. С. 21–27.

[139] Полацкі езуіцкі калегіум быў заснаваны ў 1580 г. паводле загаду караля Стафана Баторыя. Першым яго рэктарам быў выбітны тэолаг, публіцыст і дзяржаўны дзеяч Рэчы Паспалітай Пятро Скарга. У 1812 г. паводле ўказа імператара Аляксандра І быў рэарганізаваны ў Полацкую езуіцкую акадэмію. Акадэмія існавала да 1820 г., калі дзейнасць езуіцкага ордэна на тэрыторыі Расійскай імперыі была забароненая, а прыналежныя яму будынкі перададзеныя ордэну піяраў, які супернічаў з езуітамі. Нароўні з Крамянецкім (Валынскім) ліцэем і Віленскім універсітэтам Полацкая акадэмія лічылася адным з найбуйнейшым адукацыйных цэнтраў на землях былога Вялікага Княства Літоўскага.

[140] Мураўёў асаблівую ўвагу надаваў жаночаму ўплыву. У лісце да шэфа жандараў кн. В. А. Далгарукава ад 18 лютага 1864 г. ён адзначаў: «Трэба тут, на жаль, прызнацца, што і невялікая колькасць рускіх, што тут жывуць, лічыла Заходнія губерні польскімі і многія з іх сталі блізкімі палякам, ажаніліся з полькамі і спачувалі нават бунту» — цыт. паводле: Rok 1863 na Mińszczyźnie. 1863 год на Меншчыне. Mińsk, 1927. S. 149.

[141] Хаванскі Мікалай Мікалаевіч (1777–1837) — князь; расійскі военачальнік і дзяржаўны дзеяч. Генерал ад інфантэрыі (1828). Беларускі генерал-губернатар (1823–1836).

[142] Дзякаў Пётр Мікалаевіч (1788–1860) — расійскі военачальнік і дзяржаўны дзеяч. Генерал-ад’ютант (1831); генерал ад кавалерыі (1846). Беларускі генерал-губернатар (1836–1846).

[143] Галіцын Андрэй Міхайлавіч (1792–1863) — князь; расійскі военачальнік і дзяржаўны дзеяч. Генерал ад інфантэрыі (1829). Удзельнічаў у задушэнні паўстання 1830–1831 гг. Тульскі (1840–1846), пасля беларускі генерал-губернатар (1846–1853). Сенатар (1854).

[144] Далгарукаў Мікалай Андрэевіч (1792 або 1794–1847) — князь; расійскі военачальнік і дзяржаўны дзеяч. Генерал-ад’ютант (1830); генерал ад кавалерыі. Віленскі ваенны губернатар з кіраваннем і грамадзянскай часткаю, выконваючы пасаду гродзенскага і беластоцкага губернатара (1832). Віленскі ваенны губернатар, гродзенскі і беластоцкі губернатар (1833). Мінскі, беластоцкі і гродзенскі генерал-губернатар з захаваннем пасады віленскага ваеннага губернатара (1834–1840). Маларасійскі генерал-губернатар (1840–1847).

[145] Бібікаў Ілля Гаўрылавіч (1794–1867) — расійскі дзяржаўны дзеяч. Генерал-ад'ютант (1849–1852; 1860–1867); генерал ад артылерыі (1852). Начальнік Паўночна-Заходняга краю і віленскі генерал-губернатар (1850–1855); адначасова выконваў абавязкі апекуна Віленскай навучальнай акругі і старшыні Віленскага цэнзурнага камітэта.

[146] Агрызка Юзафат (1827–1890) — журналіст, выдавец, юрыст. У 1863 г. — член Нацыянальнага ўрада; у 1864 г. быў арыштаваны і высланы ў Сібір. Гл. пра яго: Пшацлаўскі В. Иосафат Огрызко и его польская газета «Слово» (Замечания на статью г. Берга в «Русском архиве» 1870 года) // Пшацлаўскі В. Калейдаскоп успамінаў. У 2 т. Т. 2. Мінск, 2012. С. 246–264.

[147] У паўстанні ўдзельнічалі некалькі асоб з такім прозвішчам, аднак, хутчэй за ўсё, М. М. Мураўёў мае на ўвазе Пятра Эмануіла Юндзіла — падпаручніка расійскай арміі, які жыў у Пецярбургу і ўваходзіў у гурток З. Серакоўскага. У 1865 г. генерал-губернатарам К. П. фон Каўфманам быў завочна прысуджаны да расстрэлу, пазбаўлення правоў маёмасці, чыноў, канфіскацыі маёмасці.

[148] Бакланаў Якаў Пятровіч (1809–1873) — расійскі военачальнік; генерал-лейтэнант (1860). Вылучыўся падчас вайны на Каўказе. У 1861–1863 гг. акруговы генерал 2-й вобласці Войска Данскога. Пасля таго як у распараджэнне віленскага генерал-губернатара былі перададзеныя данскія войскі, камандаваў імі. Сам Я. П. Бакланаў прыгадваў: «Для принятия и управления ею <Аўгустоўскай губерняй> он командировал меня, с правом судить участвовавших в мятеже, приговаривать виновных к смертной казни, к ссылке в каторжные работы и в Сибирь на поселение, и не ожидая его конфирмаций, приводить приговоры в исполнение» — Бакланов Я. П. Моя боевая жизнь (Записки Войска Донского генерал-лейтенанта Якова Петровича Бакланова, написанные собственною его рукою) // Русская Старина. 1871. Т. 7. № 7. С. 154. За стараннасць, праяўленую ў барацьбе з паўстанцамі, быў узнагароджаны ордэнам Святога Уладзіміра 2-й ступені.

[149] Барацінскі Анатоль Іванавіч (1821–1861) — князь; расійскі военачальнік; генерал-лейтэнант (1867); генерал-ад'ютант (1866). Брат генерал-фельдмаршала і намесніка на Каўказе князя Аляксандра

Барацінскага. Камандзір лейб-гвардыі Праабражэнскага палка (1859–1867). Вылучаўся жорсткасцю пры задушэнні паўстання. Я. П. Бакланаў прыгадваў: «Князь Барятинский, между Серию и Сейнами, настиг значительную партию (паўстанцаў. — *А. Ф.*): из нее никто не спасся, а легли костьми» — гл.: Бакланов Я. П. Моя боевая жизнь (Записки Войска Донского генерал-лейтенанта Якова Петровича Бакланова, написанные собственною его рукою) // Русская Старина. 1871. Т. 7. № 7. С. 156.

150 «Еще перед отъездом своим из Санкт-Петербурга М. Н. Муравьев обратился с просьбой к мин<истру> внутр<енних> дел командировать в Вильну возможно большее число чиновников русского происхождения для занятия должностей в Запад<ном> крае. Вместе с тем он обратился циркулярно к губернаторам с тою же просьбою. Но каких же деятелей прислали? За исключением некоторых добросовестных губернаторов... министерство и г<оспода> губернаторы, кажется, нарочно командировали худших своих чиновников» — Черевин П. А. Воспоминания: 1863–1865 гг. Кострома, 1920. С. 27. Пра тое, наколькі непадрыхтаваныя былі прысланыя ў Літву і Беларусь чыноўнікі і наколькі абыякавыя яны былі на самай справе да становішча ніжэйшых слаёў насельніцтва, сведчаць успаміны Ф. В. Чапліцкага: «Здарылася так, што ў маю прысутнасць прыйшлі ў канцылярыю “станавога прystава” некалькі мяшчан, адзін за адным. Кожны з іх, уваходзячы, вітаў прystава словамі: “Niech będzie pochwalony Jezus Chrystus!”

— Што гэта? — ускрыкнуў прystаў, пагражаючы мяшчанам: “Pochwalony! Pochwalony!” Я вам дам pochwalony! “Слава Богу!”, вось! — гэта разумею! Не “pochwalony”, а “Слава Богу!” трэба гаварыць!” — вучыў прystаў, і бедныя мяшчане вымушаныя былі заплаціць у маю прысутнасць па пяць рублёў срэбрам штрафу. — Небаракі не мелі пры сабе столькі грошай, я пазычыў ім сорак пяць рублёў срэбрам» — цыт. паводле: <Czaplicki F. W.> Moskiewskie na Litwie rządy 1863–1869. Kraków, 1869. S. 131.

151 «Генерал Муравьев был убежден в том, что и его энергия, его сила воли останутся бесплодными, пока исполнителями будут польские чиновники. Поэтому одной из существеннейших мер считал он

удаление от дел поляков и замещение их русскими... для замещения же всей массы прежних чиновников польской национальности русскими, генерал Муравьев вызвал чиновников из Петербурга и других мест, предлагая им разные льготы и служебные преимущества. Требовалось очень большое число лиц и не легко было заманить столько хороших людей в тот край при тяжелых условиях тамошней службы в те времена... много шло и таких, которые оставались без места, не знали, куда пристроиться; а наконец, могли быть и желавшие, как говорится, в мутной воде рыбу ловить. Избежать совершенно подобной нежелательной примеси к большой массе привлеченных в Северо-Западный край русских чиновников было почти невозможно» — Милютин Д. А. Воспоминания. 1863–1864. М., 2003. С. 240–241.

[152] Пазіцыя М. М. Мураўёва, які вельмі негатыўна ацэньваў саму сялянскую рэформу ў бытнасць сваю міністрам дзяржаўных маёмасцяў, была сур'ёзна скарэктаваная пасля аналізу ім ходу паўстання: ён наблізіўся ў падыходах да групы М. А. Мілюціна і стаў фактычна ініцыятарам паскоранага правядзення рэформы ў даручаных яму губернях. Апалагетычны, аднак, з пункту гледжання прыведзеных фактаў, цалкам карэктны агляд дзейнасці Мураўёва ў гэтым кірунку гл.: Миловидов А. И. Освобождение крестьян Северо-Западного края и поземельное устройство их при графе М. Н. Муравьеве. Вильна, 1902.

[153] М. М. Мураўёў лічыў, што «все землевладельцы более или менее участвовали в восстании и потому принимаемая мера по порубке лесов послужит им наказанием, а на счет недостатка рук для вырубки лесов присовокупил:

— Если некем будет вырубить леса, я их сожгу» — гл.: <Дельвиг А. И.> Полвека русской жизни. Воспоминания А. И. Дельвига. 1820–1870: в 2 т. Т. 2. М.–Л., 1930. С. 206.

[154] Князь Аляксандр Яраслававіч, празваны пасля перамогі 15 ліпеня 1240 г/ Неўскім (1221–1263), лічыўся пасля кананізацыі нябесным заступнікам Санкт-Пецярбурга. Акрамя таго, на дзень святога Аляксандра Неўскага прыпадалі імяніны Аляксандра II. Таму будаўніцтва храмаў у гонар Аляксандра Неўскага аўтаматычна было выяўленнем лаяльнасці да імператара. Найвядомейшым з храмаў,

пабудаваных на тэрыторыі, падначаленай Мураўёву ў гэты перыяд, была капліца ў Вільні, закладзеная ў прысутнасці самога генерал-губернатара 22 кастрычніка 1863 г. Капліца ўзводзілася паводле праекта прафесара Імператарскай Акадэміі мастацтваў А. І. Разанава на добраахвотныя ахвяраванні гарадскіх таварystваў Паўночна-Заходняга краю. Асвячоная была ўжо пры новым генерал-губернатары К. П. Кауфмане 30 жніўня 1865 г.

[155] М. Дз. Далбілаў прыводзіць прыклад рэакцыі Мураўёва на паведамленне пра пераход з каталіцтва ў праваслаўе 237 сялян вёскі Куродзічы Рэчыцкага павета: «Муравьев немедленно распорядился о переделке Куродичского костела в православную церковь. Удовольствие, с которым он встретил известие об успехе «воссоединительного» дела в Куродичах..., отразилось в благодарственном письме к нему от крестьян, составленном, несомненно, под наблюдением местных властей, с учетом ожиданий Муравьева, и изображающем переход из католицизма в православие вопросом не столько религиозной совести, сколько исторической памяти» — Долбилов М. Д. Русский край, чужая вера: Этноконфессиональная политика империи в Литве и Белоруссии при Александре II. М.: Новое литературное обозрение, 2010. С. 255.

[156] Падаткам на ўтрыманне чыноўнікаў, якія зноў прыбылі з унутраных расійскіх губерняў, абкладаліся ўсе памешчыкі — розніца была ў памеры патрэбнай сумы. М. М. Мураўёў апраўдваўся ў лісце да У. А. Далгарукава ад 7 сакавіка 1864 г.: «Не абвяргаю таго, што сярод мясцовага насельніцтва ёсць рускія і остзейскія памешчыкі, якія не маглі не пацярпець крыху ад бунту; але гэта неабходныя і непазбежныя наступствы кожнай рэвалюцыі, і калі б не ўдалося Ураду падавіць бунт на працягу мінулага года, яны, вядома, страцілі б праз саміх жа бунтароў большую частку сваёй маёмасці і ўсіх з яе даходаў, а таму, мне здаецца, што ім варта не наракаць, але дзякаваць Ураду за выратаванне іх спадчыны. Зрэшты, усе тыя ахвяраванні, якія ад іх патрабаваліся, заключаліся ў спагнанні ад 1½ і 2½ да 3 % з гадавога іх даходу. Спагнанне, вядома, найнікчэмнэйшае, выкліканае толькі аднoй неабходнасцю для пакрыцця вялізных выдаткаў, звернутых на ўсю Расію і патрабаваных уласна ад іх не ў выглядзе кантрыбуцыі, а ў выглядзе запрашэння садзейнічаць Ураду, які меў права спадзявацца, што рускія патрыятычныя пачуцці не дазволяць ніводнаму

з іх наракаць на гэта ці скардзіцца, між тым спагнанне гэтае з асоб польскага паходжання мела ўжо іншае значэнне, даходзіла да 10 % і сапраўды было накладзена ў выглядзе кантрыбуцыйнай меры, незалежна ад іншых штрафаў і спагнанняў для папаўнення шкоды, здзейсненай рабаўніцтвам бунтароў. Відавочна, што ўсе тыя галасы, што падняліся супраць гэтай меры, даказваюць толькі, да якой ступені і некаторыя так званыя рускія патрыёты толькі на словах выказваюць сваю прыхільнасць да Расіі; а на самой справе аказвалася з іх боку не толькі поўнае раўнадушша, але, на жаль, нават адмаўленне ад усялякага садзейнічання Ураду пры задушэнні бунту. Я мушу з жалем сказаць, што ў працяг усёй страшнай барацьбы, якая здзяйснялася тут з крамоламі і з бунтам, калі мужнае войска нашае з поўнай самаадданасцю ахвяравала сабой, пераносячы нечуваныя складанасці і нястачы, ніводны з рускіх і асабліва остзейскіх памешчыкаў (якіх шмат заставалася ў вёсках, пераважна ў Ковенскай губерні) не аказалі Ураду ніякай дапамогі ні ў чым і не супрацьдзейнічалі бунту: бо многія з гэтых апошніх, прыкрываючыся толькі нямецкімі прозвішчамі, жанатыя з полькамі, чакалі раўнадушна заканчэння спрвы, каб далучыцца да трыумфуючага боку» — гл.: Rok 1863 na Mińszczyźnie. 1863 год на Меншчыне. Mińsk, 1927. S. 153–154.

[157] «Накладалі штрафы пры праверках дома за чорнае адзенне, чорнае з белым, попельнае, фіялетавае, за чорнае з чырвонай ашалёўкай, адным словам, за ўсе колеры, таму што калі адзін угледзеў траур у чорным, іншыя ў чырвоным ці блакітным колеры бачылі нешта рэвалюцыйнае або нацыянальнае» — гл.: <Czaplicki F. W.> Moskiewskie na Litwie rządy 1863–1869. Kraków, 1869. S. 129–130.

[158] «Раскватараваныя ў павеце жандары са зброяй у руках прыходзілі ў касцёлы на нядзельную службу. У Бранску, падчас імшы, убачыў жандар на адной дзяўчыне чорны швэдар. Не звяртаючы ўвагі на святасць месца, у якім знаходзіўся, праціснуўся ён праз натоўп малельшчыкаў, падышоў да маладой асобы і, не звяртаючы ўвагі на яе збянтэжанасць, на яе крык, на ўсеагульнае абурэнне і што дзяўчына застанецца толькі ў кашульцы, грубым чынам сарваў з яе швэдар.

Здаралася часта, што ў касцёле зрывалі з дзявочых рук цёмныя рукавічкі ці карáлі з шыі, прычым мусілі тыя плаціць да таго ж па пяць рублёў срэбрам штрафу.

У тым жа касцёле ў адной бабулі вырваў жандар ружанец з чорных пацерак з белымі касцянымі раздзяленнямі і белай на канцы «адамавай галавой». Адабраўшы, загадаў заплаціць тры рублі срэбрам штрафу.

Пасля казанняў жандары ішлі за прапаведнікам і выгаворвалі яму, што не ўзгадваў пра цара, і што не хваліў праваслаўя, арыштоўвалі яго і адпраўлялі да ваеннага начальніка» — гл.: <Czaplicki F. W.>Moskiewskie na Litwie rządy 1863–1869. Kraków, 1869. S. 131–132.

[159] Marechaussee (фр.) — жандармы.

[160] «Из 8375 человек, привлекавшихся к судебной ответственности за участие и соучастие в восстании 1833 (22,36 %) человек составляют крестьяне, 479 (5,84 %) — мещане, 5136 (62,67 %) — дворяне и шляхтичи, 275 (3,35 %) — представители духовенства, 244 (2,98 %) — однодворцы и граждане и 299 (2,60 %) — лица прочих сословий» — Зайцев В. М. Социально-сословный состав участников восстания 1863 г. (Опыт статистического анализа). М., 1973. С. 106.

[161] «По официальным данным, в Северо-Западном крае по приговорам военных судов было сослано с лишением прав состояния и конфискацией на каторжные работы 972 человека, на поселение в отдаленные места Сибири — 573, на поселение в менее отдаленные места Сибири — 854, определено в военную службу рядовыми — 345, сослано в арестантские роты — 864, выслано на водворение на казенных землях внутри империи — 4096 человек (или около 800 семей), сослано на жительство во внутренние губернии по решению суда — 1254 человека. Кроме того, из края было выслано 629 семей так называемой околичной шляхты. В административном порядке, без следствия и суда, по распоряжению Муравьева было выслано 279 человек. В целом высланные из Северо-Западного края составляли большинство (57 %) всех репрессированных участников восстания 1863 г. (высланные из Царства Польского составили 38 %, из Юго-Западного края — 5 %)» — Комзолова А. А. Политика самодержавия в Северо-Западном крае в эпоху Великих реформ. М., 2005. С. 73–74.

[162] Гаворка ідзе пра зваротныя дэпешы віцэ-канцлера князя А. М. Гарчакова на пасланні ўрадаў Францыі, Вялікабрытаніі і Аўстрыі, у якіх утрымлівалася патрабаванне да Расіі выконваць трактат 1815 г.

і не прымяняць зброю ў адносінах да Царства Польскага. У адказ А. М. Гарчакоў аспрэчваў гэты пункт гледжання і выказваў надзею, што ўсе тры імперыі падтрымаюць Расію, па меншай меры маральна, у справе задушэння паўстання.

[163] «Когда... состоялось высочайшее повеление об отозвании из Варшавы великого князя Константина Николаевича и о назначении на его место наместником Царства Польского графа Берга, и когда он проезжал в Варшаву за семейством, Михаил Николаевич Муравьев, по крайней мере, за полчаса до прихода великокняжеского поезда приехал на вокзал. На вопросы приближенных, как он решился при его слабом здоровье в такую дурную погоду выехать на вокзал, он сказал: «Помилуйте, нельзя, теперь едет великий князь, родной брат моего государя!» и при этом он довольно язвительно улыбнулся» — Ауэрбах А. А. Воспоминания // Исторический вестник. 1905. № 10. С. 40–41. Нягледзячы на непрыхаваную насмешку, М. М. Мураўёў быў вымушаны вітаць вялікага князя ў адпаведнасці з пратаколам пасля таго, як, верагодна, яму была выказаная незадаволенасць імператара яго дэманстрацыйнай адсутнасцю падчас папярэдняга праезду Канстанціна Мікалаевіча з Варшавы ў Пецярбург (гл. ніжэй).

[164] «Муравьев был крайне недоволен чересчур гуманным и даже либеральным наместником Царства Польского, великим князем Константином Николаевичем, который будто бы парализовал его решительные действия по усмирению Северо-Западного края. Ходили слухи, будто он даже настаивал у государя об отозвании великого князя из Варшавы. Факт, однако, тот, что когда великий князь, вызванный в Петербург, проезжал через Вильну, то Муравьев не выехал на вокзал повидаться с ним, а послал коменданта Вяткина. Когда экстренный поезд подошел к станции, и великий князь, выйдя из вагона, видимо искал глазами Муравьева, к нему приблизился Вяткин, который и подал ему рапорт. На вопрос великого князя: «А где же Михаил Николаевич?» Вяткин во всеуслышание произнес: «Михаил Николаевич приказал доложить вашему императорскому высочеству, что он чувствует себя не совсем здоровым и поэтому приехать на вокзал никак не может, а что если вашему высочеству угодно его видеть, то он просит осчастливить его посещением вашего императорского

высочества»» — Ауэрбах А. А. Воспоминания // Исторический вестник. 1905. № 10. С. 40.

[165] З Дынабурга 13/25 жніўня 1863 года Канстанцін Мікалаевіч даслаў імператару тэлеграму, якая ўтрымлівала наступную ацэнку нетактоўных паводзінаў М. М. Мураўёва: «Вільню праязджалі ў 6 гадзін і спыняліся на паўгадзіны піць каву. Акрамя генералаў Вяткіна, Дрэнтельна і Дубельта, нікога іншага там не бачыў» — Korespondencja namiestników Królewstwa Polskiego. Styczeń — sierpień 1863 r. Wrocław — Москва, 1974. S. 360.

[166] Мікалай І (1796–1855) — імператар усерасійскі (з 14 снежня 1825 г.); бацька Аляксандра ІІ.

[167] Пад «строгімі мерамі» М. М. Мураўёў мае на ўвазе, хутчэй за ўсё, адмену Канстытуцыі 1815 г., якая дзейнічала ў Царстве Польскім; пад «паслабленнем» — увядзенне ў 1832 г. так званага Арганічнага статута, які дэклараваў не толькі ліквідацыю асобнай польскай арміі і знішчэнне сейма, але і захаванне іншых элементаў аўтаноміі і правоў польскай мовы. Пасля так званай «экспедыцы Заліўскага» і іншых спроб эміграцыі абудзіць новы ўздым нацыянальнага руху на тэрыторыі Літвы, Беларусі і Царства Польскага, значная частка «саступак» засталася толькі на паперы.

[168] Шыманскі Марцэлі — дваранін Гродзенскай губерніі. Пасля паўстання 1830—1831 гг. быў накіраваны эмісарам у Гарадзенскі і Лідскі паветы. 25 траўня 1833 арыштаваны. Супрацоўнічаў са следствам, выдаў спаплечнікаў, у тым ліку Ваўжынца і Марылю (з Верашчакаў) Путкамераў. Быў вывезены ў Пецярбург, адкуль у канцы 1833 г. адасланы ў Парыж у якасці шпега. У Парыжы публічна пакаяўся.

[169] Пётр Пішчатоўскі — удзельнік так званай «экспедыцыі палкоўніка Ю. Заліўскага».

[170] Валовіч Міхал (Міхаіл Казіміравіч) (1806–1833) — выпускнік Віленскага ўніверсітэта, сябра таварыства філаматаў. Удзельнік паўстання 1830–1831 гг. Удзельнік экспедыцыі Ю. Заліўскага 1833 г. Пакараны смерцю паводле прысуду ваенна-палявога суда. Гл. пра яго: Sidorowicz-Czerniewska K. Sprawa emisarjusza Michała Wołłowicza zr. 1833. Grodno, 1934.

[171] Саслоўная прыналежнасць паўстанцаў прааналізаваная ў манаграфіі: Зайцев В. М. Социально-сословный состав участников восстания 1863 г. (Опыт статистического анализа). М., 1973. С. 98–194.

[172] Становішча высланых было катастрафічнае. Заходне-Сібірскі генерал-губернатар, генерал ад інфантэрыі А. В. Дзюгамель прыгадваў: «...тысячи поляков различных категорий были отправлены в Сибирь за более или менее деятельное участие в этих волнениях. Трудно составить себе понятие, в какой мере этим усложнились мои служебные обязанности и лежащая на мне ответственность. С одной стороны, я видел множество несчастных людей, лишенных всяких средств существования, а с другой — мне приходилось быть на стороже, чтоб доведенные до отчаяния ссыльные не пустились на какое-нибудь отчаянное предприятие, от которого их положение могло сделаться еще более тяжелым. Мне приходилось принимать меры предосторожности, чтоб не быть застигнутым врасплох, и в то же время я должен был избегать всяких бесполезных стеснительных мер, которые только довели бы до отчаяния людей, уже раздраженных лишениями всякого рода» — цыт. паводле: Автобиография А. О. Дюгамеля // Русский архив. 1885. Т. IV. № 10. С. 164–165.

[173] Фрыжан — утрымальнік пансіона ў Вільні.

[174] Чарнышоў Аляксандр Іванавіч (1786–1857) — граф (1826), святлейшы князь (1848). Расійскі ваенны і дзяржаўны дзеяч, дыпламат. Генерал-ад'ютант (1812); генерал ад кавалерыі (1827). Член Следчай камісіі па справе 14 снежня 1825 г. (1825–1826). Выконваючы абавязкі міністра, ваенны міністр (1827–1852). Старшыня Дзяржаўнага савета (з 1848 г.).

[175] Бенкендорф Аляксандр Хрыстафоравіч (1781 або 1782–1844) — граф (1832); расійскі ваенны і дзяржаўны дзеяч. Генерал-ад'ютант(?); генерал ад кавалерыі(?). Галоўны кіраўнік III Аддзялення асабістай яго імператарскай вялікасці канцылярыі, шэф корпуса жандараў (1826–1844).

[176] Грэка-ўніяцкая калегія ў Пецярбургу была створаная ў 1828 г. з 2-га дэпартамента рымска-каталіцкай духоўнай калегіі. Існавала ў такім статусе да 1839 г., калі пасля ліквідацыі Уніі была падначаленая Свяцейшаму Сіноду Рускай праваслаўнай царквы.

[177] Блудаў Дзмітрый Мікалаевіч (1785–1864) — граф (1842); расійскі дзяржаўны дзеяч, літаратар. Справавод Следчай камісіі па справе 14 снежня 1825 г. Таварыш міністра народнай асветы і галоўны кіраўнік справаў замежных веравызнанняў (1826–1830). Сапраўдны тайны радца (1839). Член Дзяржаўнага савета (з 1839 г.). Старшыня Дзяржаўнага савета і камітэта міністраў (з 1862 г.).

[178] М. М. Мураўёў памылкова называе так Жыровічы — мястэчка ў Слонімскім павеце, якое было ў першай палове XIX ст. цэнтрам грэка-ўніяцкай царквы: тут у 1810–1828 гг. знаходзілася рэзідэнцыя грэка-каталіцкага біскупа Брэсцкага. У 1828–1840 гг. Жыровічы былі цэнтрам Літоўскай грэка-каталіцкай, у 1840–1845 гг. — праваслаўнай епархіі.

[179] Каложская (Барыса-Глебская) царква — адзін з найстарэйшых хрысціянскіх храмаў Беларусі; пабудаваная ў Гродне ў другой палове XII ст. Пасля Берасцейскай уніі 1596 г. пры Каложскай царкве стаў функцыянаваць базыльянскі кляштар.

[180] У 1834 г. Папам Рымскім быў Грыгорый XVI — у свецкім жыцці Барталамеа Альберта Капелары.

[181] Пра парадак пераходу ўніятаў у праваслаўе і працэсы, што яго суправаджалі, гл.: Долбилов М. Д. Русский край, чужая вера: Этноконфессиональная политика империи в Литве и Белоруссии при Александре II. М., 2010. С. 77–108.

[182] Галубовіч Міхал (1800–1881) — беларускі рэлігійны дзеяч (да 1839 г. уніяцкі, пасля праваслаўны). Епіскап Брэсцкі (1840–1848); епіскап (1848), пасля архіепіскап Мінскі (1853–1868). Гл. пра яго: Янушкевіч Я. Дыярыюш з XIX стагоддзя: Дзённікі Міхала Галубовіча як гістарычная крыніца. Мінск, 2003.

[183] Базыльяне — першы ўніяцкі манаскі ордэн, названы ў гонар святіцеля Васілія Вялікага, архіепіскапа Кесарыйскага. Заснаваны ў 1579 г.

[184] Сярод тых, хто не мог «перамяніцца» і заставаўся фактычна ўніятам «старога ўзору», апынуўся і бацька мітрапаліта Іосіфа — святар Дзікушскага прыхода Літоўскай епархіі (Лідскі павет). Паводле словаў сучаснага даследчыка Л. Лаўрэша, «стары не прыняў праваслаўнай

абраднасці, якая ўводзілася ў той час ва ўніяцкай царкве. Пасля страты месца, ён падарыў сваю хату каля касцёла сыну-лекару Мікалаю і купіў іншы дом, насупраць старога, дзе зрабіў з кухні малельню, упрыгожыўшы яе абразамі. У гэтай малельні стары Сямашка правёў па ўніяцкім абрадзе шлюб сваёй дачкі Алены. Па ўспамінах відавочцаў, маладыя падчас вянчання стаялі на каленах» — гл.: Лаўрэш Л. Грэка-каталіцкая (уніяцкая) царква на Лідчыне. Полацак, 2012. С. 50. Яшчэ больш радыкальную пазіцыю заняў брат мітрапаліта: «Аб сваім браце Ян Сямашка гаварыў так: *«пракляты: ён і сябе ўтапіў, і народ загубіў»*. Калі, аднойчы, праваслаўны святар паказаў Яну партрэт яго знакамітага брата, *«ён з шаленствам кінуў партрэт на падлогу і пры гуках пабітага шкла ўцёк»*. Паміраючы, Ян завяшчаў пахаваць сябе пры Ілінецкім касцёле, і ксяндзы былі гатовы выканаць яго волю. Але праваслаўныя святары забралі цела нябожчыка і пахавалі пры праваслаўнай царкве, чаму мітрапаліт быў рады, і даслаў ім за гэта грашовую ўзнагароду. Жонка Яна Сямашкі, дачка ўніяцкага святара, каб пазбегнуць пераводу ў пануючую веру, перайшла ў рыма-каталіцтва» — Тамсама. С. 51.

[185] Сувораў-Рымніцкі Аляксандр Аркадзевіч (1804–1882) — князь Італійскі; расійскі ваенны і дзяржаўны дзеяч. Унук генералісімуса А. В. Суворава. Пачынаў вучобу ў езуіцкім пансіёне ў Пецярбургу, пасля — у гофвільскай школе вядомага швейцарскага педагога Ф. Э. Феленберга, з гэтае прычыны лічыўся пазней апекуном католікаў і пратэстантаў. Генерал-ад'ютант (1846). Генерал ад інфантэрыі (1859). Член Дзяржаўнага савета (1861). Санкт-пецярбургскі ваенны генерал-губернатар (1861–1866). Лічыўся адным з найбольш ліберальных палітыкаў свайго часу; паслядоўны апанент М. М. Мураўёва. Пра іх узаемаадносіны з Мураўёвым гл., у прыватнасці: Сикевич В. М. Два врага (Отрывок из воспоминаний) // Русская старина. 1898. № 11. С. 422–430.

[186] Цютчаў Фёдар Іванавіч (1803–1873) — расійскі паэт, дыпламат і дзяржаўны дзеяч. Тайны радца (1865). Старшыня Камітэта цэнзуры замежнай (1858–1873).

[187] Гісторыя вершаванай палемікі Ф. І. Цютчава з А. А. Суворавым выкладзеная ў нашым артыкуле: Фядута А. І. Сувораў супраць Мураўёва (Старонка з гісторыі рускай паэзіі) // ARCHE. 2010. № 12. С. 284–299.

[188] Остзейскімі называліся прыбалтыйскія губерні, створаныя ў Расійскай імперыі на землях, захопленых у выніку перамогі над Швецыяй у Паўночнай вайне, замацаванай Ніштадскім пагадненнем, а таксама ў выніку падзелаў Рэчы Паспалітай. М. М. Мураўёў лічыў остзейскія губерні асяродкам лібералізму, таму што прыгоннае права ў іх паслядоўна адмянялася пачынаючы з кіравання Аляксандра I (1816). Роля выхадцаў з остзейскіх губерняў пры двары была вялікая, бо Мікалай I разглядаў іх як своеасаблівую альтэрнатыву расійскаму дваранству, якое не карысталася даверам імператара пасля паўстання 14 снежня 1825 г.

[189] Рэвель — старая назва г. Талін (цяпер сталіца Эстоніі).

[190] Лівен Вільгельм Карлавіч (1800–1880) — барон; расійскі дзяржаўны дзеяч. Генерал ад інфантэрыі (1859). Рыжскі, ліфляндскі, эстляндскі і курляндскі генерал-губернатар і камандуючы войскамі (1861–1864). Член Дзяржаўнага савета (1863).

[191] Аненкаў Мікалай Мікалаевіч (1799–1865) — расійскі ваенны і дзяржаўны дзеяч. Генерал-ад'ютант (1844). Генерал ад інфантэрыі (1856). Сенатар (1854). Дзяржаўны кантралёр (1855–1862). Генерал-губернатар Паўднёва-Заходняга краю (1862–1865).

[192] Параход «Кумір» з буксірнай баржай, абсталяваны па амерыканскай сістэме ў два ярусы, належаў генерал-маёру Шумлянскаму, што пражываў у Кіеве, і быў наняты нібыта для здзяйснення сяброўскай калектыўнай паездкі праз Дняпро ў Пінск. Пры спробе яго затрымання загінулі сяляне вёскі Цемкава Сафрон Кажадуб і вёскі Рудня Мазырскага павету Стафан Кулажанка (абодзьва патанулі ў Прыпяці). Іх сем'і атрымалі ад урада па 100 рублёў узнагароды.

[193] Гаворка пра так званую Казанскую змову 1863 г. «Паўстанцкі Цэнтральны камітэт, не атрымаўшы ад «Зямлі і Волі», з якой паразумеўся, запэўнівання, што «Зямля і Воля» будзе падштурхоўваць сялян да паўстання, пастанавіў сам арганізаваць гэтую справу. У якасці месца для паўстання сялянства была абраная гістарычная верхняя Волга, дзе яшчэ жывая была памяць пра сялянскі рух Пугачова.

Паўстанцкі Цэнтральны камітэт даручыў гэтую справу Іераніму Станіславу Кяневічу, які жыў у Маскве. Кяневіч пачаў перамовы

з Казанскім камітэтам «Зямлі і Волі» пры пасярэдніцтве паручніка М. Чарняка, які быў удзельнікам гэтага камітэта. У выніку перамоваў Казанскі камітэт згадзіўся не перашкаджаць гэтай працы». — Witkowski J. Powstanie 1863 roku i rosyjski ruch rewolucyjny początku 1860-ch lat. Książka 3. Mińsk, 1931. S. 37. Аднак гэта аказалася толькі няўдалай спробай паўстанцаў Паўночна-Заходняга краю і Царства Польскага інспіраваць, абапіраючыся на таемныя таварыствы («Зямля і воля») унутраных расійскіх губерняў, узброенае паўстанне сялян і прымусіць царскі ўрад ваяваць на два франты. З гэтай мэтай быў падрыхтаваны фальшывы маніфест і пракламацыя «Часовае народнае праўленне». Паўстанне не адбылося, яго ініцыятары былі расстраляныя.

[194] Спроба паўстання ў Сімбірскай губерні адбылася ўжо ў 1861 г., фактычна адразу пасля абвяшчэння маніфеста пра адмену прыгоннага права. Сяляне адмаўляліся працаваць на былых паноў, аргументуючы гэта тым, што, акрамя Бога і цара, начальства над імі больш няма. У 1861–1863 гг. зброя ў Сімбірскай губерні прымянялася звыш дваццаці разоў.

[195] «М. Н. Муравьев в бытность Гродненским губернатором составил для себя список лиц, участвовавших в бунте 1831 года; список этот был им взят с собою при отъезде в Вильну и оказалось, что главные деятели мятежа 1863 года были дети лиц, находящихся в списке М. Н. Муравьева. Далевский был сыном сосланного в 1831 году политического преступника, участвующие в мятеже 1865 года Гедройцы, Ромеры, Платеры были дети участников бунта 1831 г. Наконец, как пример того, насколько достойны снисхождения поляки, служит то, что все помилованные в 1856 году, вернувшиеся в край из Сибири и из-за границы принимали деятельное участие и в беспорядках 1863 года, как отец Далевского, прибывший в Вильну в 1856 году и вновь сосланный в Сибирь в 1864 году» — Черевин П. А. Воспоминания: 1863–1865 гг. Кострома, 1920. С. 34.

[196] Медыка-хірургічная акадэмія ў Пецярбургу была заснаваная ў 1798 г. Да сярэдзіны XIX ст. атрымала вядомасць як найбуйнейшая вышэйшая медыцынская навучальная ўстанова Расіі. У 1851–1864 гг. прэзідэнтам акадэміі з’яўляўся былы рэктар Віленскага ўніверсітэта В. В. Пелікан, што таксама садзейнічала з’яўленню ў акадэміі

студэнтаў з Царства Польскага і літоўскіх губерняў, дзе атрымаць вышэйшую медыцынскую адукацыю ў гэты перыяд было папросту немагчыма.

[197] Ордэн Святога Андрэя Першапакліканага — першы па часе заснавання ордэн у Расіі, найвышэйшая дзяржаўная ўзнагарода ў Расійскай імперыі. Заснаваны імператарам Пятром I у 1698 або 1699 г.

[198] «День именин М. Н. Муравьева, 8 ноября, послужил поводом к новым в его честь овациям. Отовсюду полетели в Вильну поздравительные телеграммы... прибывший из Петербурга камергер Шевич поднес Муравьеву икону св. Архистратига Михаила при коллективном письме от петербургского кружка почитателей его. Мысль этой манифестации принадлежала графине Антонине Дмитриевне Блудовой, которой удалось собрать до 80 подписей... В числе этих подписей выдавались: графа Дм<итрия> Ник<олаевича> Блудова и его дочери, целый ряд имен семьи князей Мещерских, Карамзиных, генерал-адъютанта Н. В. Зиновьева, графа Вьельгорского, графини Протасовой, Дм<итрия> Ник<олаевича> Замятнина, А. А. Зелёного, П. П. Мельникова, графа Гейдена, графа Муравьёва-Амурского, Ф. И. Тютчева, генерала Хрулева и т. д.» — Милютин Д. А. Воспоминания. 1863–1864. М., 2003. С. 326–327.

[199] Таварыства вінцэнцінак было заснаваная ў 1860 г. (М. М. Мураўёў памылкова называе 1861 г.) у Вільні з ініцыятывы М. Бучынскай і віленскага каноніка Шымана Казлоўскага. Названае ў гонар святога Вінцэнта дэ Поля (1581–1660), заснавальніка кангрэгацыі дачок міласэрнасці.

[200] Бучынская (народжаная Тызенгаўз) Матыльда (1811 — пасля 1867) — графіня, жонка графа Маўрыцыя Бучынскага (з 1834), вядомая мецэнатка і грамадская дзяячка. Валодала землямі ў Свянцянскім павеце. Была выслана ў Ніжагародскую губерню, дзе знаходзілася да 1867 г., пасля вярнулася ў Вільню, дзе неўзабаве памерла; маёнткі М. Бучынскай былі секвестраваныя.

[201] Маецца на ўвазе, верагодна, Дарота Лапацінская (народжаная Марыконі) (? — пасля 1863), вядомая сваёй дабрачыннай дзейнасцю. Г. Пузыніна ў мемуарах называе яе «светачам віленскіх салонаў» —

гл.: Puzynina z Gunterów G. W Wilnie i w dworach litewskich. Pamiętnik z lat 1815–1843. Wilno, 1828. S. 12.

[202] Хутчэй за ўсё, размова ідзе пра графіню Міхаліну Плятэр, якая сапраўды была высланая ў першай палове 1864 года «ў адміністрацыйным парадку» з Вільні.

[203] «В числе репрессированных 592 чел. составляют женщины. Среди них крестьянского сословия — 53, мещанского — 14, дворянского — 492, настоятельница католического монастыря — 1, дочери православных священников — 3, прочих — 10 и не установленных — 19 человек» — гл.: Зайцев В. М. Социально-сословный состав участников восстания 1863 г. (Опыт статистического анализа). М., 1973. С. 106. Гл. таксама: Фірыновіч А. Э. Паўстанне 1863–1864 гг.: вядомыя і невядомыя крыніцы беларускіх архіваў. Мінск, 2013. С. 305–306.

[204] Хутчэй за ўсё, размова ідзе пра Зофію Дамброўскую (? – 1864, мажліва – ўдаву трокскага маршалка шляхты Людвіга Дамброўскага), асобу якой Мураўёў відавочна дэманізуе. З. Дамброўская заснавала ў 1857 годзе прытулак для старых жанчын (адначасова ўтрымлівалася да 40 жанчын) і інвалідаў рыма-каталіцкага веравызнання. Пры прытулку была таксама кухня, дзе харчаваліся і дзеці з бедных сямей. Мажліва, Мураўёў спрабуе давесці злачыннасць дзейнасці і намераў Дамброўскай менавіта таму, што заснаваны ёю прытулак у 1858 годзе падчас наведвання Вільні Аляксандрам ІІ быў заўважаны імператрыцай Марыяй Аляксандраўнай, якая асабіста наведала прытулак і аказала дапамогу. Паколькі Мураўёў усялякім чынам падкрэслівае злачыннасць мясцовай шляхты як класа і палякаў як нацыі, давесці, што дзейнасць асобы, якая стала вядомай самой імператрыцы з благадзейнасці, мела, насамрэч, крымінальны характар, было б для яго вельмі зручным. (Дзякуем П. М. Лаўрынцу і Л. І. Коўкель за дапамогу ў атрыманні гэтых звестак).

[205] Наржымскі (Нажымскі) Юзаф (1839–1872) — пісьменнік, член Нацыянальнага ўрада, поглядамі быў блізкі да «чырвоных». Паводле меркавання члена Нацыянальнага ўрада А. Авейдэ, які даваў падрабязныя паказанні следству, «он был среди нас всех единственным, так сказать, оконченным революционером; хладнокровный, вполне сознающий свои слова и действия, он настойчиво вызывал безотлагательную революцию, несмотря на то, что знал превосходно недостаточность

матэрыяльных средств. [...] Он был наиболее способной личностью из нас всех, из всего без исключения нашего состава. Базисом всех теорий Наржимского было следующее: когда общество сознает необходимость и неизбежность ускоренной революции, тогда люди, стоящие во главе движения, имеющие в своих руках инициативу, непременно должны смело и решительно подать сигнал к всеобщему бунту. Они должны это сделать под угрозой проклятия потомства, тем более, что сознающее необходимость войны общество создаст ее и без их сигнала само при первой встретившейся случайности; но только в таких условиях революция, не руководимая никем, будет менее сильной, следовательно, дающей меньшее ручательство в успехе. Недостаточность же средств пополнит сильное революционное правительство среди пожара восстания. Потому-то Наржимский требовал и постоянно настаивал на том, чтобы Комитет бросил все, все проекты и усилия основательного преобразования организации, все сношения с духовенством и т. п. занятия, а посвятил исключительно все время, день и ночь трудам, ограниченным словами: оружие, амуниция, офицеры, окончательные инструкции, вводя тотчас же чисто военную администрацию» — цыт. паводле: Показания и записки о польском восстании 1863 года Оскара Авейде. М., 1961. С. 483. Пасля задушэння паўстання Ю. Нажымскі эміграваў.

[206] Запіс у дзённіку П. А. Валуева ад 1 мая 1864 г.: «Государь говорил мне сегодня... о своем свидании с Муравьевым, который жаловался ему на противодействия центральных властей. Государь сказал ему, что это слова и что если противодействие будет указано и доказано, то его дело будет оное устранить» — Валуев П. А. Дневник министра внутренних дел. Т. 1. С. 281.

[207] Запіс у дзённіку П. А. Валуева ад 26 красавіка 1864 г.: «После обеда, т. е. в шестом часу, прибыл в Петербург ген. Муравьев. Он нездоров или притворяется нездоровым. Его несли на креслах от вагона до кареты» — гл.: Валуев П. А. Дневник министра внутренних дел. Т. 1. С. 281.

[208] Мельнікаў Павел Пятровіч (1804—1880) — расійскі інжынер і дзяржаўны дзеяч. Першы міністр шляхоў зносін Расійскай імперыі (1865—1869). Інжынер-генерал (1869). Член Дзяржаўнага савета (з 1865).

[209] Замятнін Дзмітрый Мікалаевіч (1805—1881) — расійскі юрыст і дзяржаўны дзеяч. Сенатар (1852). Міністр юстыцыі і генерал-

пракурор Расійскай імперыі (1862–1867). Член Дзяржаўнага савета (з 1867). Адыграў адметную ролю ў ажыццяўленні судовай рэформы пры Аляксандры II.

[210] Кауфман Канстанцін Пятровіч фон (1818–1882) — расійскі ваенны і дзяржаўны дзеяч. Інжынер-генерал (1874), генерал-ад'ютант (1864). Генерал-губернатар Паўночна-Заходняга краю і камандуючы Віленскай ваеннай акругай (1865–1867). У гэтай якасці ініцыяваў масавыя пераводы католікаў у праваслаўе і забарону на выкарыстанне лацінскага алфавіта ў літоўскім кнігадрукаванні; паводле словаў П. А. Валуева, на пасадзе генерал-губернатара «преимущественно старался доказать, что он — не Кауфман, а Муравьев» — гл.: Валуев П. А. Дневник министра внутренних дел. Т. 2. С. 45. Пасля 1867 г. К. П. Кауфман камандаваў захопам тэрыторыі туркестанскіх ханстваў: Хівы, Каканда, Бухары.

[211] У. А. Зыбін, які быў губернскім пракурорам падчас мураўёўскага кіравання, апісаў закрыццё віленскага жаночага манастыра візітак у нарысе: В. З. <Зыбин В. А.> М. Н. Муравьев в Вильне (Из рассказов губернского прокурора) // Русская старина. 1898. № 11. С. 287–289.

[212] Патапаў Аляксандр Львовіч (1818–1886) — расійскі дзяржаўны і ваенны дзеяч. Генерал-ад'ютант (1866); генерал ад кавалерыі (1874). Член Дзяржаўнага савета (1876). Начальнік штаба асобнага корпуса жандараў, адначасова кіраўнік III Аддзялення ўласнай яго імператарскай вялікасці канцылярыі (1861–1864). Памочнік Віленскага генерал-губернатара (1864–1865). Звольнены ў выніку непрымання яго пазіцыі Мураўёвым. Віленскі генерал-губернатар і камандуючы Віленскай ваеннай акругай (1868–1874). Паводле ўспамінаў А. М. Масолава, «М. Н. Муравьев жестоко ошибся в выборе себе помощника и вероятного преемника. Нельзя было найти другое лицо, которому вся манера Муравьева была бы более чужда, ненавистна, чем А. Л. Потапов. Впоследствии, при позднейшем своем управлении краем, ген. Потапов механически и на бумаге даже поддерживал распоряжения и начинания Муравьева, но вообще он смотрел на то патриотическое одушевление, которое внесено было в управление муравьевским строем, как на крупный административный скандал, который надлежало прекратить как можно скорее ради благочиния и порядка» — Мосолов А. Н. Виленские очерки (Муравьевское время): 1863–1865 гг. СПб., 1898. С. 161.

[213] Сабор Святога Станіслава і Святога Уладзіслава — кафедральны сабор Віленскай рымска-каталіцкай епархіі; паводле падання, заснаваны ў 1251 г. князем Міндоўгам пасля яго хрышчэння, зруйнаваны па вяртанні Міндоўга ў язычніцтва (пасля 1261 г.). Адноўлены пасля хрышчэння Літвы па загадзе караля польскага і вялікага князя літоўскага Ягайлы. Сённяшні выгляд сабор атрымаў у 1801 г., калі была завершаная яго рэканструкцыя паводле праекта прафесара Віленскага ўніверсітэта Л. Стуокі-Гуцявічуса.

[214] Свята-Духаў мужчынскі манастыр — заснаваны ў XVI ст.; знаходзіўся ў юрысдыкцыі ўніяцкай царквы, пасля — у юрысдыкцыі Маскоўскага патрыярхату. У пячорным храме ў імя Віленскіх мучанікаў пахаваны мітрапаліт Іосіф Сямашка.

[215] «9-го числа, в 7 часов утра, назначен был Высочайший смотр собранным под Вильной войскам. Государь нашел эти войска в отличном состоянии и выразил свою благодарность генералу Муравьеву назначением его шефом 101-го Пермского полка. Остановившись перед фронтом этого полка, Государь сам скомандовал «на караул» и первым провозгласил «ура» в честь нового шефа. Муравьев был глубоко растроган этим неожиданным выражением особенного царского внимания. Вообще Государь на этот раз обошелся с ним весьма благосклонно и одобрил все принятые и предположенные им меры к обрусению края. Можно сказать, что в это время М. Н. Муравьев был на высшей точке почета и славы; в крае, ему вверенном, все преклонялось перед его силой и твердой волей; подчиненные его из русских людей смотрели на него, как на опору русского владычества в стране; во всей России гремела слава укротителя польской смуты...» — гл.: Милютин Д. А. Воспоминания. 1863–1864. М., 2003. С. 445.

[216] Вяселле спадчынніка з прынцэсай Дагмарай Дацкай не адбылося, бо вялікі князь Мікалай Аляксандравіч памёр ад цэрэбра-спінальнага менінгіту. Дагмара (1847–1928) пазней выйшла за вялікага князя Аляксандра Аляксандравіча, прыняла імя Марыі Фёдараўны і з 1881 г. стала імператаркай.

[217] Адносіны паміж П. А. Валуевым і М. М. Мураўёвым складваліся няпроста. Валуеў пачынаў сваё ўзыходжанне да міністэрскай пасады

ў структурах Міністэрства дзяржаўных маёмасцяў пры падтрымцы Мураўёва; прынята лічыць, што і пасаду кіраўніка спраў Камітэта міністраў, і, пасля, міністра ўнутраных спраў ён атрымаў менавіта дзякуючы падтрымцы М. М. Мураўёва і В. А. Далгарукава, якія бачылі ў Валуеве сваю крэатуру. Аднак з набліжэннем сялянскай рэформы Валуеў зрабіў стаўку на тыя падыходы, прыхільнікам якіх быў вялікі князь Канстанцін Мікалаевіч і, верагодна, сам імператар. Нягледзячы на нібыта захаваныя адносіны (што было неабходна, бо і на пасадзе віленскага генерал-губернатара Мураўёў мусіў узгадняць свае дзеянні з урадам), відавочна, што рэдка каго «літоўскі праконсул» ненавідзеў у апошнія гады жыцця так паслядоўна і шчыра, як свайго былога вылучэнца Валуева.

[218] Галаўнін Аляксандр Васільевіч (1821–1886) — расійскі дзяржаўны дзеяч; статс-сакратар, сапраўдны тайны радца. Міністр народнай асветы (1862–1866); член Дзяржаўнага савета. Адзін з найбліжэйшых паплечнікаў вялікага князя Канстанціна Мікалаевіча.

[219] «Головнин никогда не был так близок к государю, чтобы иметь возможность говорить его величеству о Муравьеве, а по принятому им правилу никогда не говорил государю ни о ком дурно, опасаясь, что произведет более дурное впечатление, чем следует. Притом Головнин порицал не управление Муравьева после усмирения, но систему услужения, основанную на том, что смешивались виновные с невиновными. [...] Что касается управления краем после усмирения, Головнин открыто говорил, что Муравьев, как умный человек, лучше другого мог бы, если бы только знал положительную волю государя, перевести край из осадного положения с военным произволом в положение мирное с уважением к законам» — <Дельвиг А. И.> Полвека русской жизни. Воспоминания А. И. Дельвига. 1820–1870: в 2 т. Т. 2. М.–Л., 1930. С. 267.

[220] Рэйтарн Міхаіл Хрыстафоравіч (1820–1890) — граф, расійскі дзяржаўны дзеяч. Сапраўдны тайны радца; статс-сакратар. Міністр фінансаў (1862–1878), старшыня Камітэта міністраў (1881–1886); член Дзяржаўнага савета. Супрацьдзейнічаў шэрагу рэпрэсіўных мераў, ініцыяваных Мураўёвым. «Рейтерн, например, желая затормозить высылку целыми селениями так называемой «застенковой шляхты»

(выслано свыше пяти тысяч человек, причем были сожжены со всем имуществом деревни, в которых они жили), поставил условием, что казна не обязывается принимать на свой счет издержки по возврату, если таковой впоследствии будет решен» — гл.: Пантелеев Л. Ф. Воспоминания. М., 1958. С. 379–380.

[221] Дэпартамент неакладных збораў — існаваў у структуры Міністэрства фінансаў да 1896 г. Пад яго кантролем знаходзіліся казённы продаж алкаголю і падаткі, якія не мелі «акладнага» характару, то бок акцызы з тытуню, цукру, дрожджаў і іншых тавараў.

[222] Грот Канстанцін Карлавіч (1815–1893) — расійскі дзяржаўны і грамадскі дзеяч. Член Дзяржаўнага савета (1870). Самарскі губернатар (1853–1861). Дырэктар Дэпартамента падаткаў і збораў (пасля — Дэпартамента неакладных збораў) Міністэрства фінансаў (1861–1869).

[223] Талстой Іван Мацвеевіч (1806–1867) — граф, расійскі дзяржаўны дзеяч. Обер-гафмейстар, сенатар. Дырэктар Паштовага дэпартамента Міністэрства замежных спраў (1863–1865), міністр поштаў і тэлеграфа (1865–1867); член Дзяржаўнага савета.

[224] Молодые люди, которые воспитывались вместе с наследником престола — Мураўёў блытае: разам з будучым Аляксандрам II выхоўваліся І. М. Віельгорскі і А. У. Паткуль. Мажліва, блытаніна звязана з тым, што І. М. Талстой суправаджаў будучага імператара ў якасці камергера ў 1838 годзе падчас еўрапейскага падарожжа, дзе Аляксандр Мікалаевіч пазнаёміўся з ім бліжэй і пачаў давяраць.

[225] Адлерберг Уладзімір Фёдаравіч (1791–1884) — граф; расійскі дзяржаўны дзеяч. Генерал-ад'ютант; міністр двара і надзелаў (1852–1870). «Владимир Федорович отличается совершенным отсутствием ума, соображения и познаний; трудно встретить такую полную, совершенную, безграничную бездарность. Дел он не понимает вовсе, занят лишь своими удовольствиями и добыванием какими бы то ни было способами денег, которые проматывает на свои удовольствия» — Долгоруков П. В. Петербургские очерки. С. 142.

[226] Гагарын Павел Паўлавіч (1789–1872) — князь; расійскі дзяржаўны дзеяч; сапраўдны тайны радца 1-га класа. Сенатар (1831);




1



2



3



4


VLADIMIR NAZIMOFF
AIDE DE CAMP DE SA MAJESTÉ L'EMPEREUR DE TOUTES LES RUSSIES.
GOUVERNEUR GÉNÉRAL DES GOUVERNEMENTS DE WILNA, KOWNO ET GRODNO
CHEVALIER GRAND-CROIX DE PLUSIEURS ORDRES, & & &

5



6



7


8


9


10


11


12


13


14


15


16



17


Pomnik Murawiewa na kartach historji.
Car odpowiada w pięknej sztuki słowie
Posągiem w Wilnie na posąg w Krakowie

18


Die neue Hydra,
Kom.
dem modernen Herkules über den Kopf wachsend.

19


DIAVOLINA
Mourawieff se faisant applaudir pour sa manière de lever la jambe.
Mourawieff se faisant siffler pour sa manière de lever le bras.

20

21



22



23



24





25



26



27



28



29



30



31



32

член Дзяржаўнага савета (1844). Старшыня следчай камісіі па справе гуртка М. В. Петрашэўскага (1849). Старшыня Дэпартамента законаў Дзяржаўнага савета (1862–1864), старшыня Дзяржаўнага савета і Камітэта міністраў (1864–1872). «Человек умный и отменно способный, но злой и мстительный»; «старик 80-летний, но еще довольно бодрый, очень умный, очень способный; язык его, язвительный и резкий, долго вредил его карьере, но он себя обуздал и сделался ловким придворным, тем более ловким, что важная представительность, навык светский и обхождение величаво-вежливое придают ему какой-то мишурный блеск характера мнимо независимого» — гл.: Долгоруков П. В. Петербургские очерки. С. 328; 284.

[227] П. П. Гагарын быў саюзнікам М. М. Мураўёва пры абмеркаванні праектаў вызвалення сялян; ён быў аўтарам так званага беззямельнага, ці сіроцкага, праекта, прянятага Дзяржаўным саветам, згодна з якім сяляне атрымлівалі зямлю ў выглядзе «дарчай», то бок паводле волі і выбары памешчыка.

[228] Панін Віктар Мікітавіч (1801–1874) — граф; расійскі дзяржаўны дзеяч. Міністр юстыцыі (1841–1862). Член Дзяржаўнага савета. Старшыня Рэдакцыйных камісій па сялянскай рэформе (1860–1861). П. У. Далгарукаў, ацэньваючы яго ролю ў вышэйшых эшалонах улады, называў В. М. Паніна «полоумным Агамемноном ретроградов» — Долгоруков П. В. Петербургские очерки. С. 287.

[229] Паніна (народжаная Тызенгаўзэн) Наталля Паўлаўна (1810–1899) — графіня; жонка В. М. Паніна, унучка графа П. А. Палена — завадатара змовы супраць імператара Паўла I.

[230] Чэўкін Канстанцін Уладзіміравіч (1802–1875) — расійскі дзяржаўны дзеяч, генерал-ад'ютант; сенатар (1845). Галоўны кіраўнік шляхоў зносін і публічных будынкаў (1855–1862), старшыня Дэпартамента дзяржаўнай эканоміі Дзяржаўнага савета (з 1863). Згодна з характарыстыкай, дадзенай яму П. У. Далгарукавым, Чэўкін — «человек, обладающий обширными познаниями, одаренный умом замечательным, способностями несомненными, трудолюбием редким, но вместе с тем и характером самым несчастным: вечно в ссоре со всеми, с начальниками, с товарищами, с подчиненными, с лицами, имеющими к нему

отношение по делам, — одним словом, самый умный еж во всей всероссийской империи» — Долгоруков П. В. Петербургские очерки. С. 329.

[231] Мілюцін Мікалай Аляксеевіч (1818–1872) — расійскі дзяржаўны дзеяч; тайны радца (1860), сенатар (1861); брат Дз. А. Мілюціна. Адзін з кіраўнікоў Рэдакцыйных камісій па сялянскай справе. Статссакратар па справах Царства Польскага (1864–1866). Член Дзяржаўнага савета (1865–1867). П. У. Далгарукаў пісаў пра яго: «Это был человек замечательного ума, страшно властолюбивый, но одаренный блистательными способностями, он был главной пружиной освобождения крестьян с землей; это будет ему вечной славой в истории; он — сочинитель устава земских учреждений; человек энергичный, характера резкого, часто неприятного, он вовсе чужд наружной мягкости своего брата Дмитрия, но зато чужд и его двуличности» — Долгоруков П. В. Петербургские очерки. С. 285.

[232] «Император Александр II несомненно ждал только первого благоприятного случая, чтобы отделаться от Муравьева. [...] Рассказывали, что, представляясь государю, Муравьев заговорил о разных проектах, привезенных им. «Я еду за границу, за меня остается брат Константин, к нему и следует обратиться по этим делам». При тех неприязненных отношениях, которые установились между великим князем и Муравьевым, последний понял, что ему остается только одно — подать в отставку. Отставка была принята без малейшей попытки отговорить Муравьева взять ее обратно» — гл. Пантелеев Л. Ф. Воспоминания. М., 1958. С. 380.

[233] Хрушчоў Аляксандр Пятровіч (1806–1875) — расійскі ваенны і дзяржаўны дзеяч; генерал-ад'ютант (1869). Герой абароны Севастопаля. Генерал ад інфантэрыі (1869). Памочнік камандуючага войскамі Віленскай ваеннай акругі (1864–1865), пасля генерал-губернатар і камандуючы войскамі Заходняй Сібіры (1866–1874). Член Дзяржаўнага савета (1875).

[234] Мяркуючы па сцвярджэннях А. М. Масолава, гэтае прызначэнне адбылося не зусім так, як пра яго гаворыць Мураўёў: «...в записках своих покойный граф старается дать понять, что назначение генерала Кауфмана состоялось по его представлению; можно ду-

мать, что в этом отношении он ошибался или заблуждался. Я положительно помню, что Михаил Николаевич никак не ожидал этого назначения, которое в первое время ему было даже почему-то неприятно; но он, скрепя сердце и из необходимости поддержать солидарность свою с генералом Кауфманом и дабы не оттолкнуть его от своей системы, радостно приветствовал его назначение и был до конца постоянным официальным его защитником. Можно полагать, что Д. А. Милютин, в виду возникших затруднений, и старался узнать мнение графа о Кауфмане перед тем, чтобы рекомендовать его государю, и что его величество тоже спрашивал о нем генерала Муравьева, в ответ на его представление о Хрущеве; но Михаил Николаевич не придавал этому особого значения, хотя, конечно, хорошо отозвался о личности Кауфмана на запрос государя» — Мосолов А. Н. Виленские очерки (Муравьевское время): 1863–1865 гг. СПб., 1898. С. 218–219.

[235] Безак Аляксандр Паўлавіч (1800–1868) — расійскі дзяржаўны дзеяч; генерал-ад’ютант; генерал ад артылерыі (1859). Аранбургскі (1860–1865), пасля кіеўскі (1860–1868) генерал-губернатар. Член Дзяржаўнага савета (з 1863).

[236] Мікалай Аляксандравіч (1843–1865) — вялікі князь, цэсарэвіч, старэйшы сын імператара Аляксандра II. П. А. Валуеў запісаў у дзённіку 5 красавіка 1865 г.: «Вечером внезапно получил от кн. Долгорукова извещение, что государь едет завтра за границу вследствие печальных известий, полученных о болезни цесаревича. [...] По-видимому, болезнь в спинном мозгу, уже распространившая свое действие на головной мозг» — Валуев П. А. Дневник министра внутренних дел. Т. 2. С. 32.

[237] 6 красавіка, як адзначае П. А. Валуеў, «продолжительное совещание у государя (который глубоко огорчен, так что больно на него смотреть) с кн. Долгоруковым, военным министром и Потаповым. Призрак единства власти в эполетоносце, поддерживаемый военным министром, еще раз восторжествовал. Потапова не решились назначить ген. — губернатором. Готовы были оставить до времени Муравьева, и я с трудом успел достигнуть того, что бумаги о его увольнении будут посланы к подписи государя за границу. [...] Если

бы поляки знали, как мы их боимся! Если бы Европа знала, как мы неустрашимы на словах и малодушны на деле! Когда Потапов говорил, что край разорен и еще более разоряется, военный министр отозвался, что лучше это, чем дать вновь опериться полякам. Опустошение как принцип управления! Этому примера нет в истории. [...] Я должен был радоваться хотя тому, что сломана татарская виленская гидра» — гл.: Валуев П. А. Дневник министра внутренних дел. Т. 2. С. 33.

[238] «Михаил Николаевич Муравьев и князь Александр Михайлович Горчаков оба сделались любимцами всего русского народа, героями дня. И тот, и другой были осыпаемы бесчисленными телеграммами, адресами, письмами, выражениями благодарности и сочувствия. Ни один официальный обед, ни одно торжество не обходились без горячих речей и тостов в честь их, а простой народ служил за их здоровье молебствия и подносил им иконы» — Милютин Д. А. Воспоминания. 1863–1864. М., 2003. С. 248–249. Беспрэцэдэнтны выпадак апісвае гісторык С. С. Тацішчаў у сваёй кнізе пра маладыя гады вялікага князя Аляксандра Аляксандравіча — будучага імператара Аляксандра III: падчас наведвання вялікім князем Сімбірска «в присутствии Его Высочества были там получены две ответные телеграммы на посланные симбирским дворянством виленскому генерал-губернатору Муравьеву и издателю «Московских ведомостей» Каткову приветствия с выражением сочувствия к их деятельности. По прочтении обеих телеграмм раздалось громогласное «ура!», разлито шампанское и провозглашены оживленные тосты: за здравие Государя Императора, за Августейшего гостя Цесаревича и за двух доблестных слуг Престола и Родины» — Татищев С. С. Детство и юность великого князя Александра Александровича // Великий князь Александр Александрович: сборник документов. М., 2002. С. 324. Беспрэцэдэнтнасць сітуацыі заключалася ў тым, што двум лідарам антыпольскай кампаніі тосты за здароўе падымаліся ў адным шэрагу з імёнамі імператара і спадчынніка трона. Разам з тым, як справядліва зазначае П. У. Далгарукаў, «возгласы, крики, вопли, адресы в честь Муравьева доказывают мнение лишь части публики, а не всей русской публики» — Долгоруков П. В. Петербургские очерки. С. 141.

[239] Рымскі канкардат 22 ліпеня 1847 г. — пагадненне паміж Свяцейшым прастолам Рымска-каталіцкай царквы і Расійскай імперыяй,

якое значна пашырыла права Ватыкана кантраляваць побыт каталіцкай царквы ў Расіі. У прыватнасці, былі дасягнутыя пагадненні па павелічэнні колькасці каталіцкіх епархій, дадзена права пашыраць тэрыторыю ўжо існуючых епархій папскай булай, прызначаць біскупаў і іх суфраганаў (намеснікаў) паводле ўзгаднення з Папам (імператарскі ўказ ужо не мог папярэднічаць гэтаму ўзгадненню, як часта было раней).

[240] Алакуцыя — зварот Папы Рымскага да кардыналаў з прамовай з нагоды якой-небудзь важнай падзеі. 22 ліпеня 1842 г. папа Грыгорый XVI (у свецкім жыцці Барталамеа Альберта Капелары; 1765–1846; Папа Рымскі з 1831 г.) звярнуўся з алакуцыяй з нагоды становішча каталіцкай царквы ў Расійскай імперыі. Ён адмаўляўся зацвярджаць прапанаваныя яму ўрадам Расіі кандыдатуры на пасады біскупаў, бо лічыў іх недастаткова самастойнымі ў адстойванні інтарэсаў царквы. Гэта быў найбольш напружаны момант у адносінах паміж Расіяй і Ватыканам у XIX ст. М. М. Мураўёў лічыў, што падпісанне канкардату 1847 г. пасля такіх жорсткіх заяваў Папы было памылкай.

[241] Пій IX (у мірскім жыцці Джавані Марыя граф Мастай дэ Ферэці) (1792–1878) — Папа Рымскі з 1846 г. Паслядоўна выступаў за існаванне ўніяцкай царквы ў Расійскай імперыі, далучыў да ліку святых Язафата Кунцэвіча.

[242] Высылка расійскіх дыпламатаў з Рыма адбылася пасля таго, як Расія ў аднабаковым парадку адмовілася прызнаваць палажэнне канкардату 1847 г. Фактычна гэта было раўназначна разрыву дыпламатычных адносін і было выклікана непрыняццем імператарскім урадам пазіцыі каталіцкіх іерархаў у адносінах да паўстання 1863–1864 гг., у прыватнасці тым, што архібіскуп Варшаўскі (прымас Царства Польскага) З. Шч. Фялінскі адмовіўся асудзіць паўстанне.

# Подпісы да ілюстрацый

1. Граф Міхаіл Мікалаевіч Мураўёў. Адна з найбольш вядомых прыжыццёвых гравюр.
2. Андрэй Мікалаевіч Мураўёў (1806–1874), брат М. М. Мураўёва, рэлігійны пісьменнік, паэт. Партрэт работы П. З. Захарава (1841).
3. Мікалай Мікалаевіч Мураўёў-Карскі (1794–1866), брат М. М. Мураўёва, генерал ад інфантэрыі, удзельнік антынапалеонаўскіх і Крымскай войнаў.
4. Аляксандр II. Фотаздымак 1860-х гг. Імператар сфатаграфаваны ў звыклай вопратцы з любімым сабакам Мілордам.
5. Уладзімір Іванавіч Назімаў, папярэднік М. М. Мураўёва на пасадзе віленскага генерал-губернатара. Каляровая літаграфія работы Ж.-Б.-А. Лафоса з «Віленскага альбома» (1857).
6. Пётр Аляксандравіч Валуеў, міністр унутраных спраў Расійскай імперыі, адзін з найбольш знакамітых апанентаў Мураўёва ва ўрадзе. Фотаздымак з «Альбома фатаграфічных партрэтаў найсвятлейшых асобаў і персонаў, вядомых у Расіі. Люты, 1865».
7. Вялікі князь Канстанцін Мікалаевіч, брат імператара, адзін з ініцыятараў так званых вялікіх рэформаў 1860-х гг., намеснік у Польшчы (1862–1863), адхілены ад пасады пад ціскам М. М. Мураўёва.
8. Вінцэнт Канстанцін Каліноўскі. Фотаздымак з майстэрні Ахілеса Банольдзі (Вільня, 1862).
9. Якуб Вільгельм Гейштар. Фотаздымак дапаўстанцкага перыяду жыцця.
10. Зыгмунт Эразм Гаспар Юзаф Серакоўскі. Малюнак паводле гравюры 1863 г.

11. «Экзекуцыя Крыніцкага на спуску з Варшаўскай фартэцыі, 17 лістапада 1863». Гравюра з французскага выдання «L'Univers Illustré» (№ 292, 17.12.1863, с. 17). Гэтая ж гравюра была апублікаваная таксама ў часопісе «L'Illustration. Journal Universel» з назвай «Расстрэл сябра Нацыянальнага Урада Зыгмунта Падлеўскага ў Плоцку 14 красавіка 1863 года».

12. «Экзекуцыя ў Варшаве». Гравюра з французскага выдання «L'Ouvrier» (№ 354, 08.02.1868, с. 321).

13. Аляксандр Іванавіч Герцэн, пісьменнік і журналіст, адзін з найбольш уплывовых эмігрантаў XIX ст. Настойліва выкрываў М. М. Мураўёва як вешальніка і ката.

14. Мікалай Аляксеевіч Някрасаў, паэт і выдавец, рэдактар часопіса «Современник». Вершы ў гонар Мураўёва не дапамогуць яму выратаваць часопіс. Здымак 1858 альбо 1859 г. фатографаў Рыгора Ажэ і Іосіфа Багдана.

15. Мікалай Васільевіч Шалгуноў, публіцыст і грамадскі дзеяч. Працаваў пад кіраўніцтвам Мураўёва ў Лясным дэпартаменце, пра што ўспамінае ў мемуарах.

16. Князь Пётр Уладзіміравіч Далгарукаў, палітычны эмігрант, гісторык і генеалог. Хутчэй за ўсё, менавіта ён распаўсюдзіў вядомую мянушку Мураўёва — «Вешальнік». Малюнак 1840-х гг.

17. Карыкатура на Мураўёва. Каляровая літаграфія (Аўстрыйская імперыя, 1863).

18. «Помнік Мураўёву на старонках гісторыі». Гравюра з польскамоўнай прэсы перыяду да Першай сусветнай вайны.

19. «Новая Гідра, сучасны Геркулес перад адрастаючай галавой». Карыкатура з нямецкага выдання «Wespen» (1863).

20. «Мураўёва выклікае апладысменты за сваю манеру падымаць ногі, Мураўёў асвістаны за сваю манеру падымаць рукі». Гравюра з французскага выдання «L'Iluustration. Journal Universel» (№ 1078, 24.10.1863, с. 284). Каментар да гравюры: расійская балерына Марфа Мураўёва з поспехам гастралявала ў Парыжы ў 1863 г.

У прыватнасці, яна выступіла ў балетах «Жызэль», які прынес ёй славу, і «Д’ябаліяна», паказанай на гравюры.

21. «Брыгада камандзіра Лямброўскага адбівае гармату ў расійцаў каля Навагрудка». гравюра з французскага выдання «Le Monde Illustré» (№ 358, 20.02.1864, с. 120). Выяўленыя падзеі, найбольш верагодна, былі плёнам мастацкай фантазіі, бо ў Навагрудскім павеце не вядома ні камандзіра з імем ці мянушкай Лямброўскі, ні атрада, які можна было б назваць брыгадай, а таксама ніводнага бою, у якім паўстанцам удалося б захапіць гармату.

22. «Атрад Арбатоўскага перасякае вёску Слюска, дарога на Навагрудак (Мінская губерня)». Гравюра з французскага выдання «Le Monde Illustré» (№ 359, 27.02.1864, с. 133). Пазней гэтая ж гравюра была перадрукаваная ў шведскім выданні «Illusrerad Tidning», у нумары ад 12.03.1864, пад назвай «Сцэна з паўстання ў Польшчы».

23. «Вежн і яго партызанскі атрад злучаюцца з атрадам Лапвінскага, каб дзейнічаць пад яго камандаваннем (Мінская губерня)». Гравюра з французскага выдання «Le Monde Illustré» (№ 364, 02.04.1864, с. 213).

24. «Расійскі генерал Грунт, зняволены Собекам, вызваляецца палякамі (Барысаў)». Гравюра з французскага выдання «Le Monde Illustré» (№ 345, 21.11.1863, с. 324) Крыху пазней гэтая ж гравюра з амаль аналагічным подпісам была апублікаваная ў шведскім выданні «Illusrerad Tidning», у нумары ад 05.12.1863. Выява паказвае рэальную падзею. 23 ліпеня 1863 г. паўстанцкі атрад пад камандаваннем Станіслава Ляскоўскага (Собека) за 15 вёрстаў ад г. Ігумена схапіў на дарозе расійскага генерала Ягора Грунта, які накіроўваўся ў Бабруйскую фартэцыю. У сувязі з тым, што Ляскоўскі і Грунт былі знаёмыя яшчэ да паўстання і апошні, будучы ўжо сталага веку, не браў непасрэднага ўдзелу ў баявых дзеяннях, яго адпусцілі пад абяцанне не ваяваць супраць паўстанцаў.

25. «Выстрал Каракозава». Гэта была адна са спробаў замаху на Аляксандра II, здзейсненая Дзмітрыем Каракозавым. Карціна работы народнага мастака РСФСР Барыса Лебедзева.

26. Дзмітрый Уладзіміравіч Каракозаў, тэрарыст, які зрабіў спробу забіць імператара. Старшынства ў камісіі па справе Каракозава было апошняй дзяржаўнай пасадай М. М. Мураўёва-Віленскага.

27. Восіп Іванавіч Камісараў атрымаў патомнае дваранства і прыдомак «Кастрамскі» за выратаванне жыцця імператара. Быў узнагароджаны ордэнам Святога Уладзіміра IV ступені, французскім ордэнам Ганаровага Легіёна і аўстрыйскім камандорскім крыжом ордэна Франца Іосіфа, а таксама спецыяльна адбітым у адным асобніку залатым медалём «4 красавіка 1866 года» (былі адбітыя таксама бронзавыя медалі). Атрымаў грашовую ўзнагароду ў памеры 3 тысячы рублёў.

28. Адбіты ў гонар В. І. Камісарава настольны медаль (жэтон) «Осип Иванович Комисаров-Костромской. В память чудесного спасения Государя Императора Александра II 4 апреля 1866 г.». Бронза, 13,23 г, дыяметр 30 мм. Аўтар — берлінскі прыдворны медальер Фрыдрых Вільгельм Кульрых (1821–1887).

29–30. Захавалася каля дзесяці вядомых нам здымкаў і паштовак помніка М. М. Мураўёву ў Вільні (скульптар Матвей Чыжоў, архітэктары Іван Трутнеў і Васіль Гразноў). Ён быў пастаўлены 8 лістапада 1898 года на сабраныя добраахвотнікамі грошы. Праект быў узгоднены з імператарам Мікалаем II. У 1915 г., калі нямецкія войскі падступалі да Вільні, быў вывезены ў Расію, далейшы яго лёс невядомы. На фотаздымках відаць, што і ўдзень, і ўночы побач з помнікам знаходзіцца паліцэйскі: улады баяліся правакацый і публічнай ганьбы на адрас нябожчыка з боку мясцовага насельніцтва.

31–32. Заслужаны артыст РСФСР Кандрат Мікалаевіч Якаўлеў (1864–1928) у ролі Мураўёва ў стужцы рэжысёра Уладзіміра Гардзіна «Кастусь Каліноўскі» (1928). Да гэтага сыграў Мураўёва ў фільме рэжысёра Аляксандра Іваноўскага «Палац і крэпасць» (1923).

# Змест

*Аляксандр Фядута.* Profession de foi «чалавека літоўскай бойні» . . . . 5

Глава I. УПРАВЛЕНИЕ СЕВЕРО-ЗАПАДНЫМ КРАЕМ. . . . . . . . 41

Глава II. РЕТРОСПЕКТИВНЫЙ ОБЗОР СОБЫТИЙ 1863 г. . . . . 88

Взгляд правительства на мятеж 1863 г.. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 102

Глава III. 1864 и 1865 гг.. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 109

Пребывание Государя в Вильне . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 117

Приезд Потапова в Петербург . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 133

Совещание у Государя . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 134

Высочайший рескрипт . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 136

Каментары . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 150

Подпісы да ілюстрацый . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 218

Літаратурна-мастацкае выданне

**Мураўёў** Міхаіл

# НАТАТКІ ПРА КІРАВАННЕ ПАЎНОЧНА-ЗАХОДНІМ КРАЕМ І ПРА ПАДАЎЛЕННЕ Ў ІМ БУНТУ

Адказны за выпуск *М. Шыбко*
Вёрстка *В. Нога*
Карэктар *М. Шавыркіна*

Падпісана ў друк 17.03.2016. Фармат 70×100 1/32. Папера афсетная.
Афсетны друк. Ум. друк. арк. 9,4. Ул.-выд. арк. 11,25. Наклад 300 асобн. Заказ 2578.

Выдавецтва ТАА «Лімарыус». Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі,
выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь 20.03.2014 за № 1/226.
Вул. Геалагічная, 59, к. 4, п. 29, 220138, г. Мінск.

Таварыства з дадатковай адказнасцю «Новапрынт». Пасведчанне аб дзяржаўнай
рэгістрацыі выдаўца, вытворцы і распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/54
ад 25.02.2014. Вул. Геалагічная, 59, к. 4, п. 10, 220138, г. Мінск.

**Мураўёў , Міхаіл**

М91 Нататкі пра кіраванне Паўночна-Заходнім краем і пра падаўленне ў ім бунту / Міхаіл Мураўёў; прадм., камент. Аляксандр Фядута. — Мінск: Лімарыус, 2016. — 224 с. : іл. — (Беларуская мемуарная бібліятэка).

ISBN 978-985-6968-52-8.

Успаміны вядомага расейскага дзяржаўнага дзеяча XIX стагоддзя Міхаіла Мураўёва (1796–1866) тычацца часоў ягонага генерал-губернатарства ў беларуска-літоўскіх губернях. Упершыню тэксты суправаджаюцца грунтоўнымі каментарамі, якія паказваюць намаляваныя Мураўёвым падзеі ў кантэксце гістарычных дакументаў і сведчанняў ягоных сучаснікаў. Гэта дазваляе чытачу самому зрабіць высновы пра тое, наколькі шчыры быў мемуарыст і ці адпавядала напісанае ім рэчаіснасці.

**УДК 94(476)(093)**
**ББК 63.3(4Беи)**